# КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 50 (1280) 10 снежня 2016 г.


## “Гістарычная памяць, роднае слова, моцная краіна”

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў удзельнікаў урачыстасцей з нагоды 125-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча.**

У віншаванні гаворыцца, што вытанчаныя, дасканалыя вершы сусветна вядомага паэта, якія вызначаюцца майстэрскім выкарыстаннем вобразна-выяўленчых сродкаў, пранікненнем у духоўны свет чалавека і высокай культурай слова, па праве прызнаны адной з вяршынь еўрапейскай паэзіі XX стагоддзя.

“Сваёй дзейнасцю пясняр заклаў падмурак беларускай нацыянальнай эстэтыкі, унёс вялікі ўклад у фарміраванне літаратурнай мовы і станаўленне патрыятычнай свядомасці народа. Таму сёння мы, грамадзяне суверэннай дзяржавы, павінны шанаваць і захоўваць тое, дзеля чаго працаваў наш знакаміты зямляк, — гістарычную памяць, роднае слова, моцную краіну”, — падкрэсліў Кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што ўрачыстасці з нагоды 125-годдзя Максіма Багдановіча паспрыяюць умацаванню еднасці грамадства і ўслаўленню творчых талентаў нашага народа.

## Сімвалічнае вяртанне

**Святкаванне 125-годдзя з дня нараджэння паэта, перакладчыка, публіцыста Максіма Багдановіча распачалося 9 снежня ў крыпце храма-помніка ў гонар Усіх Святых. Яно мела працяг на плошчы Парыжскай камуны, дзе прайшлі літаратурная акцыя “Расцём разам з Максімам” і памятны мітынг “Пакланіся Максіму”. Шэраг урачыстых і памятных мерапрыемстваў былі арганізаваны напярэдадні свята і ў культурных установах.**

Вольга РОПАТ

У дзень святкавання ў крыпце храма-помніка ў гонар Усіх Святых адбылася ўрачыстая цырымонія “Вяртанне” па закладцы капсулы з зямлёй з магілы Багдановіча ў горадзе Ялта. Цырымонія мела працяг у Белай зале храма, дзе прысутных чакала літаратурна-музычная сустрэча “Калі ўсе мы разам ляцім да зор…” Урачыстыя словы з нагоды 125-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі зачытала намеснік Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь Наталля Качанава.

Пасля цырымоніі закладкі капсулы міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс Святлоў зазначыў, адказваючы журналістам, што ўсё жыццё і творчасць Максіма Багдановіча — прыклад адносін да Айчыны і роднай мовы. “Гэта не проста сімвал, а аснова сучаснай беларускай культуры. Ён даў напрамак для развіцця літаратуры і паказаў, як трэба адносіцца да Айчыны, роднай мовы” — адзначыў міністр. “Цырымонія пахавання зямлі з магілы Максіма Багдановіча ў Ялце — сімвалічнае дзейства. Паэт завяшчаў быць пахаваны ў Беларусі. Узяцце зямлі з магілы паэта і пахаванне капсулы на радзіме — выкананне волі Максіма Багдановіча”, — дадаў Барыс Святлоў.

Падчас мерапрыемства Дзяржаўны камерны хор Рэспублікі Беларусь выканаў “Ціха ўсё было на небе”, прагучалі музычныя кампазіцыі ў выкананні салістаў Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь Алены Золавай і Віктара Мендзялеева. “Слуцкіх ткачых” выканала вакальная група “Камерата” Белдзяржфілармоніі, а “Вальс” Фрэдэрыка Шапэна — саліст Белдзяржфілармоніі Арцём Шаплыка.

## ШАСЦІДЗЯСЯТЫ ЭЛЕМЕНТ ГІСТОРЫІ

**15 снежня Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь адзначыць 60-годдзе з дня свайго заснавання. Хоць гістарычна на культурнай "карце" краіны ён паўстаў куды раней...**

с. 15

Затым на плошчы Парыжскай камуны ля помніка паэта распачалася літаратурная акцыя “Расцём разам з Максімам”, якая сімвалізуе пераемнасць пакаленняў і актуальнасць вершаў творцы. Прагучалі любімыя паэтычныя радкі ўдзельнікаў акцыі — студэнтаў, выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў, супрацоўнікаў літаратурных музеяў, прадстаўнікоў грамадскасці і дзяржаўных дзеячаў. У прыватнасці, Багдановіча чыталі першы намеснік міністра культуры Беларусі Ірына Дрыга, намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ігар Бузоўскі, дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Алена Ляшковіч, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі.

Тым часам у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі для навучэнцаў адбылася вучэбна-пазнавальная экскурсія “Славутыя імёны Бацькаўшчыны”, прысвечаная Багдановічу. Таксама наведвальнікі пазнаёміліся з архіўнымі дакументамі з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, якія прадстаўлены ў выставачным праекце “Светлы след…”

У філіяле Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры “Літаратурны музей Максіма Багдановіча” адкрылася новая экспазіцыя. Што ў ёй? Скажам, 3D-узоры. Наогул, сучасныя мультымедыя-сродкі дазволяць перагарнуць старонкі адзінай Максімавай кнігі — “Вянка” 1913 года, а таксама даведацца пра радавод Багдановічаў. Гледачы пабачаць таксама калекцыю паштовак з фондаў установы, сапраўдны слуцкі пояс, гадзіннік, які адлічваў апошнія хвіліны жыцця паэта (ён узяты на дэпазіт з фондаў Нацыянальнага гістарычнага музея). На адкрыцці экспазіцыі Ірына Дрыга адзначыла: “Аб значэнні Максіма Багдановіча ў гісторыі Беларусі сказана нямала. Ён быў першацветам адраджэння беларускай культуры, фарміравання нашай сучаснай мовы, паэтам еўрапейскага ўзроўню. Выдатны талент, які тонка валодаў літаратурнымі формамі, з’яўляўся пасланцам у вялікую еўрапейскую літаратуру, першапраходцам нацыянальнай літаратуры. Гэта спадчына, якая сагравае нас і цяпер”.

Скончылася святкаванне 125-годдзя вялікага паэта памятным мітынгам “Пакланіся Максіму”. Да помніка Максіма Багдановіча быў ускладзены кошык з кветкамі ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі. Удзельнікі мітынгу запалілі лампады ў памяць пра выдатнага беларускага паэта.

К

Фотасюжэт з падзеі — **на старонцы 2.**

Крытычная маса

## Што адбіваецца ў “каралеўстве люстэрак”?

**14 снежня адкрываецца чарговы, XXII з’езд Беларускага саюза мастакоў. На парадку дня — справаздача аб рабоце рады і рэвізійнай камісіі саюза за перыяд паміж з’ездамі, выбары новага складу кіраўніцтва.**

Барыс КРЭПАК

Натуральна, у дыскусіях па дакладах размова пойдзе аб месцы і ролі саюза ў культурным жыцці грамадства, пра дзейнасць творчых падраздзяленняў і мастацка-вытворчых прадпрыемстваў у справаздачны перыяд, пра выставачную дзейнасць і ўклад мастакоў у эстэтычнае пераўтварэнне асяроддзя. Безумоўна, гаворка закране няпростае становішча сучаснага мастака ў рынкавых умовах, яго ўзаемаадносіны з дзяржавай, грамадствам, гледачом, сродкамі масавай інфармацыі. Хацелася б толькі, каб, не ў прыклад папярэднім з’ездам, асноўная ўвага была нададзена ўсё ж менавіта творчым пытанням, якія тычацца пазітыўных і негатыўных аспектаў прафесійнай якасці як асобных мастацкіх твораў, так і выставак у цэлым. Бо трэба прызнаць, што крытэрыі такіх ацэнак за апошнія гады згублены, ды і, уласна кажучы, прапаганда выяўленчага мастацтва ў Саюзе мастакоў пакідае жадаць лепшага. Гэта, на мой погляд, адна з прычын таго, што выставачныя залы нават пры экспанаванні цікавых праектаў пустуюць, а большасці патэнцыйных гледачоў і ўвогуле невядома, што пэўная выстаўка працуе. Я ўжо не кажу пра тое, што большасць экспазіцый не пакідае пасля сябе і следу з-за таго, што няма ілюстраваных каталогаў. Канешне, фактычная бяздзейнасць прафесійнай крытыкі, у тым ліку адсутнасць дасведчанага мастацтвазнаўцы ў штаце апарата саюза, вядзе да таго, што крытычную думку замяніла журналісцкая апалагетыка ў інфармацыйным выглядзе, якая без перашкод квітнее ў прэсе і на тэлебачанні. Спадзяюся, з’езд паставіць і новым складам рады паспрабуе вырашыць хаця б частку арганізацыйна-творчых пытанняў, якіх цяпер у нашай мастацкай прасторы назбіралася больш чым дастаткова.

Ну а сёння ва ўсіх залах Рэспубліканскай мастацкай галерэі БСМ (Палац мастацтва) працуе вялікая выстава жывапісу, скульптуры і графікі, на якой чвэрць членаў Саюза мастакоў паказалі больш за 400 твораў, зробленых за апошнія два гады. Да пачатку з’езда экспазіцыя працуе як V Беларуская біенале жывапісу, графікі і скульптуры “БІ-5”, а пасля 11 снежня — напярэдадні адкрыцця з’езду, гэтая экспазіцыя будзе часткова “рэканструяваная” і дапоўненая новымі творамі. Такім чынам, біенале плаўна ператворыцца, так бы мовіць, у справаздачную выставу мастакоў за перыяд паміж з’ездамі. Ці дасць яна падставу сур’ёзна пагутарыць не толькі і нават не столькі ўласна пра экспазіцыю, колькі пра тыя прынцыповыя пытанні сучаснага мастацтва, якія заканамерна выцякаюць з гэтай выставы? Пабачым. Асабліва з пункта гледжання тых агульных праблем, агульных радасцей і трывог, якія існуюць сёння ў нашым “каралеўстве люстэрак”, якія адбіваюць сусвет і, хачу думаць, люстэрак не “крывых”.

Зараз я не стаўлю задачу аналізаваць асобныя творы экспазіцыі, кагосьці асабліва вылучаць, штосьці крытыкаваць ці хваліць. Па-першае, рабіць у кароткім артыкуле каталожны пералік імёнаў і твораў з адпаведнымі ацэнкамі — справа няўдзячная і папросту малапрафесійная, тым больш грунтоўна разабрацца ў гэтым экспазіцыйным пазаканцэптуальным “вінегрэце” можа нават не кожны спецыяліст. “Пераказваць” выставу бессэнсоўна: выяўленчае мастацтва прыдумана для разумення яго вачыма. Тут як ніколі справядлівая цютчаўская “мысль изреченная есть ложь”. Аднак у дадзеным выпадку хочацца хаця б пункцірна выявіць нейкія агульныя тэндэнцыі, характэрныя для мастацкага жыцця апошніх гадоў.

Канешне, выстава гэта — на любы густ: і па трох асноўных відах мастацтва, і па тэмах, і па вобразна-пластычных пошуках, па матэрыялах і тэхніках, і па мастакоўскіх кірунках, па розных “-ізмах”, дзе побач з так званым “рэалізмам” мірна суседнічае беспрадметнасць ці постмадэрн, са шматслойнай метафарай і сімволікай — прамое бачанне натуры (“што бачу — тое пяю”).

Заканчэнне — **на старонцы 9.**

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

Фотасюжэт нумара

# Сімвалічнае вяртанне

**1. Віцэ-прэм'ер Наталля Качанава (у цэнтры), міністр культуры Барыс Святлоў і Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел падчас цырымоніі закладкі капсулы з зямлёй з магілы Максіма Багдановіча ў Ялце ў крыпце храма-помніка ў гонар Усіх Святых. 2. У белай зале храма-помніка. 3. Салістка Вялікага тэатра Беларусі Алена Золава выконвае песню "Па-над белым пухам вішняў" на верш Максіма Багдановіча. 4. Падчас адкрыцця новай экспазіцыі Літаратурнага музея Максіма Багдановіча. 5. Капсула з зямлёй з магілы Багдановіча змешчана ў крыпце храма-помніка. 6. Верш у рамках акцыі ля помніка беларускаму класіку чытае першы намеснік міністра культуры краіны Ірына Дрыга.**

Падпіска-2017!

Падчас сустрэчы ў Маладзёжным тэатры.

# Выхад у свет з "К"

**Гэтым разам сустрэча супрацоўнікаў рэдакцый газеты "Культура" і часопіса "Мастацтва" з грамадой адбылася ў Беларускім дзяржаўным маладзёжным тэатры.**

Вольга РОПАТ / Фота аўтара

Журналісты сабраліся ў фае Маладзёжнага а 18-й — за гадзіну да пачатку камедыі "Плаціць не будзем". Нам хацелася з гасцямі тэатра абмеркаваць пытанне: як "выжыць" газеце ў "стрэсавым" становішчы. У рэальнасці атрымалася крыху па-іншаму, як кажуць, не па сцэнарыі.

Супрацоўнікі тэатра адразу папярэдзілі: большасць гледачоў прыходзяць пасля 18.20. Скарыстаўшыся вольнымі хвілінамі, пагутарыла з намеснікам генеральнага дырэктара Маладзёжнага Аленай Пяроўскай.

— Для тых, хто заўсёды чытаў газету — нічога змяняць не трэба, — лічыць Алена Іванаўна. — Галоўнае — даступнасць. Напрыклад, пакідаць асобнікі ў ячэйках метрапалітэна. Маладым цікава, што адбываецца за межамі нашай краіны, крыху старэйшым — выхаванне дзяцей… У кожнай узроставай катэгорыі — свае інтарэсы. Як выглядае чытач "К"? Чалавек з вышэйшай адукацыяй, крыху за 30, які на працягу жыцця пашырае кола сваіх інтарэсаў. Яшчэ з дзіцячага садка бацькі і педагогі вучылі яго адчуваць і бачыць прыгожае.

На думку маёй суразмоўцы, у газеты слушны баланс у дачыненні да прапорцыі "рэгіёны / сталіца". Але на падпіску, павелічэнне чытачоў, па меркаванні візаві, наўрад ці зможам істотна паўплываць:

— Калі не было інтэрнэту, выпісвалі папяровую прэсу. А зараз можна "клікнуць" і прачытаць матэрыял, ды яшчэ азнаёміцца з рознымі меркаваннямі.

З журналістамі "К" пагутарыў і генеральны дырэктар тэатра Віктар Старавойтаў. На яго думку, руская мова павялічыла б аўдыторыю газеты. Але "Культуру" ён чытае стала, асабліва артыкулы Надзеі Бунцэвіч. Увогуле, як кожны прафесіянал, спадар Віктар прагне бачыць больш тэкстаў пра сваю дзялянку — тэатр: "Канешне, сачу за працэсамі, якія адбываюцца і ў суседніх краінах, у расійскай тэатральнай прасторы. І ўявіце, колькасць тэатраў на нашу рэспубліку — каля 30-ці, а ў дачыненні Масквы гэта лічба апісвае карціну толькі ў адной з яе акругаў. Таму чыесьці засцярогі ў дачыненні да шматлікасці беларускіх тэатраў залішнія: і тэатраў мусіць быць больш, і ўкладанняў у яго, у культуру наогул".

Між тым тэатр паступова запаўняўся людзьмі. У асноўным — жанчынамі пасля 30. Але сустракалася і моладзь. Як бавіць вольны час перад спектаклем? У Маладзёжным — усё арганізавана. За адзін білет наведвальнік атрымлівае адразу пяць задавальненняў: спектакль, "жывую" музыку (часта запрашаюцца студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, навучэнцы Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя Міхаіла Глінкі, дзіцячых музычных школ), буфет, выставачны павільён, а таксама магчымасць зрабіць прыгожыя фотаздымкі ў інтэр'еры. Што да павільёна, то ён нагадвае маленькі музей. У ім можна ўбачыць матэрыялы журналістаў пра ўстанову і яе пастаноўкі, эскізы касцюмаў, афішы, макеты сцэн, здымкі сцэн са спектакляў, буклеты, узнагароды. Менавіта тут перад спектаклем убачыла мужчыну з дачкой школьнага ўзросту, якія ўважліва разглядалі тэатральныя рэчы. У Маладзёжным яны ўпершыню, таму і прыйшлі

Вынікі сумеснай калегіі

**Пытанні, звязаныя з развіццём супрацоўніцтва ў сферы кінематаграфіі ў 2017 — 2020 гадах былі ўсебакова абмеркаваны 3 снежня 2016 года на сумесным пасяджэнні калегій міністэрстваў культуры Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі "на палях" V Санкт-Пецярбургскага міжнароднага культурнага форуму.**

У мерапрыемстве з беларускага боку ўзялі ўдзел міністр культуры Барыс Святлоў, першы намеснік міністра Ірына Дрыга, члены калегіі — рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Міхаіл Баразна, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі, генеральны дырэктар Беларускай дзяржаўнай філармоніі Аляксандр Гарбар, генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь Уладзімір Пракапцоў, старшыня Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму Наталля Аўдзеева, а таксама генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" Ігар Поршнеў і старшыня Беларускага саюза кінематаграфістаў Віктар Васільеў.

Ірына Дрыга адзначыла, што на дзяржаўным узроўні маецца станоўчы вопыт сумеснай вытворчасці і пракату сумесных фільмаў пад патранатам і па даручэннях Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (кінапраекты "У жніўні 44-га..." і "Брэсцкая крэпасць"), супрацоўніцтва па пытаннях аўдыявізуальнай сферы у рамках рашэнняў Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы, Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы, Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.

Стабільна ажыццяўляецца супрацоўніцтва беларускіх дзяржаўных вытворцаў фільмаў з Тэлерадыёвяшчальнай арганізацыяй Саюзнай дзяржавы. Прапрацоўваецца магчымасць рэалізацыі кінапраекта "Спадар "Не", прысвечанага міністру замежных спраў СССР, старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Андрэю Грамыку.

Напрацаваны падыходы і практыка паспяховай рэалізацыі беларуска-расійскіх кінапраектаў на недзяржаўным узроўні. Фільмы, створаныя ў Рэспубліцы Беларусь, стала ўдзельнічаюць у міжнародных, федэральных і рэгіянальных кінафестывалях на тэрыторыі Расіі: Міжнародным кінафоруме "Залаты Віцязь", Міжнародным фестывалі акцёраў кіно "Сузор'е", Міжнародным дзіцячым фестывалі мастацтваў і спорту "Кінатаўрык", Міжнародным кінафестывалі сямейных і дзіцячых фільмаў "Сэрца Байкала", Адкрытым фестывалі кіно краін СНД, Латвіі, Літвы і Эстоніі "Кінашок", Адкрытым фестывалі дакументальнага кіно "Расія" і іншых. Мастацкі фільм "Роля" сумеснай вытворчасці ў 2013 годзе на Маскоўскім міжнародным кінафестывалі быў адзначаны прызам федэрацыі кінаклубаў Расіі ў намінацыі "Лепшы фільм асноўнага конкурсу", а ў 2014 годзе — Нацыянальнай кінематаграфічнай прэміяй "Ніка" ў намінацыі "Лепшы сцэнарый". Беларуска-расійскі фільм "Казкі старога піяніна. Іяган Себасьян Бах" атрымаў прэмію Нацыянальнай акадэміі кінематаграфічных мастацтваў і навук Расіі "Залаты арол" у намінацыі "Лепшы анімацыйны фільм".

Расійскае кінамастацтва штогод прадстаўляецца на кінафорумах, якія праводзяцца ў Беларусі: Мінскім міжнародным кінафестывалі "Лістапад" і Міжнародным фестывалі анімацыйных фільмаў "Анімаёўка" ў Магілёве.

Разам з тым, у развіцці супрацоўніцтва кінематаграфістаў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі ёсць кірункі, якія маюць патрэбу ў дадатковай прапрацоўцы міністэрстваў культуры Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі:

- развіццё практыкі стварэння сумесных маштабных кінапраектаў па тэмах, якія адлюстроўваюць гістарычную і духоўную агульнасць беларускага і рускага народаў, а таксама пазітыўны вобраз развіцця саюзных адносін брацкіх дзяржаў на сучасным этапе, з выкарыстаннем сродкаў бюджэтаў, што выдзяляюцца міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі на падтрымку кінематаграфіі;

- аказанне магчымага садзейнічання беларускаму боку ў падрыхтоўцы праекта пастановы Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы аб фінансаванні за кошт бюджэту Саюзнай дзяржавы вырабу копій зыходных матэрыялаў фільмаў, створаных рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам "Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм" у 1926 — 1990 гадах, якія знаходзяцца на захоўванні ў дзяржаўных архіўных установах Расійскай Федэрацыі (ФДУК "Дзяржаўны фонд кінафільмаў Расійскай Федэрацыі", ФДУ "Дзяржаўны фонд тэлевізійных і радыёпраграм", ДУ "Расійскі дзяржаўны архіў кінафотадакументаў");

- падтрымка арганізацыі прыярытэтнага паказу фільмаў сумеснай беларуска-расійскай вытворчасці, створаных з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі за кошт сродкаў бюджэтаў Рэспублікі Беларусь, Расійскай Федэрацыі, Саюзнай дзяржавы;

- актывізацыя работы, па папулярызацыі беларускага і расійскага кінамастацтва на міжнародных кінафестывалях, якія праводзяцца ў Рэспубліцы Беларусь і Расійскай Федэрацыі;

- працяг практыкі падрыхтоўкі за кошт сродкаў федэральнага бюджэту кінематаграфічных творчых і тэхнічных кадраў у кінематаграфічных ВНУ Расійскай Федэрацыі для іх наступнай працы ў дзяржаўных арганізацыях кінематаграфіі, установах адукацыі ў сферы культуры Рэспублікі Беларусь;

- узгадненне падыходаў да рэалізацыі беларуска-расійскага кінапраекта "Спадар "Не" пра Міністра замежных спраў СССР Грамыку А.А. з выкананнем правоў і інтарэсаў УП "Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм".

З мэтай забеспячэння далейшага развіцця супрацоўніцтва ў сферы кінематаграфіі ў 2017 — 2020 гадах калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі прынята сумеснае рашэнне аб стварэнні рабочай групы для прапрацоўкі з зацікаўленымі пытанняў:

- вызначэнне пераліку перспектыўных тэм для стварэння ў 2017 — 2020 гадах сумесных кінапраектаў, якія адлюстроўваюць духоўную агульнасць беларускага і рускага народаў, у прыватнасці, прысвечаныя:

*- знакавым у фарміраванні іх гістарычных лёсаў перыядам і падзеям (напрыклад, гісторыя ўсходнеславянскіх княстваў часоў Старажытнай Русі, прыняцце хрысціянства, сумесная барацьба з іншаземнымі захопнікамі ў перыяд Сярэднявечча, Айчынная вайна 1812 года, Першая сусветная і Вялікая Айчынная войны, засваенне касмічнай прасторы, стварэнне Саюзнай дзяржавы, беларуска-расійскія культурныя сувязі і іншыя);*

*- выбітным людзям — ураджэнцам Беларусі ці Расіі, якія сыгралі прыкметную ролю ў гісторыі, навуцы, культуры, спорце абедзвюх краін.*

- выпрацоўцы ўзгодненых падыходаў да долевага фінансавання сумеснай вытворчасці фільмаў са сродкаў рэспубліканскага бюджэту Беларусі, федэральнага бюджэту Расіі, бюджэту Саюзнай дзяржавы па тэмах, названых у абзацы другім пункта 1 рашэння калегіі;

- узаемнай падтрымцы ў пракаце фільмаў сумеснай беларуска-расійскай вытворчасці, створаных з выкарыстаннем сродкаў

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Галоўны рэдактар** — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ. **Адказны сакратар:** Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Аліна САЎЧАНКА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Алена ЛЯШКЕВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ; **карэспандэнт** — Вольга РОПАТ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Мая ХУТКОВА.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА". 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
**Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.** Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2016. Наклад 3 910. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 09.12.2016 у 20.00. Замова 4840. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

"не за пяць хвілін". Запыталася, што думаюць мае героі наконт газет, якія матэрыялы ім цікавыя. (Адразу папярэджу: мужчына не ведаў пра існаванне "К", а дзяўчынка бачыла яе некалькі разоў у кіёску.) Так, мужчына не супраць пачытаць матэрыялы на гістарычную тэматыку, да рэцэнзій жа ставіцца адмоўна. Маўляў, навошта інфармацыя "пастфактум"? Адзінае — усё ж такі патрэбна "расшыфроўка" арт-журналіста або крытыка пра актуальнае мастацтва, якое не заўсёды зразумелае. Для чаго? Каб не было сорамна перад знаёмымі за неразуменне. І яшчэ. На думку суразмоўцы, сайт зрабіць куды танней, чым газету выпускаць… У дачкі ж яго іншыя думкі наконт кантэнту газеты. Ёй, наадварот, было б цікава прачытаць меркаванні журналістаў. Але яна, як і ўсе, — чытае тое, што ёй трэба, у інтэрнэце. Якія тэмы лічыць актуальнымі? Новыя маладзёжныя пляцоўкі ў сталіцы (іншымі словамі, "дух", аблічча Мінска, якія штогод змяняюцца) і жыццё ў рэгіёнах падчас вайны.

К

# "Мастацтва" ў Карэлічах

Майстар-клас часопіса ў Карэлічах. / Фота Сяргея ЖДАНОВІЧА

У снежні рэдакцыя часопіса "Мастацтва" вандравала ў Карэлічы. Нас цёпла прымалі спачатку ў Карэліцкай дзіцячай школе мастацтваў, а потым у Маладзёжным цэнтры культуры, дзе сабраліся настаўнікі школ мастацтваў, іх вучні, бібліятэкары.

Пасля сціслага знаёмства з часопісам (хто мы, пра што пішам і які зваротны звязак хочам мець) прыйшоў час практычных заняткаў, а больш дакладна — жывой рэкламы нашага праекта майстар-класаў ад беларускіх творцаў па розных мастацкіх тэхніках. Акварэліст (і дызайнер часопіса) Вячаслаў Паўлавец у падрабязнасцях распавёў пра сакрэты прафесійнага майстэрства, каментуючы кожны рух пэндзля па вільготнай паперы. Аўдыторыя падцягнулася нават з самых апошніх шэрагаў актавай залы, назіралі і слухалі ў захапленні.

Незапланаванай кропкай вандроўкі стала шыкоўная галерэя-майстэрня-сядзіба мастака Кастуся Качана ў Навагрудку. У галерэі, акрамя жывапісных твораў, уражвае калекцыя прадметаў каляровага шкла, якія ў розныя часы зрабілі на фабрыцы "Нёман". За кубачкам кавы мастак распавёў пра ідэю адкрыць у горадзе арт-рэзідэнцыю для творцаў, якія маглі б наведваць Навагрудак і ладзіць пленэры. Галерэя-майстэрня Качана выглядае сапраўдным месцам сілы, вакол якога магло б віраваць творчае жыццё. На жаль, пакуль яе магчымасці не выкарыстоўваюцца напоўніцу, але галерэя можа стаць месцам для майстар-класа ад "Мастацтва", а пазней і для вясновага пленэру для юных мастакоў.

**Алена КАВАЛЕНКА, галоўны рэдактар часопіса "Мастацтва"**

рэспубліканскага бюджэту Рэспублікі Беларусь і федэральнага бюджэту Расійскай Федэрацыі, бюджэту Саюзнай дзяржавы.

- магчымага садзейнічання Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь у разглядзе ў Савеце Міністраў і Вышэйшым Дзяржаўным Савеце Саюзнай дзяржавы пытання фінансавання за кошт бюджэту Саюзнай дзяржавы вырабу копій зыходных матэрыялаў дадзеных фільмаў, створаных рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам "Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм" у 1926 — 1990 гадах, і якія знаходзяцца на захоўванні ў дзяржаўных архіўных установах Расійскай Федэрацыі (ФДУК "Дзяржаўны фонд кінафільмаў Расійскай Федэрацыі", ФДУ "Дзяржаўны фонд тэлевізійных і радыёпраграм", ДУ "Расійскі дзяржаўны архіў кінафотадакументаў").

- узгадненнем падыходаў да сумеснай вытворчасці 12-цісерыйнага тэлевізійнага фільма "Спадар "Не" з улікам інтарэсаў рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства "Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм" для наступнай падрыхтоўкі Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь ва ўстаноўленым парадку праектаў адпаведных нарматыўных прававых актаў Саюзнай дзяржавы.

- арганізацыяй спецыяльных паказаў: "Дзень расійскага кіно" ў рамках Мінскага міжнароднага кінафестывалю "Лістапад", Міжнароднага кінафестывалю анімацыйных фільмаў "Анімаёўка" (Магілёў) і "Дзень беларускага кіно" ў рамках Маскоўскага міжнароднага кінафестывалю, Адкрытага расійскага фестывалю анімацыйнага кіно "Суздаль", Адкрытага фестывалю кіно краін СНД, Літвы, Латвіі, Эстоніі "Кінашок" (Анапа), іншых кінафэстах, з прэзентацыяй новых фільмаў і забеспячэннем удзелу творчых дэлегацый кінематаграфістаў у мерапрыемствах фестываляў.

- садзейнічаннем Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь у арганізацыі навучання:

*- абітурыентаў для падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне кінематаграфіі ў рамках квоты на адукацыю замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, устаноўленай пастановай Урада Расійскай Федэрацыі ад 8 кастрычніка 2013 года № 891 на базе федэральных дзяржаўных бюджэтных адукацыйных устаноў вышэйшай прафесійнай адукацыі "Усерасійскі дзяржаўны інстытут кінематаграфіі імя С.А.Герасімава" і "Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны інстытут кіно і тэлебачання" (Вышэйшыя курсы) для наступнай працы ў дзяржаўных арганізацыях кінематаграфіі, установах адукацыі ў сферы культуры Рэспублікі Беларусь;*

*студэнтаў і выкладчыкаў установы адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў" у "летняй кінашколе" федэральнай дзяржаўнай бюджэтнай адукацыйнай установы вышэйшай прафесійнай адукацыі "Усерасійскі дзяржаўны інстытут кінематаграфіі імя С.А.Герасімава".*

**31 снежня гісторыка-культурны музей-запаведнік "Заслаўе" адзначае 30-годдзе. Галоўны захавальнік фондаў гэтай установы Аляксандр Рак пасміхаецца: маўляў, ідэя ўзнікнення запаведніка не магла не прыйсці ў казачную пераднавагоднюю ноч. Так што неўзабаве ў супрацоўнікаў "Заслаўя" — двайное свята. А "музей музеяў" сам нагадвае сёння казку пасярод старой гарадской забудовы.**

Яўген Кавалёў: "А гэтая скрыпачка — вясельная".

Аляксандр Рак ля музейна-выставачнага комплексу.

Яўген РАГІН, Мінск — Заслаўе — Мінск
Фота аўтара

## Статыстыка

"Заслаўе" — гэта 113 гектараў. На іх размешчаны гарадзішчы "Замэчак" (менавіта сюды была сасланая Рагнеда з сынам Ізяславам) і "Вал", касцёл і царква, музейна-выставачны комплекс з трыма выставачнымі заламі (у фондах — каля 18 тысяч музейных прадметаў, якія сфармаваныя ў 30 калекцый), а таксама комплекс этнаграфічны: млын, дом завознікаў, кузня, свіран. А ёсць яшчэ музей — доўгачасовая агнявая кропка, дзіцячы музей міфалогіі і лесу, шынок, дзіцячы парк, гара Рагнеды. Маштабнасць экскурсійных магчымасцяў уражвае? З сям'ёй тут можна правесці дзень. Хапае кавярняў і гасцініц. Таму штогод "Заслаўе" наведвае амаль 40 тысяч аматараў прыроды і даўніны.

Галоўны бухгалтар запаведніка Марыя Булгак кажа, што гадавы план па аказанні платных паслуг выкананы ўжо за 11 месяцаў: зароблены 36 тысяч 321 рубель.

## Здабыткі

Цяпер зразумела, чаму запаведнік — музей музеяў? Тыя ж млын ці кузня, свіран ці ДАК — цалкам музеефікаваныя. У тым, што гэтыя структуры запаведніка запатрабаваныя ў насельніцтва, пераконвае вышэйпрыведзеная статыстыка. На вакзале я пазнаёміўся з мінчанінам, які прыязджае ў Заслаўе, у першы ж вольны час. "Сорак хвілін на электрычцы, — кажа ён, — і ты спачываеш душой у казцы". І такіх, як гэты энтузіяст нязмушаных вандровак, — сотні. Сталіца — дакучае, Заслаўе — лякуе. Павелічэнне попыту наўпрост залежыць ад пашырэння рэкламы.

А ў тым, што рэкламны рэзерв працуе не на ўсю моц, сумняваецца не даводзіцца. Дзе можна ўбачыць маляванкі-дываны Язэпа Драздовіча? Сотні адкажуць: "У Глыбокім і на Шаркаўшчыне". Адзінкі дададуць: "У Заслаўі". Так шчыраваннямі мясцовых музейшчыкаў па Беларусі сабрана і сканцэнтравана ў Заслаўі самая вялікая калекцыя маляванак Драздовіча, якая пастаянна папаўняецца. У краіне захавалася 13 маляванак Алены Кіш, 11 з іх — у Заслаўі. Гэта ж якая прынада для аматараў гэтых народных твораў!

Неаспрэчным здабыткам мясцовых супрацоўнікаў з'яўляецца і тое, што менавіта запаведнік першым распрацаваў музейна-педагагічныя праграмы. У 1990-м тут узнік адпаведны сектар. На сёння школьнікам самых розных узроўняў прапануецца дзесяць такіх заняткаў. А яшчэ ёсць тэатралізаваныя экскурсіі, звернутыя на папулярызацыю нашай народнай культуры.

## Праблемы

Адзін з мясцовых журналістаў свой артыкул пра галоўную праблему запаведніка назваў "Рагнеда раённага маштабу". Я пазайздросціў дакладнасці фармулёўкі. Справа ў тым, што музей-запаведнік мае… раённы статус, бо фінансуецца толькі з раённага бюджэту. І гэта запаведнік, які займае ці не палову плошчы гістарычнай гарадской забудовы! Не варта і на тое забывацца, што ўтварэнне "Заслаўя", як вынік навуковых даследаванняў, дазволіла акрэсліць тысячагадовы ўзрост паселішча. І менавіта дзякуючы гэтаму факту гарадскі пасёлак пераўтварыўся ў горад. Карацей, з улікам гістарычнай і турыстычнай значнасці запаведнік, па меркаванні яго супрацоўнікаў, павінен займець статус "Нацыянальны".

Так, замінае справе тое, што і "Вал" і "Замэчак" — помнікі трэцяй катэгорыі. Аднак гэта не спыняе намесніка дырэктара "Заслаўя" па навуцы Яўгена Кавалёва. "Для атрымання належнага статусу, — кажа ён увесь час, — трэба развівацца". І не толькі крэатывіць, але і са старымі праблемамі справіцца.

Адна з іх у тым, што і млын калісьці працаваў, і кузня, даючы неблагі грашовы прыбытак. І побач з імі сапраўды было завозна. Каваль пастарэў, замяніць яго пакуль няма кім. А млын спынілі пажарныя: маўляў, небяспечна. Ды і пэўныя бярвенні аўтэнтычнага будынка падгнілі, замяняць іх трэба.

## Перспектывы

Цяпер — пра крэатыў. Але варта спачатку пра… Нароўлю згадаць. Жыве там гісторык Васіль Чайка. На момант апошняй нашай сустрэчы быў ён стваральнікам трох школьных гістарычных музеяў (да прыкладу: савецкага побыту). Цяпер, кажуць, такіх вузкажанравых музеяў у амбіцыйнага гісторыка — аж пяць. Дык вось, намеснік дырэктара "Заслаўя" Яўген Кавалёў — вучань таго Чайкі. Ён таксама дзейнічае па прынцыпе "музеяў не бывае шмат".

У наступным годзе, па словах Кавалёва, запаведнік займее яшчэ адзін — "Крама". Мяркуецца, што пад новую структуру будзе адведзены пакой музейна-выставачнага комплексу. Нядаўна на баланс запаведніка пераведзены будынак колішняга Дома дзіцячай творчасці. Тут, перакананы Яўген Кавалёў, можна зрабіць музей горада ці музей маляванак-дываноў. Адзін з мясцовых бізнесмэнаў паабяцаў стаць спонсарам…

Яшчэ адзін кірунак развіцця звязаны з тым, што Заслаўе — калыска праваслаўя. Як сцвярджаюць мясцовыя знаўцы, манастыр тут узнік раней за полацкія. З гэтай нагоды Чорная гара (гара Рагнеды) можа і павінна стаць месцам паломніцтва.

Цяпер Яўген Кавалёў шукае грантадаўцаў. Застаецца пажадаць яму поспехаў на гэтым пакручастым шляху.

К

Запаведнік, які "ўтварыў" горад

# Мэта — стаць нацыянальным

Музейная педагогіка ў дзеянні.

А тут можна прыдбаць сувенір.

Памяшканне млына.

Будынак млына патрабуе рамонту.

**Калектыў Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра выказвае шчырыя спачуванні галоўнаму мастаку тэатра Андрэю Міхайлавічу Меранкову ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю бацькі.**

На маю думку...

# Ці адчуваем дачыненне?

**Мне не давялося шмат з кім з іншых гарадоў паразмаўляць аб рэспубліканскім конкурсе "Нацыянальная тэатральная прэмія", але вазьму на сябе смеласць выказаць некалькі думак, бо яны існуюць, яны вярэдзяць і... нехта ж павінен іх выказаць, а нехта пачуць.**

Добра памятаю, як праходзіў гэты конкурс першы раз, я была сярод тых, каго запрасілі на тэатральнае свята. Так, на конкурсе прысутнічалі прадстаўнікі абсалютна ўсіх тэатраў Беларусі, і гэта было для нас гонарам, мы адчувалі сваё дачыненне да тэатральнага свету краіны, мы мелі такую рэдкую для нас магчымасць — убачыць лепшыя створаныя ў Беларусі спектаклі. Разумееце, не проста прачытаць потым у "Культуры" альбо "Мастацтве" пра іх. Пабачыць! Потым распавесці сваім калегам, падзяліцца ўражаннямі. Мы, артысты, што працуюць у так званых рэгіянальных тэатрах, рэдка маем магчымасць прыехаць на якіясьці спектаклі, бо самі штовечар граем на сцэне, выконваючы непамерныя планы. Прысутнасць жа на Нацыянальнай прэміі разглядаецца ўсімі амаль як узнагарода.

У тыя дні на конкурсе была арганізавана сустрэча ў нефармальнай абстаноўцы з тагачасным міністрам культуры Паўлам Латушкам. Наогул, вельмі цёплая творчая атмасфера склалася на першым конкурсе. Добрыя словы падзякі чутны былі і ад тых, хто меў гонар прысутнічаць у якасці гасцей на другім конкурсе. На трэцяе свята артыстаў не запрасілі. На чацвёртую Нацыянальную прэмію ад тэатра не запрасілі нікога...

Больш можна не казаць нічога, усё зразумела. Крыўдна? Канешне ж. Мы як бы выключаны з тэатральнай прасторы краіны. Нам здаецца, што і дыск з запісам спектакля не можа быць падставай для ўдзелу ў Нацыянальнай прэміі. Ну што за ўражанне можна атрымаць ад спектакля, проста запісанага на дыск? Няўжо такая праблема адборачнай камісіі прыехаць паглядзець той спектакль, калі тэатр прапануе менавіта яго для ўдзелу ў конкурсе? Беларусь жа краіна не самых вялікіх памераў. У Мінску тэатральная крытыка мае магчымасць глядзець любы спектакль, і не па разу, а якія спектаклі яны бачылі, напрыклад, у Бабруйску?.. Так што мы знаходзімся не ў аднолькавых умовах і нам нашмат больш цяжка. Хацелася б, каб нас ведалі, бачылі і... паважалі, бо ёсць за што. А што да Нацыянальнай прэміі, дык прайшла яна і "толькі халадком ад яе павеяла".

**Ала ГРАХАВА,**
**артыстка катэгорыі "Майстар сцэны", кіраўнік літаратурна-драматургічнай часткі Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча (Бабруйск).**

## Будзем на сувязі!

Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара. **Пішыце** на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77 альбо на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** на **facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby, twitter.com/kimpressby, instagram.com/kimpressby**

# Дзясятка Года культуры

**Сёлетні год багаты на юбілейныя падзеі, і гэта адзін з аспектаў, чаму 2016-ы па ініцыятыве творчых людзей было прапанавана абвясціць Годам культуры. Год адзначаны ініцыятывамі і шэрагам новых праектаў, пра некаторыя з іх — аповед у гэтай публікацыі БелТА.**

**1.** Безумоўна, стварэнне Кодэкса аб культуры — падзея, маштаб якой ацэнены не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. На нядаўнім пасяджэнні XXXI Савета па культурным супрацоўніцтве дзяржаў — удзельніц СНД у Астане прынята рашэнне аб распаўсюджванні беларускага вопыту кадыфікацыі ў сферы культуры для ўсіх краін — удзельніц СНД, рэкамендацыі кодэкса ў якасці базавай мадэлі. Беларусь стала піянерам у гэтым пытанні — аналагаў такога дакумента пакуль няма ні на постсавецкай прасторы, ні ва ўсім свеце.

**2.** Гастрольны тур спектакля Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага "Пясняр", пастаўлены да 75-годдзя з дня нараджэння народнага артыста СССР, народнага артыста Беларусі Уладзіміра Мулявіна, якое адзначалася ў гэтым годзе, адбыўся ў Беларусі, а таксама быў паказаны ў Маскве. Творчасць Уладзіміра Мулявіна не мела межаў, як і яго папулярнасць, якая ідзе далёка па-за нашай краінай. Песні выканаўцы былі і застаюцца шлягерамі.

**3.** Рэспубліканская акцыя "Беларусь, я люблю цябе" стартавала маштабным канцэртам у Мінску 13 лютага. Рэспубліканская акцыя "Беларусь, я люблю цябе" была прымеркавана да Дня ўсіх закаханых і Міжнароднага дня роднай мовы. Акцыя падтрымлівае традыцыю, якая склалася ў Дзень усіх закаханых, і дае магчымасць прызнацца ў каханні не толькі адзін да аднаго, але і да роднай краіны. Ініцыятыва акцыі належыць творчай моладзі.

**4.** У 2016 годзе закладзена новая традыцыя — правядзенне напярэдадні Дня Незалежнасці маладзёжнага свята "Дзень вышыванкі" ў сталіцы Беларусі. Свята стартавала маляўнічым арт-парадам, удзел у якім прынялі ўславіўшыя сваімі талентамі маладыя людзі, прадстаўнікі творчых і фальклорных калектываў, чарлідараў, удзельніцы конкурсу прыгажосці "Каралева вясна", рыцары, прадстаўнікі розных субкультур. Замыкалі калону музей-бус "Кветкі Вялікай Перамогі", байкеры і рэтра-аўтамабілі, упрыгожаныя сцягамі. Беларуская вышыванка стала мастацкай дамінантай усіх мерапрыемстваў да Дня Незалежнасці.

**5.** Сваё 25-годдзе адзначыў у гэтым годзе Міжнародны фестываль мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску". Фестываль прайшоў з 14 па 18 ліпеня, а 12 — 13 і 19 — 20 ліпеня адбыліся дадатковыя мерапрыемствы. У асноўнай праграме было заяўлена больш за 130 праектаў. Сярод унікальных падзей — Кніга рэкордаў фестывалю. Удзельнікамі "Славянскага базару" сталі больш за 5 тысяч чалавек з 45 краін свету. Прадстаўнік Беларусі Аляксей Грос стаў уладальнікам Гран-пры Конкурсу маладых выканаўцаў эстраднай песні "Віцебск-2016" на XXV Міжнародным фестывалі мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску", а першая прэмія, спецпрыз і дыплом лаўрэата (уладальніка I прэміі) дзіцячага вакальнага конкурсу прысуджаны беларускі Настассі Жабко.

**6.** Свята "Купалле" ў аграгарадку Александрыя, якое прайшло 9 — 10 ліпеня, стала нацыянальным здабыткам Беларусі. На маляўнічым беразе Дняпра сустракаюцца людзі розных пакаленняў, розных нацыянальнасцяў, з розных краін, і ў кожнага ёсць унікальная магчымасць падзяліцца сваёй творчасцю, прафесійным вопытам, дакрануцца да вытокаў культуры. Гэтае свята спрыяе аб'яднанню славянскіх народаў. Адно з самых старажытных святаў Купалле стала нацыянальным культурным сімвалам, які накіраваны на развіццё і захаванне традыцый, культур.

**7.** Выстава "Іканапіс Беларусі XVII — XXI стагоддзяў з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь" дэманстравалася з 18 мая па 25 ліпеня ў музеі Ватыкана, у непасрэднай блізкасці ад знакамітай Сікстынскай капэлы з роспісамі Мікеланджэла. Экспазіцыя ўключала 31 ікону беларускіх іканапісцаў і 2 чаканыя аклады, пазнаёміла італьянскіх спецыялістаў і шматлікіх турыстаў з усяго свету з унікальнымі творамі сакральнай беларускай культуры.

**8.** Пашыранай версіяй выставы ікон у Ватыкане стала выстава "Свет нябесны на зямлі" ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, якая адкрылася 30 верасня. На ёй прадстаўлены творы царкоўнага мастацтва XVII — XXI стагоддзяў, у экспазіцыю ўвайшлі праваслаўныя, каталіцкія, уніяцкія абразы і алтарныя карціны, мастацкае ткацтва, прадметы літургіі. Гэта творы са збору Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь і абразы сучасных іканапісцаў, якія працягваюць старажытныя традыцыі Візантыі і краін Балканскага рэгіёна.

**9.** Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік "Нясвіж" удастоены прыза "Еўропа Ностра-2016" у катэгорыі "Адданая служба". Журы прэміі было ўражана манументальнай працай па стварэнні музея ў нядаўна адноўленым палацы Радзівілаў усяго за некалькі месяцаў. Здольнасць музея падтрымліваць цікавасць грамадскасці і выбітная лічба 400 тысяч наведвальнікаў штогод таксама, на думку вядучай еўрапейскай арганізацыі ў галіне спадчыны "Еўропа Ностра", заслугоўваюць узнагароды. Праект стварэння музея ўключаў уладкаванне 30 экспазіцыйных залаў і фондаў, якія захоўваюць 20 тысяч прадметаў.

**10.** Беларусь ганарыцца сваімі таленавітымі асобамі. У Год культуры творчасць многіх культурных дзеячаў адзначана не толькі ў сваёй краіне. Так, прэміяй Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва за 2015 — 2016 гады ўганараваны аўтарскі калектыў у складзе народнага артыста Беларусі, мастацкага кіраўніка ансамбля "Сябры" Анатоля Ярмоленкі, кампазітара, заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь Алега Елісеенкава, паэта Івана Юркіна — за альбом "Дзе каліна цвіла". А вядомы беларускі пісьменнік, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец стаў пераможцам міжнароднага конкурсу "Нацыянальная літаратурная прэмія "Залатое пяро Русі 2016" у намінацыі "Проза" — за высокую грамадзянскую пазіцыю твораў. У цэлым актуальнай тэмай Года культуры стала тэма папулярызацыі беларускага мастацтва, яркіх імёнаў беларускай культуры.

2016 ГОД КУЛЬТУРЫ

**У Год культуры хэштэг #2016годкультуры стаў назвай новай рубрыкі "К" і пазнакай для ўсіх матэрыялаў на сеціўных рэсурсах газеты. А напрыканцы года прапануем чытачам скласці ўласныя топ-3, топ-5, топ-10 падзей Года культуры ў сферы культуры. Прыкладам — спіс ад БелТА, які быў падрыхтаваны да Дня работнікаў культуры.**

# Каб набыць "што-небудзь беларускае"...

Вяртаючыся да надрукаванага

**"К" пісала ў нумары 45 за 2015 год пра нацыянальныя матывы на шпалерах беларускай вытворчасці. Тады давялося з сумам канстатаваць, што нацыянальных матываў на прадукцыі гомельскай і мінскай шпалерных фабрык не адшукаць. За год сітуацыя трошкі палепшылася, пра што з радасцю інфармуем. У 2016-м абедзве фабрыкі выпусцілі шпалеры з выявамі беларускіх замкаў на фоне карты краіны. Будзем спадзявацца, што ўзнятая на старонках газеты тэма сталася заўважанай.**

Алена ЛЯШКЕВІЧ

Узоры прадукцыі Гомельскай і Мінскай шпалерных фабрык.

Гомельская і Мінская шпалерныя фабрыкі ўваходзяць у адзін холдынг, аднак дызайнеры там працуюць асобна. У канцы 2015 года ў Гомелі рыхтаваліся да выхаду на рынак шпалеры з узорам "Замкавы". Цяпер яны ўнесеныя ў каталог на сайце фабрыкі. На фоне карты Вялікага Княства Літоўскага — выявы Нясвіжскага і Мірскага замкаў, дасяжныя ў шэрай ці бежавай гаме. Дарэчы, сайт Гомельскай шпалернай фабрыкі за апошні год быў абноўлены, стаў больш прэзентабельным візуальна.

Як распавяла загадчык упраўлення збыту і маркетынгу прадпрыемства "Гомельшпалеры" Наталля Жукава, спачатку планавалася змясціць на шпалерах выявы чатырох замкаў, але малюнак атрымліваўся вельмі дробным. Шпалеры карыстаюцца попытам, прадаюцца ўнутры краіны, але збольшага ідуць на экспарт. Наталля Жукава тлумачыць папулярнасць узору "Замкавы" не беларускай тэматыкай, а тэхнічнымі ўласцівасцямі: гэта шпалеры хімічнага ціснення, якія ў народзе завуцца "супер-мыйка" і лічацца вельмі ўстойлівымі да мыцця. У планах прадпрыемства — выпуск шпалераў з узорам "Віды Палесся". Дызайн знаходзіцца ў распрацоўцы, хутчэй за ўсё, на новай прадукцыі можна будзе пабачыць выявы палескай прыроды.

Мінская шпалерная фабрыка выпусціла шпалеры "Палац", на якіх выяўленыя Мірскі замак, Нясвіжскі і Косаўскі палацы, Вілейскі касцёл і вуліцы Гродна. Гэта серыя выкананая ў трох варыянтах колераў: бежавы, шэры, "табака" (зеленаваты). Віды архітэктурных помнікаў змешчаныя на фоне карты Беларусі, між выявамі — устаўкі традыцыйнага арнаменту. Мабыць, з мэтамі асветніцкімі выявы падпісаныя. Што прыемна, па-беларуску. Яшчэ адна навінка ад Мінскай шпалернай фабрыкі — узор "Купалінка" з матывамі беларускага арнаменту, больш дакладна — васьміканцовай зоркі. Каларыстыка — бежавая, цёмна-сіняя, бардовая. Два першыя колеры не дужа характэрныя для традыцыйнага арнаменту. Ды і сам матыў сустракаецца не так часта. Мастацтвазнаўца Вольга Лабачэўская лічыць васьміканцовыя зоркі, выкананыя ў тэхніцы касой лікавай гладзі, рэгіянальнай асаблівасцю тканін Падняпроўя. Для традыцыйнага тэкстылю канца XIX — пачатку XX стагоддзя іншых рэгіёнаў Беларусі васьміканцовая зорка не характэрная. Таму даследчыца робіць выснову, што гэты арнаментальны матыў распаўсюдзіўся на нашых землях разам з узорамі еўрапейскіх тканін не раней за XVI — XVIII стагоддзі. Праўда, на посцілках, вытканых у XX стагоддзі, матыў васьміканцовай зоркі сустракаецца ўжо часцей.

Файна, што беларускія вытворцы паступова "паварочваюцца тварам" да нацыянальнай тэматыкі. Выпуск такіх шпалераў, з аднаго боку, — падзея, вартая самага шырокага піяру. З іншага боку, калі прадукцыі з нацыянальнымі матывамі ў шпалерных фабрык будзе выходзіць не па адным-два ўзоры на год, спажыўцы будуць ведаць і без піяру, што можна проста пайсці ў краму будаўнічых тавараў і набыць там "што-небудзь беларускае".

К

Вяртаючыся да надрукаванага

# Іншы погляд на Агінскага-2

## Дык дзе тут Міхал Клеафас зомбі ганяў?

**Мабыць, усім вядомае выслоўе, што пераможцаў не судзяць, што важны толькі вынік, а ўжо сродкі дасягнення мэты — справа другасная. Ёсць, аднак, і нязгодныя з гэтай тэзай. Яны мяркуюць, што высакародная мэта можа быць спляжана, скампраметавана, калі сродкі ёй не адпавядаюць. Папулярызацыя здабыткаў нацыянальнай гісторыі, пашырэнне культурнай прасторы, безумоўна, годная справа. Але прысвечаная асобе знакамітага Міхала Клеафаса Агінскага кніга "1813" Уладзіміра Садоўскага справакавала дыскусію пра этычныя межы творцы. Прынамсі, пра гэта інтэрв'ю з навуковым супрацоўнікам Музея-сядзібы Агінскага ў Залессі Таццянай КЛЯШЧОНАК.**

Таццяна Кляшчонак.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

**— Спадарыня Таццяна, ці можа, на вашу думку, кніга Уладзіміра Садоўскага "1813" быць скарыстаная ў вашай працы для папулярызацыі асобы Агінскага?**

— Не! Ужо сама вокладка кнігі прымусіла мяне ўздрыгануцца. Партрэту Агінскага, які намаляваў Франсуа Ксаўе Фабр, мясцовы афарміцель надаў "выразнасці", аздобіўшы выяву кампазітара скрываўленым зубастым чэрапам і пісталетам. А потым было знаёмства з тэкставымі ўрыўкамі, змешчанымі ў сеціве. У час шпацыру па ваколіцах Маладзечна Агінскі патрапляе на зледзянелыя трупы французскіх салдат. Адзін з іх нават спрабуе ўхапіць яго за крысо вопраткі, але Агінскі, ахоплены ўспамінамі, таго нават не заўважае. У гэты момант ён згадвае, як пісаў ліст да жонкі: "Памятаеш, як я хлапчуком прабраўся туды [гаворка пра стайню ягонага дзядзькі Францішка Ксаверыя Агінскага, уладальніка Маладзечна ў 1783 — 1813 гадах], скраў лепшага варанога скакуна і лётаў па сенажаці, ловячы рукамі вецер? А потым атрымаў такіх бізуноў, што хадзіць тыдзень не мог".

**— Што менавіта вас уразіла ў гэтым урыўку?**

— Арыстакрат, нашчадак Рурыкавічаў, выхаваны імператарскім гувернёрам з Вены, найбагаты спадкаемец роду, ён ужо ва ўзросце чатырох гадоў прысутнічаў на прыёмах і гутарыў з каралём Рэчы Паспалітай — і раптам "атрымаў бізуноў"! Ды хто ж адважыцца ўзняць на яго руку? Прыгонныя па вызначэнні не маглі біць свабодных людзей. Застаецца дзядзька… Але ж ён не мог апусціцца да такой ганьбы роду перад грамадой! Гэта першае. А па-другое, ёсць тут храналагічнае несупадзенне.

**— Патлумачце.**

— Калі Агінскі "быў хлапчуком", а гэта 1770-я, ягоны дзядзька Францішак Ксаверый жыў не ў Маладзечне, а ў Вільні. А тую сядзібу, дзе Міхал Клеафас нібыта каня скраў, ягоны дзядзька атрымаў толькі ў 1783 годзе паводле запавету пасля смерці свайго бацькі князя Тадэвуша. Міхалу Клеафасу на той момант было 18 гадоў, ён пачаў удзельнічаць з пасяджэннях сейму ў Варшаве ў якасці вольнага слухача і каментатара. Так ён набываў палітычны вопыт.

А калі Агінскі насамрэч быў хлапчуком, дык ён жыў у бацькоўскім палацы пад Варшавай, і выхоўваў яго згаданы імператарскі гувернёр Жан Рале на працягу 11 гадоў — з 6 да 17. Хлопчык спецыялізаваўся на напісанні навуковых трактатаў на замежных мовах, а некаторыя прадметы яму выкладалі каралеўскія прыдворныя. Малаверагодна, каб Міхал Клеафас мог ездзіць з Варшавы ў Маладзечна пагасціць у дзядзькі. Па тым часе гэта надта далёка. Да ўсяго, далёкай, чатырохюраднай, яму тая радня. Кантактаў з ёй Агінскі не падтрымліваў. Так што ён ніколі не жыў у Маладзечне — ні да 1813 года, ні пасля. У мемуарах ён піша: "…я пакінуў Пецярбург 28 красавіка 1802 года, маючы намер адасобіцца назаўсёды са сваёй сям'ёй у адной з вёсак паблізу Вільні, жыць там незалежна і займацца толькі справамі майго дома…" З родным дзядзькам, уладальнікам Маладзечна, ён меў непрыязныя і няпростыя стасункі. Пра гэта ён таксама піша ў сваіх мемуарах. Вайну 1812 года Міхал Клеафас правёў у Пецярбургу пры імператары Аляксандры I, а па вясне з'ехаў у Італію. Ягоная жонка Марыя была цяжарная трэцяй дачкой і мела намер нарадзіць дзіця ў Заходняй Еўропе...

Мяркую, калі наогул брацца за тое, каб пісаць пра Агінскага, варта пачытаць ягоныя мемуары. Яны, дарэчы, ёсць у продажы ў нашым музеі. Пяць гадоў таму мемуары былі перакладзены часткова Вольгай Рамановіч, а летась — цалкам некалькімі перакладчыкамі. Калі ж падлеткі будуць знаёміцца з асобай Агінскага выключна праз кнігу "1813", дык праз які год у наведвальнікаў нашага музея з ліку гэтых чытачоў будзе да экскурсаводаў адно пытанне: дзе тут Агінскі зомбі ганяў?

**— Урэшце, прыгодніцкая літаратура больш запатрабаваная, чым мемуарная.**

— Я за развіццё і ўзбагачэнне беларускай літаратуры новымі відамі і жанрамі, у тым ліку і фантазійнымі. Сама ўжо амаль скончыла пісаць навукова-папулярную аповесць пра дзяцінства Міхала Клеафаса Агінскага пад назвай "Жан Рале", заснаваную на шматлікіх дакументальных звестках і ўспамінах самога Агінскага. Калі гаворка заходзіць пра тое, што трэба папулярызаваць уласную гісторыю, дык звычайна ў якасці станоўчага прыкладу згадваюць творы Уладзіміра Караткевіча "Дзікае паляванне караля Стаха" і "Чорны замак Альшанскі". І было б някепска, каб сучасныя аўтары арыентаваліся менавіта на такую якасць. Да ўсяго, Караткевіч не ўказваў, дзе канкрэтна размяшчаўся Альшанскі замак, і тым самым пазбегнуў спрэчак з літаратурнымі крытыкамі, гісторыкамі. Тое ж варта было рабіць і аўтару "1813". Вось Садоўскі піша, што Міхал Клеафас жыў у Маладзечна ў родавым замку князёў Агінскіх, хоць сучаснікі называлі ўладанне замкам князёў Збажанскіх. А родавыя рэзідэнцыі Агінскіх былі пабудаваныя, у асноўным, вакол паселішча Агінты паміж Вільняй і Трокамі, і там шмат што ацалела да сённяшняга дня. Маладзечанскі замак перайшоў у рукі Міхала Клеафаса толькі ў 1814 годзе, пасля смерці дзядзькі. Нам трэба прызвычайвацца да таго, што гісторыя магнацкіх рэзідэнцый — гэта дакладная навука.

Уладзімір Садоўскі пазіцыянуе сябе як закладальнік новай плыні ў беларускай літаратуры — зомбіхорару. Калі ж засяроджвацца не на тэрміналогіі, а на сутнасці, дык нічога новага ў тым няма — звычайная страшылка кшталту тых, пра ўсялякіх нячысцікаў, якімі ў беларускіх вёсках у доўгія вечары страшылі непаслухмяных дзетак. Аўтар "1813" лічыць, што з дапамогаю такога жанру ён зробіць папулярным сярод чытачоў вобраз Міхала Клеафаса Агінскага і да таго ж прасуне наперад беларускую літаратуру. Па мне, няхай піша свае страшылкі, але не закранаючы Агінскага. Хаця ажылыя мерцвякі і шкілеты ўжо настолькі збіты вобраз…

**— Але ж без такога галоўнага героя сама кніга губляе сэнс. Вы ўвогуле супраць таго, каб падобнага роду літаратура своеасабліва трактавала гістарычнае аблічча нацыянальных герояў?**

— Каб на ролю змагара з мерцвякамі быў абраны нехта іншы, не ўзнікла б увогуле ніякіх пярэчанняў. Ёсць легендарныя постаці, пра якіх мала што вядома канкрэтна. Іх жыццяпіс складаецца, у асноўным, з домыслаў і ўсялякіх версій — ад цалкам верагодных да абсалютна фантастычных. Тут для пісьменніка шырокае фантазійнае поле. Але што да Агінскага, пра якога ў юбілейны год было столькі напісана… З'явіліся даследаванні ягонай біяграфіі, творчай спадчыны, палітычнай і дыпламатычнай дзейнасці, удзелу ў касцюшкаўскім паўстанні і эміграцыі, знойдзены звесткі пра яго продкаў і нашчадкаў, пераклады мемуараў на рускую і часткова на беларускую мовы. Паколькі жыццё Агінскага даволі падрабязна задакументавана, нельга адвольна пераносіць яго ў месцы, дзе ён прынцыпова не мог быць, і надаваць яму неўласцівыя ягонай асобе рысы і функцыі. Ну і выбар выдатнага кампазітара і грамадскага дзеяча на ролю пагромшчыка мерцвякоў у ваколіцах Маладзечна выглядае местачковым патрыятызмам. Бо дзейнасць Агінскага насамрэч была куды больш маштабнай. Гэта постаць з агульнаеўрапейскага пантэона.

Іншы погляд на Агінскага

Таццяна Кляшчонак: "Выбар выдатнага кампазітара і грамадскага дзеяча **на ролю пагромшчыка мерцвякоў** у ваколіцах Маладзечна выглядае местачковым патрыятызмам. Бо дзейнасць Агінскага была куды больш маштабнай. Гэта постаць з агульнаеўрапейскага пантэона".

Дзяжурны па нумары

# Атака троляў, або Даеўрабачыліся…

**За што я люблю айчынную папулярную музыку (эстрадную альбо рокавую)? За ўменне перыядычна па-сапраўднаму радаваць. Вось і днямі стварыла яна для мяне проста свята нейкае. Вялікая спакуса ўзяць у двукоссе слова "свята", але ж задавальненне ад пачутага ды ўбачанага я атрымаў у сапраўднасці!.. Хоць і "задавальненне" просіцца абнесці штрышкамі. Калі вы яшчэ не здагадаліся, інтрыгую я паўфінальным адборачным турам да "Еўрабачання", што выліўся ў парад фрыкаў усіх масцей. Вось, аказваецца, на каго безумоўна багатая наша зямля беларуская!..**

Алег КЛІМАЎ

"Пераражыўшы" напышлівага акі Махамед Алі са своеасаблівым англійскім вымаўленнем Аляксандра Саладуху, лагічна паўсталы ў "зомба-скрыні" зомбі-калектыў Віталя Варанко, што забіваў баянам фугі ў самае эстэтычнае нутро людзей, я і выказаць здагадкі не мог, што гэта толькі пачатак нашэсця па нашы кволыя душы арміі не з гэтага свету тых, хто ротам спявае. А развіццё падзей прытаілася побач. І бабахнула ў мозг залпам "Аўроры": ва ўсё залімітавае пусціліся прызнаныя, дзесьці і кімсьці прызнаныя і наогул непрызнаныя артысты ды нібыта выканаўцы. Гналі пераднавагоднюю "завею" яны з запалам, з пафасам ды са скупой мужчынскай слязой, расхіставаючы маю нервовую сістэму. Вызначыўся "эксклюзівам" пра барыста і той, ад каго я падобнага выкрунтасу ну ніяк не чакаў — вечна лірычны Аляксандр Сухараў, з якім мы ў пару яго станаўлення не адзін кубак гарбаты "раздушылі" ў кампаніях шумлівых.

Выпіўшы валідолу пасля нейкага чарговага "англамоўнага" стварэння (туманнаму Альбіёну зараз і з англійскай мовы трэба выходзіць), адкачаўшы валяр'янавымі кроплямі пад "на досвітку пабудзі мяне шчаслівую", не даўшы апусціцца павекам ды скруціцца вушам, дунуўшы на паненку, якая пра тое эратычна ўмольвала, угаварыўшы сябе, што, падабаецца-не падабаецца, а і з такім змірыцца давядзецца, экстаз ад металшоу ансамбля "The Superbullz" (у якім, на хвілінку, за галоўнага зусім не апошні ў краіне па прафесіяналізме ды наяўнасці густу Алесь-Францішак Мышкевіч) мяне ўжо не накрыў. Паверце, я не такі ўжо дзікі, як здаюся, і гумарыць сам люблю, але ў дадзеным выпадку гурт "Kriwi", вазьмі ён на сябе ролю Станіслаўскага, праспяваў бы нешта накшталт "За сцёбам нічога не відна". Ну а опусы некаторых іншых, што падносіліся як драматургічныя творы і "ў вобразе" (як, напрыклад, стогн пра кліч адзіны славянскіх светаў): творчасць Аляксандра Сярова — бяздарная самадзейнасць у параўнанні з імі.

А можа, я чагосьці "не даганяю", і ў такіх з'явах народу быў закладзены глыбокі сэнс — у меру магчымасцяў выказаць "фе" туру працяжнік "Еўра", кшталту: як бы ўволю публічна паздзекавацца над абодвума праектамі? Ці таго горш — ідэя была ў банальным "засвятленні" ўласнага таленту перад пэўнай электроннай аўдыторыяй хоць з чымсьці? Няўжо артысты напраўду і ўсур'ёз усё вось гэта спявалі ды скакалі? Тады нашай поп-музыцы дакладна прыходзіць поўны карачун.

"Якое шчасце, — дагрызаючы пазногці, думаў я, седзячы ля камп'ютара, на экране якога буяла дзейства ад папсы лёгкай і цяжкай, — што сёлета Аляксандр Ціхановіч не ўзначаліў "адборачнае" журы. Нават яго адважнае сэрца наўрад ці вытрымала б гэты "перформанс". Дапырхаліся… Даеўрабачыліся…

**У мінскім Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры прайшла выстава факсімільных фотаздымкаў з фондаў Расійскага этнаграфічнага музея (РЭМ) “Сям’я ў культуры народаў Еўразіі. XX стагоддзе”, пра якую “К” пісала ў № 48. На выставе было некалькі фота з тэрыторыі Беларусі, у тым ліку зробленых Аляксандрам Сержпутоўскім. Слынная асоба, ён больш вядомы ў нас як этнограф, чым у якасці фатографа. Пра розныя аспекты яго спадчыны гутарым з кіраўніком міжнароднага праекта “Беларуская этнамузеялагічная спадчына Аляксандра Сержпутоўскага ў зборах Расійскага этнаграфічнага музея”, старшым навуковым супрацоўнікам аддзела народазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдатам гістарычных навук Сяргеем Грунтовым.**

Галоўчыцы, Мазырскі павет. Сяляне-перасяленцы з Магілёўскай губерні. 1906 год.

Алена ЛЯШКЕВІЧ

# Этнограф і фатограф

Лучыцы, Слуцкі павет. Калодзеж. 1906 год.

Лучыцы, Слуцкі павет. 1906 год. / Усе фота Аляксандра Сержпутоўскага — з фотатэкі РЭМ

## Спадчына Аляксандра Сержпутоўскага вяртаецца ў Беларусь

— Праект беларуска-расійскі, таму мы вывучаем, з аднаго боку, беларусаў, з іншага — тэрыторыю Беларусі. Гэта не тоесныя рэчы, беларусы могуць жыць і паза межамі краіны. У беларускіх калекцыях Сержпутоўскага ёсць матэрыялы з цяперашніх Пскоўшчыны і Браншчыны. У той жа час, зборы з Маларыцкага і самага поўдню Столінскага раёна ім класіфікаваныя ў калекцыю “Украінцы”. Такія былі ўяўленні пра межы этнічнай тэрыторыі ў пачатку XX стагоддзя.

Я рыхтую да друку нарыс “Палешукі-беларусы”. У ім абагульнены веды Аляксандра Сержпутоўскага пра Палессе па стане на пачатак 1910-х. Марыя Віннікава працуе з тэкстылем са збораў Аляксандра Казіміравіча, вынікі яе даследаванняў ужо знайшлі адлюстраванне ў альбоме “Традыцыйны беларускі касцюм”, выдадзеным сёлета, і будуць выкарыстоўвацца потым для напісання навуковых артыкулаў, як і вынікі працы Юрыя Унуковіча, які займаецца рукапіснай і фатаграфічнай спадчынай Аляксандра Сержпутоўскага. Куратар з расійскага боку — Алег Лысенка, старшы навуковы супрацоўнік аддзела Беларусі, Украіны і Малдовы РЭМ. Ён сам родам з Беларусі, беларусіст, пэўны час ачольваў гэты аддзел, заўсёды дапамагае прасоўванню беларускіх праектаў. Доўгі час Лысенка займаўся Сержпутоўскім. Варта разумець, што для нас Аляксандр Казіміравіч — толькі адзін з добрых этнографаў. А ў Пецярбургу ён — пачынальнік беларусістыкі ў РЭМ: асноўныя беларускія калекцыі, што там захоўваюцца, сабраў Сержпутоўскі.

Мы з’ездзілі ў некалькі камандзіровак у Санкт-Пецярбург, частку матэрыялаў паглядзелі, але зборы Аляксандра Сержпутоўскага вялізныя і не ўсё зараз дасяжна праз пераезд фондаў РЭМ. На перспектыву мы разглядаем выданне фотаздымкаў Сержпутоўскага. Праект фінансуецца Беларускім рэспубліканскім фондам фундаментальных даследаванняў і Расійскім гуманітарным навуковым фондам. Даследаванні доўжыліся два гады, мы падалі заяўку на працяг фінансавання.

**— Раскажыце, калі ласка, больш падрабязна пра Вашу працу з нарысам “Палешукі-беларусы”.**

— Рукапіс выдаваўся ў 2010 годзе ў музейным часопісе РЭМ, што выходзіць малым накладам і амаль невядомы ў Беларусі. Прынамсі, нашы бібліятэкі яго не выпісваюць. Нарыс жа — вельмі каштоўная крыніца па этнаграфіі Беларусі, цікавая і навукоўцам, і аматарам. Для таго, каб забяспечыць шырэйшы доступ да “Палешукоў-беларусаў”, запланаваны яго выхад налета ў выдавецтве “Беларуская навука”. Я пераклаў тэкст з рускай мовы на беларускую. Ведаючы беларускія сімпатыі Аляксандра Сержпутоўскага, мяркую, што каб абставіны дазвалялі, ён падрыхтаваў бы працу па-беларуску. Яго публікацыі 1920-х, дарэчы, выйшлі па-беларуску, а ў “Беларусах-палешуках” сустракаюцца дыялектныя слоўцы.

Сяргей Грунтоў.

Нарыс будуецца па класічнай для этнаграфічных прац таго часу схеме: апісанне матэрыяльнай культуры (жытла, прылад працы, строяў), раздзел па “прымхах і забабонах”. Каляндарныя абрады асобным блокам не апісваюцца, але згадкі пра іх сустракаюцца па тэксце, бо ўся беларуская культура — земляробчая. Нарыс утрымлівае малюнкі рукі Аляксандра Сержпутоўскага. Ён, дарэчы, добра маляваў.

**— Што наконт іншых рукапісаў Сержпутоўскага ў фондах РЭМ?**

— Яны чакаюць свайго часу. Напрыклад, зборнік беларускіх прыказак, частка якога захавалася ў рукапісе, выдадзены Уладзімірам Касько, але не як навуковая праца. Мы хацелі б аднойчы надрукаваць тыя прыказкі з грунтоўным навуковым каментаром, без якога шмат якія рэчы могуць быць незразумелымі. Сустракаюцца непаліткарэктныя выказванні, нецэнзурныя. І гэта цалкам натуральна для народнай культуры: напрыклад, казкі, дзе высмейваюцца яўрэі. Але ж смех над “іншым” дапамагаў пераадольваць сацыяльнае напружанне і ён, няма сумневаў, заўсёды лепшы за гвалт. Трэба, канешне, думаць, ці даваць такія рэчы ў папулярны друк. А ў навуковым выданні тая ж казка з антысеміцкімі матывамі становіцца ўжо цікавай крыніцай для аналізу.

**— А якія фота Сержпутоўскага захоўваюцца ў РЭМ?**

— Калекцыі з 1906 да 1930 гадоў. Найбольш фотаздымкаў паходзіць з той жа тэрыторыі, што і большасць тэкстаў: гістарычная Случчына, Палессе, цяперашні Салігорскі раён, поўнач Ганцавіччыны. Аляксандр Сержпутоўскі там нарадзіўся, вучыўся, настаўнічаў. Акрамя таго, фота, зробленыя між Гомелем і Бранскам; з усходняй часткі Магілёўскай губерні; з гістарычнай Віцебшчыны: ваколіц Полацка і Невеля (цяпер гэта Пскоўская вобласць Расіі). У Заходняй Беларусі ён быў толькі да рэвалюцыі, з таго часу і захаваліся фотаздымкі з ваколіц Ганцавічаў, Століна і Маларыты. Была адна экспедыцыя на тэрыторыю Літвы, але там відавочна прадстаўлена не беларуская, а менавіта літоўская культура. Па беларусах у РЭМ захоўваецца больш за 10 калекцый фотаздымкаў Сержпутоўскага, у іх больш за тысячу адзінак.

**— Якая навуковая і мастацкая вартасць тых здымкаў? Ці суправаджаліся яны аўтарскімі подпісамі?**

— У Сержпутоўскага былі інструкцыі, ён ведаў, што трэба зняць, да прыкладу, жытло, агульны від вясковай вуліцы, сялян у строях, нейкія дэталі… І ён працаваў па гэтых інструкцыях, нават калі этнаграфія ў II палове 1920-х стала ператварацца ў “савецкую этнаграфію”: вывучалі калгасы, здымалі перадавікоў… Фота некаторых тагачасных этнографаў складана адрозніць ад хронікі ў савецкай перыёдыцы: яны могуць разглядацца хутчэй як крыніцы для вывучэння гісторыі штодзённасці, чым этнаграфіі. Мастацкая якасць гэтых здымкаў розная, Сержпутоўскі ўсё ж не Ян Булгак — фота зроблены не з дэкаратыўнымі мэтамі. У Сержпутоўскага — навуковыя здымкі, часам не вельмі якасныя, часам паўтараюцца, хаця сустракаюцца вельмі па-мастацку яскравыя кадры.

Разгорнутыя этнаграфічныя каментарыі былі пад фота з самых ранніх калекцый, потым ён падпісваў здымкі ў аб’ёме, дастатковым для таго, каб іх занесці ў фотатэку РЭМ.

**— А што на гэтых подпісах? Ці сустракаюцца, як у Ісака Сербава, падрабязныя звесткі пра фізічныя параметры, імёны, сацыяльны статус?**

— Сержпутоўскі менш за Сербава займаўся фізічнай антрапалогіяй — не яго тэма. Лічыцца, што ён трошкі зацікавіўся ёй у 1920-х, так што некалькі фота, дзе бачныя “антрапалагічныя тыпы”, у яго калекцыях ёсць. Калі выдаваць гэтыя фотаздымкі, дык навуковы каментарый проста неабходны, каб усё было зразумела не толькі даследчыкам, а і больш шырокаму колу чытачоў. Што вынесе аматар, гартаючы альбом з фота 100-гадовай даўніны? Што беларусы былі бедныя, басыя, стрэхі ў хатах дзіравыя… Тады трэба тлумачыць, што Сержпутоўскі шукаў старыя хаты з традыцыйнымі канструктыўнымі элементамі… Ён разумеў, што вёска мадэрнізуецца, але не ўсё, што бачыў, лічыў прадметам этнаграфічнага даследавання. Мая пазіцыя, што старыя фотаздымкі можна падаваць і тлумачыць праз кантэкст мадэрнізацыі: гэта ж неверагодна, як за сто гадоў усё змянілася!

**— Можа быць, нейкія здымкі Сержпутоўскага асабліва запамінаюцца? Калі даводзілася глядзець яго матэрыялы з іншых краін, культура якіх для нас далёкая, што кідалася ў вочы?**

— Я прафесійна займаюся могілкамі, таму маю ўвагу прыцягнулі прыклады (драўляная калода, якую клалі на магільны насып). Класічнае фота, дзе выяўлены сам Сержпутоўскі з так званымі “абхазскімі неграмі”. Гэта, канечне, не негры, а прадстаўнікі цёмнаскурай народнасці, што жыла на Каўказе. Даследчык сфатаграфаваўся з імі, каб паказаць кантраст колеру скуры. Гэта вялікая рэдкасць па тых часах — даследчык у кадры, побач з тымі, каго ён вывучаў.

**— Якая практычная значнасць матэрыялаў Аляксандра Сержпутоўскага?**

— Ён запісваў, як яму расказвалі. Не ганяўся за архаікай, чароўнымі казкамі. Некаторыя з аповедаў — гэта і не зусім казкі, нейкія смешныя гісторыі, дзе бачны сацыяльны кантэкст. Што да фота, то ён да 1930-га трымаўся старых інструкцый, здымаў праявы традыцыйнага побыту, а не “новага жыцця”. Калі матэрыялы выйдуць, яны будуць асабліва каштоўныя энтузіястам на месцах: краязнаўцы пабачаць цэрквы і сінагогі, якіх ужо няма, мастацкія кіраўнікі фальклорных гуртоў — выявы аўтэнтычных строяў сваёй мясцовасці. І гэта цікаўнасць не для справаздачы: людзі сапраўды могуць скарыстаць матэрыялы ў сваёй працы.

К

# Навуковы слэм і чытацкі онлайн

## Інфармацыйная будучыня: бачанне бібліятэкараў

**Выступленні па скайпе, прэзентацыі праектаў, расповеды пра актуальныя тэндэнцыі ў бібліятэчнай сферы і пра тое, як змагацца за чытача — пра ўсё гэта ды многае іншае можна было даведацца на II Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Бібліятэкі ў інфармацыйным грамадстве: захаванне традыцый і развіццё новых тэхналогій". Мерапрыемства адбылося 1 — 2 снежня на базе Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі імя Івана Лупіновіча.**

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Натуральна, форум гэты ладзіўся найперш для спецыялістаў бібліятэчнай сферы, а таксама для айчынных навукоўцаў. Скажам, на канферэнцыі многа казалі пра тое, як павысіць цікавасць замежнага чытача да вынікаў навуковых даследаванняў, што ладзяцца на Беларусі. Выснова тут, бадай, адзіная: публікацыі па розных галінах ведаў варта друкаваць не толькі ў айчынных, а і ў замежных часопісах, у тым ліку — і ў аўтарытэтных выданнях накшталт "Science & Nature", кантралюючы пры гэтым паказчыкі сваёй эфектыўнасці ў індэксах цытавання.

Праўда, як адзначыла ў сваім выступленні загадчык навукова-бібліяграфічнага аддзела абслугоўвання аддаленых карыстальнікаў БСГБ Рыма Муравіцкая, пераважная большасць айчынных аўтараў гэтага рабіць пакуль што не ўмее. Таму бібліятэкары могуць і павінны дапамагаць такім навукоўцам заяўляць пра сябе і вынікі ўласных даследаванняў далёка за межамі краіны праз міжнародныя базы даных, дзе фіксуюцца навуковыя навінкі і дасягненні спецыялістаў з усяго свету.

Але, нягледзячы на пэўную спецыялізацыю бібліятэчнага міжнароднага форуму, на ім прагучалі шэраг даволі цікавых дакладаў і для старонняга слухача. Так, намеснік дырэктара Дзяржаўнай публічнай навукова-тэхнічнай бібліятэкі Расіі Наталля Рэдзькіна распавядала пра перспектыўныя тэхналогіі абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк. Да слова, даклад спецыяліста прагучаў па відэатрансляцыі з Новасібірска. Дык вось, па словах Рэдзькінай, колькасць інтэрнэт-сайтаў сёння набліжаецца да лічбы ў паўтара мільярда адзінак, а ў Сеціве "вандруюць" каля 96% маладых расіян ва ўзросце ад 14 да 29 гадоў. Значыць, заўважыла дакладчыца, трэба змагацца за віртуальнага чытача.

Напрыклад, супрацоўнікі ўстановы ўкаранілі такую паслугу, як онлайн-браніраванне чытацкага білета, якой ужо скарысталася больш за 200 чалавек. Таксама многія электронныя рэсурсы бібліятэкі размяшчаюцца адразу на сайце і імі можа пакарыстацца любы віртуальны наведвальнік. Яшчэ ёсць магчымасць замовіць упадабаную кнігу ці артыкул у часопісе не выходзячы з дома.

— Акрамя таго, у нас актыўна выкарыстоўваецца такая паслуга, як онлайн-кансультаванне па самых розных пытаннях, прычым як на сайце, так і з дапамогай мэсэнджараў ды ў сацыяльных сетках, — зазначыла Наталля Рэдзькіна. — Ажыццяўляем кансалтынгавыя паслугі, робім рассылку па электроннай пошце для нашых чытачоў па той тэматыцы, якая іх цікавіць, а таксама ладзім віртуальныя выставы.

У перспектыве плануецца перайсці да сістэмы персаналізаванага абслугоўвання: на бібліятэчным сайце ўжо працуе асабісты кабінет карыстальніка, дзе той або іншы чалавек можа атрымаць звесткі пра замоўленыя ім раней кнігі, скарыстаныя паслугі, запытацца пра навінкі той галіны навукі, у якой працуе.

Вопыт расійскіх бібліятэкараў, вядома ж, будзе карысны тым айчынным "кніжніцам", якія толькі пачынаюць змаганне за свайго віртуальнага чытача. Праўда, перад падобнымі захадамі адразу ж паўстануць перашкодай фінансавыя пытанні, бо, як вядома, найноўшае інфармацыйнае забеспячэнне каштуе не адзін дэнамінаваны рубель. Ды і зрабіць сёння сайт "пад ключ" можа далёка не кожная ўстанова краіны, асабліва ў райцэнтрах ці невялікіх гарадскіх паселішчах…

З іншых дакладаў адзначу выступленне загадчыка аддзела маркетынгавых даследаванняў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аліны Шкутавай, якая распавядала пра новыя грані івэнт-маркетынгу, паспяхова асвоеныя ва ўстанове культуры. Гаворка, у першую чаргу, ішла пра акцыю "Навуковы рынг", падчас якога ладзяцца "навуковыя баі" ў фармаце "science slam". Да слова, падобныя рэчы карыстаюцца сёння вялікай папулярнасцю ва ўсім свеце. Сутнасць жа іх наступная: у "кніжніцу" ці іншае вольнае месца запрашаюцца некалькі спецыялістаў з розных галін навукі, якія папулярна і на даступнай аўдыторыі мове за дзесяць хвілін распавядаюць пра тое, чым яны займаюцца. Потым у наступныя пяць хвілін навукоўцы адказваюць на пытанні аўдыторыі. Перамагае той, хто зможа зацікавіць сваім выступленнем як мага большую колькасць наведвальнікаў, бо гледачы галасуюць за таго ці іншага "баксёра". Адметная дэталь: расповед пра навуковыя дасягненні праходзіць без дэманстрацыі прэзентацый, а толькі пры дапамозе наглядных матэрыялаў, малюнкаў, відэа-роліка́ў, гумарэсак і гэтак далей.

— Падобныя акцыі, натуральна, прыцягваюць увагу грамадскасці да тых даследаванняў, якімі займаюцца беларускія вучоныя, — адзначыла Аліна Шкутава. — Завітаўшы на наш "рынг", многія высвятляюць для сябе адзін немалаважны факт: навука можа быць цікавай і займальнай, а не сумнай і цяжка ўспрымальнай на слых. Ды і бібліятэкары раздаюць свае рэквізіты ды рэкламныя ўлёткі, распавядаюць пра тыя паслугі, якія прадастаўляе ўстанова.

Па словах Аліны Шкутавай, бывае, што пасля "Навуковага рынгу" ў "кніжніцу" запісваецца з дзясятак чалавек, так што згаданая ёй тактыка агрэсіўнага маркетынгу сябе пакрысе апраўдвае. Пра інфармацыйную падтрымку я і не кажу: дзякуючы акцыі пра бібліятэку згадвалі ў медыя неаднаразова.

Да слова, партнёрам "Навуковага рынгу" выступае Савет маладых вучоных Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, вядомая кампанія EPAM Systems і Парк высокіх тэхналогій. Бібліятэкары ж выдаюць пераможцам адборачных тураў сертыфікаты на прадастаўленне бясплатных інфармацыйных паслуг у сваёй "кніжніцы". Так што ўдзельнічаць у бібліятэчным праекце айчынным навукоўцам не толькі прэстыжна, але і карысна. Зразумела, што карысць тая — узаемная.

Цалкам магчыма, што крэатыўную ідэю сталічных бібліятэкараў з цягам часу падхопяць і ў іншых раённых "кніжніцах", а таксама ў музеях ці дамах культуры Беларусі. Можна ж, скажам, запрашаць мясцовых спецыялістаў, людзей з вопытам працы ў розных галінах дзейнасці, і прасіць іх распавесці пра сваю сферу як мага больш цікава і займальна. Іншая справа, што не кожны да такога здольны, ды і публічнае выступленне патрабуе адмысловых навыкаў і ўменняў. Але, як вядома, хто не спрабуе — той не памыляецца. І, хто ведае, можа на адну з падобных навуковых вечарын завітае і будучы лаўрэат Нобелеўскай прэміі? Ды і яшчэ аднаго лаўрэата па літаратуры нашай краіне таксама, я думаю, мець не зашкодзіла б… Як мяркуеце?

К

# Ужо будзённасць?

**8 снежня ў Мінску прайшла канферэнцыя "Прэмія HR-брэнд-2016", на якой "засвяціліся" і праекты, звязаныя з культурнай сферай. Па словах арганізатараў, спецыяльная намінацыя "Культура", зробленая ў рамках сёлетняга Года культуры, дазволіла вызначыць лепшыя праекты айчынных працадаўцаў, скіраваныя на падтрыманне творчых ініцыятыў, развіццё народных традыцый і захаванне гісторыка-культурнай спадчыны.**

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Да слова, па даных апытання, праведзенага даследчым цэнтрам "Rabota.tut.by" сярод некалькіх соцень рэспандэнтаў, падобныя культурныя праекты вельмі значна ўзмацняюць брэнд кампаніі. Так, падчас даследавання было выяўлена, што 80% апытаных хочуць працаваць на прадпрыемствах, якія ў сваёй дзейнасці надаюць значную ўвагу духоўным каштоўнасцям.

Праўда, трэба адзначыць, што многія з праектаў, выстаўленых на конкурс, не былі надта новымі. Гэта датычыць праектаў "Арт-Беларусь", "Арт-астравы", "Джазавыя вечары каля Ратушы", ініцыятыў па стварэнні сайта для гродзенскага музея Максіма Багдановіча ды выпуску серыі карпаратыўных календароў, прысвечаных унікальным людзям і народным рамёствам краіны… Усе яны рэгулярна асвятляліся на старонках "К", прычым, неаднаразова цягам некалькіх гадоў.

Але былі прэзентаваныя і адносныя навінкі. Так, цікавы праект — гарадскі кніжны фестываль "Горад і Кнігі" — быў прадстаўлены галоўным бібліятэкарам аддзела маркетынгу і праектнай дзейнасці навуковай бібліятэкі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Вольгай Вовк. У рамках бібліятэчнай ініцыятывы адбываюцца экспертныя сустрэчы для бацькоў і спецыялістаў у галіне чытання, выстаўкі handmade герояў з сучасных кніг "Усмешлівыя Цуды" ды многае іншае. Сёлета, па словах Вольгі, фэст наведала каля 5 тысяч чалавек, а ў яго падрыхтоўцы прынялі ўдзел прыкладна 150 валанцёраў.

Дырэктар і галоўны рэдактар выдавецтва "Чатыры чвэрці" Ліліяна Анцух распавяла пра праект "Міхал Клеафас Агінскі і Беларусь", ажыццёўлены яшчэ летась, калі па ўсім свеце адзначалася 250-годдзе нашага знакамітага земляка, дыпламата і кампазітара. Менавіта да гэтай даты выдавецтва прыняло рашэнне пра пераклад на рускую мову мемуараў Агінскага ў чатырох тамах, а таксама аб перавыданні перакладаў кніг ягоных нашчадкаў Анджэя і Іва Залускіх.

Акрамя таго, прыцягнула ўвагу і ініцыятыва кампаніі "Прамагралізінг". У яе межах прэзентаваўся аматарскі калектыў народнай песні "Лілея". Па словах мастацкага кіраўніка ансамбля Таццяны Давыдзюк, самадзейныя артысты запатрабаваны на рэкламных акцыях прадпрыемства, якія ладзяцца ў Беларусі і далёка за яе межамі, неаднаразова выступалі на фестывалях, маюць шматлікія ўзнагароды ды дыпломы і з'яўляюцца візітнай карткай свайго прадпрыемства. Так што, як бачна, некаторыя кампаніі краіны не толькі захоўваюць традыцыі яшчэ савецкіх часоў, калі аматарскія калектывы меліся на кожнай буйной фабрыцы ці заводзе, але і маюць з гэтага значную карысць падчас прэзентацый сваёй прадукцыі. Хто ведае, можа гэта толькі пачатак новай тэндэнцыі?

Па выніках конкурснага адбору ў намінацыі "Культура" былі аб'яўлены пераможцамі праекты "Арт-Беларусь", "Джазавыя вечары каля Ратушы" і гарадскі кніжны фестываль "Горад і кнігі". Як зазначылі ў адказ на пытанне "К" арганізатары "Прэміі HR-брэнд 2016", цалкам магчыма, што названая намінацыя будзе заяўлена і ў наступным годзе: былі б толькі новыя цікавыя праекты і прапановы ды заяўкі ад удзельнікаў прэміі… Акрамя таго, магчымы ўдзел устаноў культуры Беларусі ў іншых намінацыях, дзе прэзентуюцца праекты, звязаныя з галіной кіравання персаналам. Так што стаць "HR-брэндам-2017" можна і працуючы ў культурнай сферы. Тым больш, як адзначыў падчас брыфінгу намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь Суша, бізнес сёння ўсё больш і больш становіцца прыхільным да культуры, а культурныя праекты робяцца часткай пазітыўнага іміджу той або іншай кампаніі ці банкаўскай установы. І гэта тая новая тэндэнцыя, якая фактычна ўжо сталася будзённай рэальнасцю сённяшняга дня.

К

## Мастыхін-агляд: лістапад

# Арт-квартэт

**Агляд выстаў лістапада (і крыху снежня) ад мастацтвазнаўцы Ксеніі Сяліцкай-Ткачовай.**

На пачатку месяца ў галерэі "Універсітэт культуры" адбыліся адразу дзве імпрэзы. Экспазіцыю выставы "Прастора і святло" склалі нацюрморты, партрэты, пейзажы, выкананыя мастачкай Святланай Кастрыца ў тэхніках алейнага жывапісу і пастэлі на працягу дваццаці гадоў. Творчасць мастачкі характарызуецца стылістычнай разнастайнасцю (эксперыментальны жывапіс, рэалізм, імпрэсіянізм), працай у розных тэхніках, асаблівым стаўленнем да святла, якое ў больш позніх творах напаўняе прастору палатна.

Камернасцю кампазіцыі, колеравым багаццем, філасофскай трактоўкай сюжэта, псіхалагічнай глыбінёй прасякнуты раннія творы Святланы (серыя нацюрмортаў "Кераміка Жанны Грак", "Рабінавая гарката" "Акварыум. Скалярыі", "Жаночы партрэт са скульптурай", "На краі"). З цягам часу аўтарскае бачанне скіроўваецца ў напрамку рэалістычнай манеры выканання. Увага да натуры, пошук у ёй цэласнасці і гармоніі характэрныя для карцін "Партрэт мастачкі", "Прыэльбруссе", "Крымская сасна". Імпрэсіяністычнасць, тонкасць танальных пераходаў і святлоценяў актуальныя для пейзажаў 2015 — 2016 гадоў. Маляўнічасць, звонкасць палітры, шчырая ўлюбёнасць у колер, лёгкасць мазка — ключавыя асаблівасці сучаснага этапу творчасці Святланы Кастрыца.

Глыбіня тлумачэння прасторы надае палотнам мастачкі адзінства ўспрымання жыцця. Замкнёная, камерная прастора адкрывае гледачу ўнутранае багацце і духоўную змястоўнасць выявы, з'яўляючыся свайго роду лірычнай споведдзю аўтара. Вонкавае ж прадстаўляецца адзінствам і цэласнасцю сэнсу, гармоніяй формы і колеру.

Экспазіцыю выставы "Аўтограф" склалі жывапіс Настассі Калацкай, кераміка Вольгі Сямашка, а таксама работы навучэнцаў Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў. Сама назва праекта сведчыць пра сувязь пакаленняў, якая захоўваецца праз усю творчую дзейнасць мастакоў. Захаванне лепшых традыцый, спалучэнне высокага прафесійнага майстэрства з вынікамі творчага эксперыменту заўсёды былі каштоўнасцю установы.

Заканчэнне — **на старонцы 13.**

**Гродзенскі абласны драматычны тэатр паставіў за правіла раз на год ажыццяўляць пастаноўку з запрошаным рэжысёрам. Сёлета ім стаў Міхаіл Лашыцкі, які, у сваю чаргу, абраў п'есу "Клеменс" літоўскага пісьменніка і драматурга Казіса Саі ў перакладзе Алеся Разанава.**

Надзея БУНЦЭВІЧ,
Мінск — Гродна — Мінск

Тэатральная плошча

# Песні, статак і дастатак

Цікава, што ў якасці своеасаблівага "пасрэдніка", які дапамог "сасватаць" сталічнага госця, аказаўся тэатр "Ч", калі прывёз у Гродна сваю леташнюю прэм'еру — "Матухна Кураж і яе дзеці". У Гродне той спектакль прынялі вельмі добра, зацікавіліся рэжысёрам — і запрасілі да супрацоўніцтва. Атрымаўся вельмі "густанаселены" спектакль, дзе занята ледзь не ўся гродзенская трупа — так, як гэта было ў "Гарадку", што быў пастаўлены галоўным рэжысёрам Генадзем Мушпертам і ўвайшоў у склад намінантаў пазалеташняй III Нацыянальнай тэатральнай прэміі.

Зварот да літоўскай п'есы быў невыпадковым. Дзея ў ёй разгортваецца ў XIX стагоддзі ў прыдуманай вёсцы Дзевяцібедаўка. Але ж тая знаходзіцца на беразе Нёмана — значыць, можа мець самае непасрэднае дачыненне і да Гродзеншчыны. Што ж да рэжысёра, дык у сваёй чарговай працы ён працягвае ўласцівае яму разуменне тэатра як грамадзянскай пазіцыі. Бо героі аказваюцца перад выбарам: духоўныя каштоўнасці ці матэрыяльны дабрабыт. Вядома, ідэальна было б сумясціць, ды прывезены заморскімі купцамі бык-бугай Клеменс (а праз яго расце статак, дзе кожная карова дае па пяць вёдраў малака штодзень) не выносіць песень, танцаў, яркіх спадніц. І сяляне, што жылі ў галечы, ды з песнямі, становяцца заможнымі, але маўклівымі. Нават вяселле нагадвае пахаванне! Аднак калі вясковы музыка забівае бугая, натоўп патрабуе пакарання. Збіраецца суд, і… на катаргу высылаюць "без віны вінаватага" — таго, які выступіў у абарону хлопца.

Ужо гэты сціслы пераказ дазваляе зразумець, што кола ўзнятых у п'есе праблем значна шырэйшае за азначаныя вышэй дылемы духа і матэрыі, культуры і цывілізацыі, стварэнне высокіх мастацкіх каштоўнасцей — і побытавага спажывання. Пра тое, наколькі ўзнятая тэма хвалявала дзеі, калі вёску напаткае дарабыт, сцэнаграфія амаль не змяняецца, хіба строі становяцца крыху бялейшымі ды без латак: па колеры вопраткі ўсе вяскоўцы набліжаюцца да старасты Даўнараса (Ігар Уланаў). Ды ўсё ж кантраст між "было" і "стала" не надта выразны, амаль незаўважны — наўмысна? Зверху "капелюша" неаднаразова спускаецца "павук" — сімвал ці то заняпаду, калі трактаваць яго як тым выглядзе п'еса ставілася ў нас двойчы — у 1980-м і, пад назвай "Час быка", у 1996-м. Прычым абодва разы — Валерыем Маслюком, у Віцебску, у тэатры імя Якуба Коласа. У Літве, кажуць, таксама ідзе і дагэтуль. Параўнаць не магу, бо тых версій не бачыла. Заўважу хіба тое, што на віцебскіх афішах спектакль быў пазначаны як народная камедыя-прыпавесць. На гродзенскай — як трагікамедыя. Але неадназначным аказаўся не толькі жанр, але і сэнс новага спектакля.

Сцэна са спектакля "Клеменс". / Фота прадастаўлена тэатрам

Сцэнаграфія Надзеі Бяловай нагадвае перакулены набок саламяны капялюш (вялізны, на ўсю сцэну) — і адначасова сонца з разбежнымі ў бакі праменнямі. А расфарбоўка — быццам бабуліны "самаплеценыя" кілімкі-дываначкі, выраблены з пярэстых лапікаў. Чым не адчуванне свята? Вось толькі адзенне ў сялян — скрозь шэранькае, амаль аднатоннае, хаця і латка на латцы сядзіць. У другой казурку, ці то абярэгу, калі згадаць саламяныя павукі, якімі хату ўпрыгожваюць. А калі пачынае вярцецца, нагадвае млын — сімвал ці то жыцця, ці то няўмольнага часу. Потым на ягонае месца гэтак жа з каласнікоў выплыве карабель — плоская чорная вява, што асацыюецца з "картонным" тэатрам лялек ці дзіцячымі мульцікамі. Купцы ў чорных акулярах і праславутых кацялках (заслужаны артыст Беларусі Аляксандр Шэлкаплясаў у нечаканым для яго пераўвасабленні, Стэла Ракутуарысуа, Казіса Сая, сведчыць тое, што спачатку прыпавесць была выкладзена празаічна, у выглядзе аднайменнай аповесці. А праз тры гады, у 1974-м, ператварылася ў п'есу, вядомую таксама пад назвамі "Год быка", "Дзевяцібедаўцы". Аповесць неаднойчы публікавалася ў аўтарскіх зборніках, п'еса — у маскоўскім часопісе "Театр". На беларускую мову "Клеменс" быў тады ж перакладзены Алесем Разанавым, але выйшаў у друку тры гады таму: напаткаць тую кнігу ў крамах можна і цяпер. У гэтым выглядзе п'еса ставілася ў нас двойчы — у 1980-м і, пад назвай "Час быка", у 1996-м. Прычым абодва разы — Валерыем Маслюком, у Віцебску, у тэатры імя Якуба Коласа. У Літве, кажуць, таксама ідзе і дагэтуль. Параўнаць не магу, бо тых версій не бачыла. Заўважу хіба тое, што на віцебскіх афішах спектакль быў пазначаны як народная камедыя-прыпавесць. На гродзенскай — як трагікамедыя. Але неадназначным аказаўся не толькі жанр, але і сэнс новага спектакля.

Сцэнаграфія Надзеі Бяловай нагадвае перакулены набок саламяны капялюш (вялізны, на ўсю сцэну) — і адначасова сонца з разбежнымі ў бакі праменнямі. А расфарбоўка — быццам бабуліны "самаплеценыя" кілімкі-дываначкі, выраблены з пярэстых лапікаў. Чым не адчуванне свята? Вось толькі адзенне ў сялян — скрозь шэранькае, амаль аднатоннае, хаця і латка на латцы сядзіць. У другой

# Што ў запасе?

**У Рэспубліканскай мастацкай галерэі Беларускага саюза мастакоў адбылася III трыенале дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва "Factum est factum", у якім прынялі ўдзел больш за 150 аўтараў.**

Вольга РОПАТ

Кожная выстава дае магчымасць параўнаць тэхнікі, кірункі, сэнсавае напаўненне твораў, а таксама ўбачыць, як яны выглядаюць у іншай прасторы. Ці з'яўляюцца "канкурэнтаздольнымі"? Ці не "растваряюцца" ў натоўпе вобразаў?

Трыенале дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва падвяло вынік, аб'яднаўшы раней выстаўленыя творы (многія работы знаёмыя па выставах "Семечкі", "Восеньскі салон…", "Размовы ў зялёным"), тым самым паказаўшы, што побач са шклом, шамотам, дрэвам, лямцам у лік работ ДПМ могуць трапіць і фотаздымкі, і арт-аб'екты. Гэта сведчыць пра паступовае сціранне межаў паміж традыцыяй і эксперыментам. Таксама на выставе былі прадстаўлены пэўтычныя габелены, "цёплыя" вырабы керамікі, "утульныя", "хатнія" з бавоўны, а таксама сцэнічныя касцюмы ды батыкі з беларускімі матывамі.

Фрагмент экспазіцыі. / Фота Вольгі БАЛЬ

Каля іх добра прыжыліся творы "Звязаныя адной выставай" Людмілы Пятруль, "Татава шафа" Святланы Баранкоўскай, "Нараджэнне" са сталі і шкла Віктара Старухіна, "Вандроўнікі" Вольгі Рэднікінай.

Вольга Угрыновіч. "Складальнікі поспеху".

Іншым разам твор вылучаецца не столькі тэхнікай, колькі ідэяй. Таму часта задаюся пытаннем, а што ж больш "важкае": майстэрства або ідэя? Так, згадаю твор з выставы "Семечкі" Паўла Вайніцкага. Ён называўся "Чаканне" і ўяўляў з сябе шкляны сасуд, крыху напоўнены зернем. Аўтар "узмацніў" сэнс візуальнага вобраза санетам Максіма Багдановіча. На трыенале можна было сустрэць падобную работу пад назвай "Залаты запас": шкляны сасуд, цалкам напоўнены, калі не памыляюся, фасоляй. Метад розных аўтараў адзіны. Таму канцэптуальнае мастацтва, з аднаго боку, здаецца "бязмежным", з іншага — яго можна назваць мастацтвам інтэрпрэтацыі. Той жа сасуд можна прымяніць да тэм кахання, вайны ці расізму, дэфіцыту прыродных выкапняў…

Сучасныя працэсы, праблемы трэба ацэньваць, асэнсоўваць — укладваць не столькі свае ўражанні і эмоцыі, колькі думкі і меркаванні. Упэўнена, кожную думку можна ўвасобіць, ажыццявіць рознымі спосабамі, тым больш зараз няма абмежаванняў у выбары сродкаў выказвання. І гэты працэс патрабуе ад мастака эрудыцыі, умення аналізаваць, абагульняць, параўноўваць з'явы, а таксама па-майстэрску "перакладаць" асэнсаванае на мову індывідуальных вобразных сродкаў. Таму трыенале паказала, што мы маем як прыхільнікаў традыцый, так і наватараў. Не будзе дзіўным, калі праз тры гады на наступнай трыенале з'явіцца больш арт-аб'ектаў, шматфігурных кампазіцый, інсталяцый. А можа, знойдзецца твор з музычным суправаджэннем?.. Можа, загучыць шкло або пачуецца шэпт драўлянага арт-аб'екта?

К

Мастыхін

*(Заканчэнне*
*Пачатак на старонцы 1.)*

# Што адбіваецца ў "каралеўстве люстэрак"?

У сюжэтах — сумны сарказм і свавольнае дзяцінства, удумлівае "даследаванне" свайго асабістага "я" і імкненне філасофстваваць на пятачку банальных ісцін, "панарамнасць" бачання свету і эцюдна-натурны пленэрызм і гэтак далей. Спалучаюцца "чыстая" джаратыўнасць (у абстрактных рэчах) і шматслойная метафара, незвычайнае майстэрства і нечаканая выдумка, шчырасць і разлік, пазіцыя і дзёрзкая поза. І ўсё гэта — у перапляценні самых разнастайных творчых праграм, прынцыпаў, хадоў, метадалогій, вялікая частка з якіх у памятную эпоху сацрэалізму была нейкім "табу" для многіх мастакоў, асабліва для маладых, як і для гледачоў.

Скажу яшчэ вось што. Адсутнічае энергічнае фарміраванне прасторы, і таму шматгалосая экспазіцыя не ператварылася ў род актыўнага, накіраванага дзейства. Літаральна кожны крок тут кліча да асобага пункта адліку, сістэма ўспрымання адной работы ўжо не прыдатная для наступнай. Тэндэнцый так шмат, што іх пералік заняў бы аб'ём каталога. А дарэчы, ці будзе выдадзены каталог гэтай выстаўкі? Альбо яна, як многія іншыя, кане ў Лету? Хаця маё пытанне — на карысць бедных. Сам ведаю адказ: канешне ж, не. Для будучай гісторыі беларускага мастацтва — гэта таксама страта…

Але што асабліва радуе, дык гэта шматлікасць прадстаўленай моладзі. Ёсць і славутыя "магікане" — з племені шасцідзясятнікаў-сямідзясятнікаў, хаця іх, на жаль, застаецца ўсё менш… Добра прадстаўлены і мастакі ўсіх нашых абласцей. Скажу шчыра: цікавага тут нямала, калі паглядзець на творы як на нешта самастойнае, па-за кантэкстам стракатай экспазіцыі. Хаця ад некаторых рэчаў — чаго грахі таіць — вее сумам, эклектычнай мешанінай. Урэшце, тое характэрна для ўсіх вялікіх выстаў апошніх двух дзесяцігоддзяў, дзе самыя сур'ёзныя тэмы ўспрымаліся як кан'юнктурныя адпіскі, лірычнае самавыяўленне — як празмерная манернасць і эгацэнтрызм, а фармальны эксперымент абарочваўся пластычнай усяраднасцю. Любая выстава — гэта ў мініяцюры тое самае люстэрка складаных і часам вельмі супярэчлівых працэсаў, усяго таго, што адбываецца ў нацыянальнай культуры краіны. А развіццё культуры, як вядома, залежыць ад "настрою" таго соцыума, у якім жыве мастак… І гэта незалежна ад таго, нонканфарміст ён альбо суцешаны ўладай канфарміст, "унутраны эмігрант", які стварае свой "вобраз свету" ў мала даступнай для чужога вока паўсутарэннай майстэрні ці на кухні, альбо адукаваны рамеснік, які сілкуецца і натхняецца рэпрадукцыямі твораў вялікага старога мастацтва.

Час адкладвае свой адбітак на карціну, эстамп, малюнак, скульптуру, незалежна ад таго, выбірае аўтар антычны, біблейскі, фальклорны сюжэт ці вобраз, навеяны літаратурнай класікай і гісторыяй краіны. Як гэта робяць, скажам, Сяргей Рымашэўскі ("Хрыстос на месяцы"), Уладзімір Саўчанка ("Выкраданне Еўропы"), Аляксандр Барташэвіч ("La morte dell impero"), Рыгор Іваноў ("Новы Ікар"), Андрэй Басалыга ("Анаграма "Тэсей і Мінатаўр"), Сяргей Аганаў ("Гедэмін" і "Траянскі конь"), Сяргей Гумілеўскі ("Ікар"), Алесь Шаціла ("1812 год. Беларусь"), Юрый Хілько ("Страцім Лебедзь", зразумела, па Максіму Багдановічу), Аляксей Сарокін ("Нараджэнне Дажджбога"), Віктар Барабанцаў ("Калядны цягнік") і гэтак далей. Ёсць і спробы нейкім чынам асэнсаваць сацыяльныя праблемы сучаснага жыцця: Георгій Паплаўскі ("Жнівень 2014"), Павел Вайніцкі ("Подых сучаснага чалавека"), Аляксандр Гвоздзікаў ("Бедны Ёрык"), Алесь Мара ("Ціхая ўкраінская ноч…"). Вельмі ўдалыя карціны Мікалая Бушчыка — цыкл "Размова аб рэчаіснасці". Гэты таленавіты жывапісец — у сваім ключы: тут — голас самазаглыблення, самапазнання, а значыцца, голас пранізлівай і светлай цішыні, надзеі, мары і дабрыні, якой нам сёння так не стае…

Мікалай Бушчык. "Размова аб рэчаіснасці". Частка трыпціха.

Уладзімір Кожух. "Спякотны жнівень".

Аляксандр Гвоздзікаў. "Бедны Ёрык".

Уладзімір Саўчанка. "Вербная нядзеля. Трансцэндэнцыя".

## Абліччы — у часе, час — у абліччах

Вось, збіўся на пералік імёнаў і твораў… Ну, добра, будзем лічыць, што для гледача гэта будзе нейкай "шпаргалкай", каб ён мог больш пільна ўглядзецца ў гэтыя ды іншыя работы, зрабіць свае высновы. Зразумела, на нашых вачах жыццё, якое змяніла рэчышча, панесла за сабою новае смецце, пену і шалупінне. І так бывае: тыя мастакі, хто быў нядаўна ў мэйнстрыме, аказаліся на мялі. Такіх шмат. Хаця, шчыра кажучы, і на мялі бачная чалавечая прырода — вечны прадмет мастацтва. Іншая справа, як увайсці ў самае нутро гэтай чалавечай прыроды? Як вызначыць сродкамі жывапісу ці скульптуры мяжу паміж дабром і злом, любоўю і нянавісцю, гераізмам і здрадніцтвам, характвом і пачварнасцю? Усе гэтыя маральныя катэгорыі так ці інакш хвалююць удзельнікаў выставы, і вось гэта радуе. Незалежна ад таго, атрымаўся твор ці пакуль не вельмі.

Што застанецца ў памяці пасля выставы — хутка пабачым. Аднак хачу ўсё ж сказаць, што беларускае мастацтва існуе не зважаючы ні на што: ні на складаныя праблемы з закупкамі, ні на сур'ёзныя матэрыяльныя затраты на пэндзлі, палотны, фарбы, разцы, штыхелі, ні на дарагую аплату за творчыя майстэрні… І няхуць, і няхуць мастакі на выставы свае выпакутаваныя ў сумненнях і пошуках работы, хай яны часам і не атрымліваюцца, і не зусім упісваюцца ў нейкі загадзя запланаваны фармат экспазіцыі. І будуць несці, пакуль існуе прафесія Мастака. Зараз час іншы: даўно зніклі так званыя ідэйна-тэматычныя планы, па якіх творцу прапанавалася "вымяраць" свае мастакоўскія думкі. Цяпер — поўная свабода: малюй, ляпі, стварай што душа патрабуе. І сённяшняя выстава паказвае, што гэта менавіта так.

Асабіста я хачу адзначыць карціну-трыпціх Уладзіміра Тоўсціка "Вербная нядзеля. Трансцэндэнцыя". Мне ўжо даводзілася трошкі пісаць пра яе, бо яна не так даўно экспанавалася на групавой выставе ў Нацыянальным мастацкім музеі. Дык вось, менавіта свабода духу, свабода пэндзля, свабода асобы — галоўная якасць маральнага ідэала гэтага аўтара. Сапраўды, карціна складаная па сваім гістарычным і філасофскім сэнсах і ў той жа час вельмі цікавая па вобразна-пластычных і кампазіцыйных знаходках. Тэрмін "трансцэндэнцыя" (ад лацінскага "transcendens") — тое, што выходзіць за межы зямнога, эмпірычнага свету. Трансцэндэнтальнасць у сэнсе культурных каштоўнасцяў (рэлігійных, эстэтычных, этычных, філасофскіх) — гэта, на думку Тоўсціка, сутнасць у духоўным разуменні боскага прызначэння чалавека, прыгажосці, існасці, шчырай веры і сапраўднасці. Іншымі словамі, гэта паняцце ёсць таямніцай таго, што трымае беларускі народ, так бы мовіць, маральнае здароўе нацыі. Нягледзячы на вялікія гістарычныя нягоды і перыпетыі лёсу, гэты духоўны стрыжань ніколі не быў зламаны. На тым і стаіць сённяшняя незалежная Беларусь.

Наогул кажучы, у мяне заўсёды прыцягвалі ўвагу падобныя творы, дзе відавочнае імкненне аўтараў гаварыць сваім голасам, хай ён нават будзе нягучным, але — прафесійна "пастаўленым" і выпакутаваным жыццём і вопытам. Так нараджаецца праверка сваёй здольнасці да размовы з гледачом "ад першай асобы". І тут не мае значэння, да якога "-ізму" належыць мастак: да рэалізму, андэграўнду ці поставангарду. Вось чаму мяне аднолькава прыцягваюць творы такіх непадобных адзін да аднаго мастакоў, як Уладзімір Кожух і Алесь Суша, Васіль Касцючэнка і Таццяна Патворава, Леанід Хобатаў і Іван Сямілетаў, Ілона Касабука і Аляксандр Шапо, Ганна Сілівончык і Раіса Сіплевіч, Уладзімір Канцадайлаў і Алесь Квяткоўскі, Міхаіл Ляўковіч і Вольга Крупянкова — такія вось розныя, розныя, розныя аблічча…

■■■

Такім чынам, сённяшняя выстава — гэта нейкі сімвал плюралізму. Толькі плюралізм — не ўзброенае замірэнне перад вырашальнай бітвай — хто каго, — не магчымасць без перашкод крычаць на ўсё горла адно на аднаго. Ён умова вырашэння агульных задач, якія стаяць на новым вітку XXI стагоддзя. Што, зноў — заклік да ўніверсальнасці? Не. Якраз аб гэтым і думаеш на выставе "БІ-5". Пры ўсёй яе неаднароднасці (а як жа інакш?) тут можна — было б жаданне — разгледзець не толькі калектыўны аўтапартрэт сённяшняга стану БСМ, але і досыць аб'ёмную характарыстыку нашага складанага, не без супярэчнасцей, часу.

Дык як усё ж ацэньваць выставу? Мяркую, як мінімум без крайнасцей. Як і многія іншыя з'явы нашай сённяшняй культуры, экспазіцыя ўводзіць нас у разгалінаваны працэс творчага пошуку, якім заклапочаны цяпер асноўныя сілы беларускага мастацтва. Пакуль ён не прынёс выдатных вынікаў у выглядзе твораў, што, бясспрэчна, маюць вечнае мастацкае значэнне. Разам з тым, сам пошук, канешне, набыў за апошнія гады больш дынамізму, унутраную, нават чыста псіхалагічную, свабоду эксперыменту, гэта значыць атрымаў, нарэшце, права быць самім сабой. Мабыць, патрэбен нейкі перыяд адаптацыі творцы да новай для нашага мастацтва сітуацыі, перыяд вяртання страчанага, перыяд практычнага асваення разнастайнасці магчымых шляхоў творчасці. Але пытанняў па-ранейшаму шмат, і канца ім не бачна. Напрыклад, што такое мастакоўская самабытнасць і рэгіяналізм мастацтва? Як захаваць індывідуальнасць з паралельным асваеннем вопыту набытай папярэднімі культурыі? Што ёсць ідэал у сучасным разуменні для любога мастака? Гэтае пытанне гучыць анахранізмам? Не ўгэўнены. Ведаю толькі, што праблема мастацкага ідэалу — адна са складаных і далёка не самых распрацаваных у нашай эстэтыцы і тэорыі мастацтва. Цяпер, на сённяшнім этапе развіцця выяўленчай культуры, якая засвойвае новыя духоўныя каштоўнасці ды новыя формы спасціжэння і адлюстравання сучаснага свету, гэтае пытанне набывае асаблівую значнасць і актуальнасць.

Канешне, мы жывём у недасканалым свеце. Яшчэ не прыспеў той час, калі будуць квітнець адны толькі ружы. Патрэбныя ідэі, патрабуецца ўзнікненне сітуацыі голаду на ідэі, бо гаворка ідзе пра новыя каштоўнасці новага стагоддзя, якія нараджаюцца пад пэндзлем менавіта тых, хто сёння вынес на суд гледача свае творы. А што яшчэ патрэбна? Не гуляць у дробязі, не размяньвацца на гэтыя дробязі, не быць самазадаволеным, калі штосьці атрымліваецца, пазбягаць банальнасцей, бо банальнае — смерць мастацтва. Высока ўзніміаю планку? Бяру на сябе ролю ментара? Магчыма. Але гэта ўжо хай рассудзяць чытачы і гледачы…

К

Журналісцкі аўтатур газеты "Культура"

Палац культуры ў колішнім ваенным гарадку.

# "Культура" — газета для прафесіяналаў-5

## Быхаўшчына: павук, які не тчэ павуціны, але прэтэндуе на статус

**Ад культуры Быхаўскага раёна вяртаемся да горада, а больш дакладна, да тых установаў культуры Быхава, дзе захоўваюцца, культывуюцца і набываюць новыя формы беларускія народныя рамёствы. Такіх установаў у раённым цэнтры мы налічылі дзве. Гэта Цэнтр культуры, творчасці і рамёстваў, а таксама Дзіцячая школа рамёстваў і мастацтваў. Абедзве знаходзяцца ў адным будынку, змагаюцца за вучняў і шукаюць новыя ідэі для свайго развіцця. У свой час "К" звяртала ўвагу на дзейнасць гэтых установаў — у кантэксце падрыхтоўкі да колішняга Дня беларускага пісьменства. Але адно — жыць надыходзячым святам (а разам з гэтым атрымліваць лепшую фінансавую падтрымку), і зусім іншае — жыць у паўсядзённых клопатах. Але ці такія паўсядзённыя тыя клопаты?**

Яўген РАГІН, Кастусь АНТАНОВІЧ, Мінск — Бялыніцкі раён — Быхаўскі раён Магілёўскай вобласці — Мінск / Фота аўтараў

Дзеці на занятках у школе рамёстваў.

Ірына Кухціна з сукенкай, распісанай школьнікамі.

### Чатыры ў адным

Шукаючы будынак цэнтра ў былым ваенным гарадку, спачатку завіталі ў прыцягальны сваёй вонкавай аздобай аздараўленча-спартыўны комплекс і ўбачылі вялікае мноства малечы, якая прыйшла на плаванне ў басейн. Падумалася, ці будзе такі ж ажыятаж ва ўстановах культуры? У Цэнтры культуры, творчасці і рамёстваў заўважылі не ажыятаж ахвотных далучыцца да культуры, а хутчэй мітусню супрацоўнікаў. Прычына, як высветлілася, даравальная: не паспелі работнікі цэнтра вярнуцца з санітарнага дня (уласцівага практычна ўсім установам культуры раёна), як ім трэба рыхтавацца да чарговага свята.

Як нам патлумачылі, установа працуе ў фармаце чатыры ў адным. Скажам шчыра, такое сустрэнеш не часта. Тут займаюцца і канцэртнай дзейнасцю, ладзяць дыскатэкі, словам, выконваюць функцыі гарадскога дома культуры. Апроч таго, наладжана праца з майстрамі па раёне. Усяго іх на сёння налічваецца 71. І кожны месяц адбываюцца сустрэчы, дзе абмяркоўваюцца нюансы працы, вызначаюцца яе прыярытэты. Да таго ж Цэнтр культуры займаецца трансляцыяй народнай творчасці з дзецьмі, аб'ядноўваючы іх у гурткі: у фальклорным "Падворку" — 17 падлеткаў, прыкладна столькі ж займаюцца ў двух іншых — па пляценні паясоў і вырабе абярэгавых лялек. Некаторыя дзеці паспяваюць займацца і ў школе рамёстваў і ў цэнтры культуры. Скажам, у школе вырабляюць саламяных павукоў, а ў цэнтры робяць з тымі павукамі абрадавыя дзеі.

Усяго ў штаце ўстановы, апроч дырэктара Наталлі Хамаўненка, мастацкі кіраўнік Алена Байкова, два майстры-метадысты Ірына Фадзеева ды Алена Новікава, а таксама метадыст па фальклоры і народнай творчасці. Праўда, на сёння пасада вакантная. Дзейнічае пры ЦКНТ і ансамбль народнай песні "Дняпроўскія зоры" са статусам народнага. Але асаблівы гонар цэнтра — ткацтва паясоў. Да жалю, не атрымалася пазнаёміцца з Аленай Новікавай, якая вядзе тут рэй: наш візіт якраз супаў з яе сесіяй. Да слова, юная майстрыха ўдзельнічала ў стварэнні 48-метровага купальскага пояса для фэсту ў Александрыі. А вось арнамент для пояса Быхаўскага раёна, як нам распавялі, доўга, а калі быць дакладным, да мінулага года не ўдавалася ідэнтыфікаваць. Пакуль не дапамагла навуковая супрацоўніца Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Марыя Віннікава. Узор яна здолела прадыктаваць па тэлефоне. Арыгінал жа з вёскі Грудзінаўка 1949 года захоўваецца ў Акадэміі навук. Як мы пабачылі, гэта мужчынскі пояс-падвязка. Цяпер у цэнтры ўжо маюцца і ягоныя інтэрпрэтацыі.

Быхаўскі тканы пояс.

Яшчэ адзін кірунак установы — лапікавае шыццё. Чаму звярнуліся да яго? Адказ просты: танны матэрыял, а таксама добрая магчымасць зацікавіць дзятву. У гэтай тэхніцы цягам апошніх двух гадоў вырабляюцца абярэгавыя лялькі. Прызнаемся, бачылі падобныя і на Рагачоўшчыне, і на Любаншчыне, і на Лёзненшчыне. Такое адчуванне, што гэта стала сапраўдным беларускім брэндам. Праўда, у Быхаве першапачаткова звярнуліся да агульнаславянскіх вобразаў, але цяпер надаюць належнае і ўласна беларускім узорам. Атрымліваецца цікава.

Колькі гадоў таму ў быхаўскім Цэнтры культуры развівалася і лозапляценне. Але не доўга — майстрыха сышла ў дэкрэтны адпачынак…

А ўвогуле, цікавая рэч: Цэнтр культуры, народнай творчасці і рамёстваў месціцца на першым паверсе былога афіцэрскага Палаца культуры. На трэцім паверсе працуе мастацкая школа рамёстваў. Паміж імі, на другім паверсе, як нейтральная паласа,— бібліятэка. Мы задумаліся, ці ёсць канкурэнцыя паміж першым і трэцім паверхамі. Натуральна, ёсць! Якая творчасць без канкурэнцыі? Так што паміж школай і цэнтрам саламяны павук "прабег". Дай Бог, каб у выніку гэтага суперніцтва таленты нараджаліся.

### (Не)лірычнае адступленне Яўгена Рагіна

*Нараджаюцца! Я ў гэтым яшчэ ў 2013 годзе пераканаўся, калі ўпершыню і з Цэнтрам пазнаёміўся, і са школай. Але сёння гаворка крыху пра іншае. Вельмі ўразіўся, што творчыя ўстановы былога афіцэрскага гарадка апякуюць святары мясцовай царквы. Гутаркі з дзецьмі скіраваныя на тое, каб кожны зразумеў, што таленавітасць у дзіцячай прыродзе — якасць абавязковая. Проста яе пастаянна развіваць трэба. Я, да прыкладу, мясцовым мальцам пазайздросціў. Дай мне такі палац культуры ў свой час, я на ўсіх трох паверхах па чарзе "завісаў" бы…*

*Тры гады таму зрабіў у школе рамёстваў партрэт выкладчыц Юліі Жалабкевіч, Анжэлы Быстровай, Вольгі Чыжанок. Фота было апублікавана напярэдадні Дня беларускага пісьменства на першай паласе "К". Дзяўчаты тады рабілі сувеніры да свята. У гэты прыезд сустрэў Анжэлу Быстрову, якая робіць цудоўныя рэчы са скуры. Яна і паведаміла, што ў кожнай з іх нарадзілася дзіця. Праўда, Оля з'ехала ў іншы раён, а саломкапляцельшчыца Юля засталася. Словам, вірлівае жыццё ў школе працягваецца. Пра гэта чытайце трошкі ніжэй.*

### Зацікавіць і тутэйшага, і турыста

Даведаліся ў Цэнтры культуры, творчасці і рамёстваў, што ў вобласці даўно (і ці вынікова?) стаіць пытанне пра абавязковую наяўнасць пры ўсіх раённых цэнтрах рамёстваў сваёй сувенірнай крамы-салона. У Быхаве тая павінна з'явіцца яшчэ да новага года. Зараз вырашаюцца юрыдычныя пытанні. Ужо і месца вызначана — на ўваходзе ў будынак.

Пытанне ў іншым. Аказваецца, толькі каля чвэрці майстроў раёна гатовыя да супрацоўніцтва з сувенірнай крамай. Многія папросту не вераць у свае сілы. Але ў той жа час і кіраўніцтва цэнтра свой адбор вядзе на "правільнасць узораў". Думаецца, з адкрыццём крамы большасць пытанняў з запаўненнем і адборам паступова вырашыцца. Тым больш пры ўстанове дзейнічаюць два аматарскія клубы з мясцовымі майстрамі. На гэтых людзей і разлік пры стварэнні і напаўненні сувенірнай крамы. Вялікія спадзяванні кіраўніцтва цэнтра ўскладае на прафесійнага ганчара, што будзе працаваць на даму са сваёй муфельнай печкай.

### (Не)лірычнае адступленне Кастуся Антановіча

*Падчас размовы з супрацоўніцамі быхаўскага цэнтра культуры звярнуў увагу на словы, што, маўляў, у раёне мясцовыя паясы не запатрабаваныя, затое карыстаюцца попытам на абласных і рэспубліканскіх святах. Вядома, пытанне не толькі ў тым, што там турыстаў нашмат больш. Пытанне ў звычцы і ў самапавазе. Калі мясцовы пояс не выкарыстоўваўся больш за паўстагоддзе, дык казаць пра моду на яго будзе вельмі саманадзейна. У той жа час пасля інфармацыі пра ўзнаўленне аўтэнтычнага пояса, а неўзабаве і ўсяго строю, кожны быхаўчанін, які сябе паважае, думаю, яго набудзе…*

### Славутыя насякомыя

Памятаеце, у пачатку артыкула мы пісалі пра дзятву, што ў літаральным сэнсе акупавала цэнтр? Дык вось, у Дзіцячай школе рамёстваў і мастацтваў малечы не менш, а мо і болей. Куды ні глянеш — паўсюль або дзеці, якія працуюць з настаўнікамі, або ўнікальныя экспанаты і ўзоры іх мастацкіх работ. Усё заціснута, не разгарнуцца. З апошняга заўважаем цікавую калекцыю радыёпрыёмнікаў. Але гэтым разам не пра іх.

Нагадаем, што школа была створана ў 2008-м — Годзе рамяства ў Магілёўскай вобласці. Першапачаткова тут займаліся маляваннем, жывапісам, вывучэннем кампазіцыі. Рамёствы прыйшлі трохі пазней. Сёння ў школе дзеці (94 чалавекі) займаюцца ў некалькіх класах, працуючы са шклом, скурай і самым даступным матэрыялам — саломай. А з шасці педагогаў, чатыры — у Саюзе майстроў народнай творчасці.

Прыходзяць сюды дзеці з шасці гадоў, а ў адзінаццаць ім даводзіцца даваць дыплом аб заканчэнні школы. Відавочна, што да часу паступлення ў ВНУ і ССНУ губляюцца атрыманыя навыкі і веды. Таму цяпер вучні могуць вучыцца як па пяцігадовай, так і па сямігадовай праграме навучання.

Дырэктар школы Ірына Кухціна падзялілася апошнім дасягненнем. За час існавання ўстановы была адроджана традыцыя вырабу саламяных павукоў. "Ісціна" нараджалася ў экспедыцыях, падчас уласных творчых (ці навуковых?) эксперыментаў. Цяпер цалкам падрыхтавана дасье для таго, каб павук атрымаў статус элемента нематэрыяльнай культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь. На нашых вачах майстры стварылі адмысловага Купальскага абрадавага павука. Здавалася б, гэтымі дасягненнямі трэба не толькі ганарыцца, але і хваліцца. І далёка за межамі краіны. Аднак пакуль за мяжой былі толькі ў Расіі — прадстаўлялі свае вырабы ў Яраслаўлі і Тамбове. А чаму не паказаць тых жа павукоў на польскім Падляшшы, дзе існуюць падобныя традыцыі? Тое ж тычыцца і супрацоўніцтва з іншымі школамі рамёстваў у Беларусі. Гэта дазволіць вырашыць агульныя метадычныя і практычныя пытанні. Пакуль жа сумоўе наладжана толькі з горацкай школай. Спадзяёмся, славутыя любанская і іванаўская не будуць супраць?

### Агульнае (не)лірычнае заканчэнне

*У кожнай са згаданых школ рамёстваў і мастацтваў — пакручасты лёс. Стварэнне ўнікальнай навучальнай праграмы, узгадненне яе ў шматлікіх інстанцыях — экзамен не з лёгкіх, ды і каштуе ён немалых нерваў. Ірына Кухціна гэта пацвярджае. Досвед раёнаў у гэтым плане неабходна абагульняць і распаўсюджваць. Тут, мы перакананы, палягае будучыня этнавыхавання…*

К

# Тэрыторыя і меморыя

**Ніколі не сутыкалася з тым, каб турыст у новым для яго горадзе фатаграфаваў мемарыяльныя дошкі. А між тым яны з'яўляюцца часткай культурнага ландшафту сталіцы, своеасаблівымі знакамі памяці на масіўных "постацях" будынкаў. Карэспандэнт "К" прайшоў са скульптарам, фатографам Яўгенам КОЛЧАВЫМ па сталічным маршруце ад Чырвонага касцёла праз вуліцу Карла Маркса да вуліцы Леніна, дзе творца распавёў пра свае работы ў гэтай далікатнай галіне.**

Вольга РОПАТ



Яўген Колчаў.

Рэльеф у Чырвоным касцёле.

## Дэталі стварэння памятных аб'ектаў

### Тэхнічныя моманты

— Замовы размяркоўваюцца сярод аўтараў секцыяй скульптуры Беларускага саюза мастакоў. Скульптар разам з архітэктарам распрацоўвае агульную канцэпцыю будучай дошкі, вызначаецца з яе месцазнаходжаннем на будынку. Потым вядзецца работа над вобразам, стылістыкай шрыфту, кампазіцыяй, прапорцыямі. З архітэктарам працаваць не цяжка. Як правіла, яго прызначаюць. Бывае, скульптар сам выбірае, з кім будзе працаваць. У абавязкі архітэктара ўваходзіць зацвярджэнне праекта ў архітэктурным аддзеле выканкама.

Дарэчы, акрамя выявы шанаванай асобы вялікае значэнне мае і тэкставая частка дошкі. Галоўнае — правільна вызначыць стылістыку шрыфту. Мемарыяльная дошка павінна быць лаканічнай, без лішніх элементаў, якія ўскладняюць успрыманне твора. Чым адрозніваецца работа над скульптурай, рэльефам і мемарыяльнай дошкай? Сацыяльным гучаннем. Мемарыяльныя дошкі патрабуюць абагульнення, іх памер звычайна складае ад 1 да 1,5 метраў квадратных.

Калі скульптар, напрыклад, не спраўляецца з задачай, што бывае рэдка, то прыцягваецца яму на дапамогу калега або замова перадаецца іншаму майстру. Вартае ўвагі і меркаванне сваякоў героя мемарыяльнага твора. З імі ў майстэрні скульптара ўзгадняецца падабенства асобы і выявы на аб'екце. Калі прэтэнзій з іх боку да аўтара няма, то ацэньваецца мастацкі складнік работы.

А стылістыку дыктуе эпоха, час. Зразумела, памятныя дошкі эпохі Адраджэння адрозніваюцца ад дошак, зробленых у XX або XXI стагоддзі. Таксама маюць уплыў на будучы твор персанаж, магчымасці, здольнасці аўтара, ягоная прыналежнасць да якіх-небудзь стылістык. Што да мяне, дык я прытрымліваюся рэалістычнага напрамку.

### Практычнасць

Рэльеф у Чырвоным касцёле — прыватная замова. Пробашч касцёла айцец Уладзіслаў, з якім я даўно знаёмы (іншы раз прыходжу на імшу), прапанаваў мне зрабіць крапільніцу — важны элемент пры ўваходзе ў касцёл. Работа над рэльефам, на якім два анёлы падтрымліваюць чашу са святой вадой, працягвалася каля паўгода. Матэрыял для рэльефу абраны невыпадкова. Гэта не гіпс, а сучасная пластыка. Пры ўзаемадзеянні з вадой гіпс руйнуецца.

Наогул, у нашых кліматычных умовах ужываецца сілумін, бронза, можна ўбачыць і работы з граніту. Мармур не выкарыстоўваецца — ён убірае пыл, і з часам выглядае не эстэтычна, а вось у цёплых краінах, дзе менш ападкаў, — можна ўбачыць скульптуры з мармуру даволі часта. Усё больш выкарыстоўваюць металапласт, іншыя пластыкі, якія вытрымліваюць тэмпературныя перапады. Творы, зробленыя з іх, больш танныя і практычныя, выглядаюць добра. Урэшце, калі твор зроблены прафесіяналам — ад металу не адрозніш.

### Лаканічнасць

Барыс Пянчук, вядома, быў ваенным музыкантам, дырыжорам, таму атрыбуты, дэталі прафесійнай сферы падказваюць ідэі, падкрэсліваюць асобу. Так і нарадзіліся лаканічныя вобразы, асацыяцыі, якія затым увайшлі ў кампазіцыю твора. Чаму партрэт Барыса Пенчука ў коле? Гэты элемент звязаны з вобразамі медалю, ударных музычных інструментаў — літаўраў і тарэлак. А вертыкальная частка — стылізаваная тэатральная заслона.

Работу над мемарыяльнай дошкай можна назваць творчым працэсам, нягледзячы нават на тое, што яна зроблена на замову. Заўсёды максімальна вывучаеш тэму, шукаеш факты, візуальныя матэрыялы (каб знайсці найбольш яркія ракурсы творцы). Калі замоўлена партрэтная дошка, дык патрэбны якасны фотаматэрыял альбо малюнак. Калі тэкставая — трэба ўлічваць гістарычны перыяд. Над дошкай, прысвечанай Барысу Пенчуку, працаваў тры — чатыры месяцы. Зараз у скульптараў тэрміны вельмі сціслыя, таму даводзіцца дзейнічаць хутка і напружана.

Як правіла, дошкі вешаюцца на ўзроўні двух — трох метраў, каб яны былі бачныя з аўтобусаў, аўтамабіляў. Галоўнае — пазбегнуць дысанансу. Дошкі размешчаны высока, таму, каб "захапіць" частку будынка, дошку і чалавека — трэба адысці або мець спецыяльны аб'ектыў. Тое, што іх рэдка фатаграфуюць, звязана менавіта з тэхнічнымі момантамі, а не з тым, быццам бы яны не прадстаўляюць мастацкай вартасці. Існуе багата цікавых мемарыяльных аб'ектаў. Так, у Амстэрдаме бачыў прафесійна зробленую дошку на месцы гібелі Чэта Бэйкера — знакамітага джазавага музыканта. Яе фатаграфуюць, і з ёй фатаграфуюцца.

### Паэтычнасць

Гісторыя з дошкай Барыса Аракчэева даволі цікавая. Я вучыўся з дочкамі мастака Аленай і Аксанай, якія пасля ягонай смерці даверылі мне зрабіць меморыю. Але паставілі канкрэтныя ўмовы: кампазіцыя павінна быць зроблена па пэўным аўтапартрэце Барыса Аракчэева, які мастак напісаў у сваёй майстэрні. З аднаго боку, нескладана, бо ўжо знойдзена кампазіцыя, з іншага, цяжка перадаць у скульптуры жывапісны партрэт, захаваўшы стылістыку палатна, вобраз, настрой. Нягледзячы на некаторыя цяжкасці, з пастаўленай задачай справіўся.

Робяць дошкі па заканчэнні чатырох гадоў пасля смерці асобы. Існуюць параметры, па якіх савет вылучае асобу. Загадзя работу таму ці іншаму творцу, напрыклад, замовіць нельга. Ён можа заказаць свой партрэт для сябе, сям'і, які пасля можна выкарыстаць і для памятнага знака. Што да замежнага вопыту працы з мемарыяльнымі дошкамі, дык асаблівай розніцы няма. Магчыма, яна ёсць у атрыманні ды размеркаванні замоў.

Якім дзеячам мастацтва, на маю думку, можна стварыць скульптуру? Канешне, хацелася б убачыць дошку альбо помнік Васілю Быкаву. У нашай краіне багата дзеячаў культуры, пісьменнікаў, якія вартыя таго, каб іх памяць увекавечылі. К

Дошка, прысвечаная Барысу Пенчуку.

Меморыя, зробленая па аўтапартрэце Барыса Аракчэева.

З "Куфра-радцы"

# "Капусная талака"

**(сцэнарый пастаноўкі паводле традыцыйных звычаяў Кармянскага раёна Гомельскай вобласці)**

**Дадзены сцэнарый і яго варыянты выкарыстоўваюцца ў рабоце клубных устаноў Кармянскага раёна. Самы свежы паказ пастаноўкі здзейсніў народны фальклорны калектыў "Луца" Акцябрскага цэнтра фальклору Кармянскага раённага цэнтра вольнага часу падчас адкрыцця выставы "Беларуская хата на святы багата" ў выставачнай зале ўстановы "Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці" 6 снежня 2016 года.**

*(Дзеянне адбываецца ў сялянскай хаце. Гаспадар сядзіць каля вакна, ладзіць рэшата, гаспадыня прасуе ручнік, дачка чытае кніжку.)*

**Гаспадар:** Настала добрае надвор'е. То ж не быў бы мой дзень — Сямёнаў. З такой нагоды, можа, мне чарачку паднясеш?

**Гаспадыня:** Ага, пра тое, што гэта Сямёнаў дзень, дык ты згадаў, а пра тое, што з гэтага дня пачынаецца бабіна лета, дык ты маўчыш. А чарку?! Яе яшчэ зарабіць трэба!

**Гаспадар:** Во! Мяне ж суседка Ганна запрасіла перааграць гарод. Чаму не дапамагчы?

**Гаспадыня:** Ну, няхай і так. У Сямёнаў дзень да абеду арэш, а пасля абеду пахара з поля гоніш. Гэта я да таго, што пасля абеду запрасіла суседак на талаку пашынкаваць капусту. Будзеш ісці, зайдзі да Марусі, запрасі да нас і Ганне таксама прыгадай. Бо можа забавіцца і забыцца.

**Гаспадар:** Добра, добра. Толькі не забыцца б пра тваю талаку.

**Дачка:** Мамка, якая талака?

**Гаспадыня:** Капусная, дачушка. З качарыжкамі. Правільна ў народзе кажуць, што хату весці — не галавой трэсці. Лета — прыпасіха, а зіма — прыбярыха!

**Дачка:** Маці, а ці праўду кажуць, што капусту павінна садзіць толькі жанчына?

**Гаспадыня:** Праўда, дачушка. Садзіць яе трэба толькі жанчыне і ў жаночыя дні: сераду, пятніцу і суботу. Ну а, барані бог, да расады дакранецца мужчына, толку не будзе. Капуста пойдзе ў ствол і зацвіце. А калі пасадзілі капусту, то ў канцы грады ставілі гаршчок уверх дном. На яго клалі камень, а на камень белую хустку і прыгаворвалі: "Хай будзе галаваста, як гаршчок, тугая, як камень, і белая, як хустачка".

**Дачка:** А яшчэ я ведаю, што капуста таксама дапамагае пры хваробе. Калі ў чалавека жар, яго абкладваюць лісцем і жар знікне.

*(Заходзіць гаспадар.)*

**Гаспадар**: Ну і надвор'е, павуцінне кругом лятае. Вачэй не раскрыць.

**Гаспадыня:** А чаму гэта ты вярнуўся, можа, што забыў?

**Гаспадар:** Ганна казала, што пераворваць будзем у другі дзень. А сёння добры дзень капусту крышыць.

**Гаспадыня:** Дык што, і да нас не прыйдзе?

**Гаспадар:** Ды прыйдзе! Усе прыйдуць!

**Гаспадыня:** Ну, дык чаго ты сеў? Ідзі прынясі мех з капустай. Трэба ж усё прыгатаваць. А ты, дачушка, моркву абчысці. Ой, ды там нейкі гоман. Мабыць, ідуць.

*(Заходзяць жанчыны.)*

**Жанчына 1:** Добры дзень добрым людзям!

**Гаспадыня:** Добры дзень!

**Жанчына 2:** Ці чакалі вы нас?

**Гаспадыня:** Чакалі, жанчынкі. Праходзьце, калі ласка. Вось толькі Гапусі чамусьці няма, можа, забылася?

*(У гэты момант чуецца грук у дзверы. Забягае Гапуся.)*

**Гапуся:** Дзверы адчынілі, а сустрэць і дапамагчы забыліся.

**Гаспадыня:** Трымайся, суседачка, трымайся. Сямён, я колькі разоў прасіла адрамантаваць парог?

**Жанчына 1** *(да Гапусі):* Глядзі пад ногі — хоць нічога не знойдзеш, дык і галаву не разаб'еш.

**Гапуся:** А мне не трэба нічога шукаць: што хацела, я ўжо знайшла. А парог не ўбачыла з-за капусты. Я вось ужо капусту сваю ўсю пакрышыла, а гэта — лішак. На, Ганначка!

**Гаспадыня:** Бач, якая спрытная гаспадыня! А я вось ніяк не спраўлюся.

**Жанчына 1** *(звяртаецца да Гапусі):* А-я-яй! Работніца, як быццам бы другія нічога не робяць!

**Гапуся:** Якая ні работніца, а да цябе есці не хаджу прасіць! Ды каб была дрэнная гаспадыня, хіба параслі б такія качаны ў мяне?

**Жанчына 1:** Кожны чорт сваё балота хваліць.

**Гаспадыня:** Жанчынкі, хопіць вам спрачацца, справы чакаюць.

**Жанчына 2:** І сапраўды. Давайце, жанчынкі, крышыць ужо капусту.

*(Жанчыны крышаць капусту, паміж імі ідзе размова.)*

**Жанчына 3:** І добры ж дзень мы выбралі крышыць капустачку.

**Гаспадыня:** А мне здаецца, што ў бога ўсе дні роўныя.

**Жанчына 4:** Мая свякроўка казала: "Не глядзі маладзіка і круга — не будзеш прасіць у друга".

**Гапуся:** Ой, жанчынкі, як добра талакой працаваць. А я вось адна два тыдні крышыла.

**Жанчына 1:** Ну, вось і пакрышылі.

**Гаспадыня:** Так, капустачку пакрышылі, а зараз трэба скласці ў бочачку *(сыплюць капусту ў бочку).*

**Жанчына 4:** Ну, гаспадар, патаўчы, каб капуста была крэпкая і смачная!

**Заканчэнне — на старонцы 12.**

З "Куфра-радцы"

# "Капусная талака"

*(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 11.)*

**Жанчына 1:** Мужчына яе павінен патаўчы і паціскаць (*дае Сямёну таўкач*).

*(Жанчыны водзяць карагод вакол Сямёна, які таўчэ ў бочцы капусту, і спяваюць.)*

**Гаспадыня:** Дзякуй вам, жанчынкі, за дапамогу!

**Гапуся:** Ды няма за што, кліч і ў наступным годзе. Прыйдзем, дапаможам!

**Сямён:** Ганна, дык запрашай жанчынак да стала.

**Гаспадыня:** Сапраўды, сядайце, жанчынкі.

**Жанчына 2:** Ой, які прыгожы пірог з капустай! Мабыць, вельмі смачны?

**Гаспадыня:** Ешце, госцейкі, пірог з капустай, каб у хаце не было пуста!

**Жанчына 1:** Ой, суседка наша, смачная капуста ваша! Мабыць, тры дні варылася, тры мышы ўвалілася, бегла кошка з печы, памачыла хвост і плечы! (*Усе смяюцца.*)

**Дачка:** Ай! Кіньце, цётачка.

**Жанчына 1:** Я ж жартую. Усе вельмі смачна!

**Гаспадыня:** Жанчынкі, а можа мы што-небудзь праспявалі б?

**Жанчына 2:** Давай, Сямён, бяры гармонік! *(Жанчыны спяваюць некалькі песень.)*

**Гапуся:** Ой! Усё добра! Дзякуй табе, Ганначка, за пачастунак! Але ж пара ўжо і дадому!

(*Жанчыны развітваюцца.*)

**Аўтар — Кацярына ЯКУТОВІЧ, метадыст па народнай творчасці Кармянскага раённага цэнтра вольнага часу.**

# Радзіма кахання

*музыка Аляксандра Віслаўскага*
*верш Рыгора Барадуліна*



Родны край — гэта там,
Родны край гэта там,
Дзе аднойчы каханне
Нарадзілася,
Каб нарадзіць
Ля вачэй маладых
Маладое світанне,
Каб на радасць душу разбудзіць.

**Прыпеў**
Я кахаю!
Лунае нябёсаў вітанне.
Я кахаю! Вякоў запавет:
кожны носіць у сэрцы
Радзіму кахання
На каханні трымаецца свет,
На каханні трымаецца свет.

II. Родны край — гэта там, (2р)
Дзе раптоўна каханне
У палон узяло, павяло
Неабдумна рашуча
Цябе на спатканне,
Каб лагодна ўзяло пад крыло.

**Прыпеў.**

III. Родны край — гэта там, (2р)
Дзе хацела каханне
Маладосцю сябе паўтарыць.
Недарэмна спатканню
Зайздросціць растанне,
Зорка шчасця высока гарыць.

**Прыпеў.**

Калі карціна... заіграла

**...Хлопец сядзеў за піяніна і спяваў рыфмы. Было гэта ў Мінску, па-мойму, восенню 1995-га, у пакоі, запоўненым мала- і зусім незнаёмымі мне людзьмі на нейкім з апошніх паверхаў корпуса Белдзяржуніверсітэта. Потым былі пытанні, абмеркаванне ды партвейн. Хлопец, якога я ўбачыў і пачуў упершыню, — Сяргей Пукст. І палюбіў я творчасць ягоную адразу, як адразу некалі "ўтрэскаўся" ва ўсё тое, што рабіў геніяльны Сяргей Курохін. Пецярбургскі бескампрамісны падбухторшчык усераднёнага грамадскага густу раптоўна памёр у 1996-м, у адзін з дзён "Славянскага базару". Памятаю, як мы дзіка надзерліся з расійскім кампазітарам і шоуменам Сяргеем Шусціцкім, аплакваючы на начной віцебскай лавачцы скон вялікага музыканта... Калі я слухаю песні Пукста, у мяне ў вачах нярэдка з'яўляюцца нябачныя свету слёзы — гэта слёзы гонару. Я ганаруся, што гэты дзеяч культуры — мой суайчыннік. Захапляючыся словам, мелодыяй, аранжыроўкай майстра эпатажу, рыжага і белага клоўна, лютага і далікатнага. Калі ж гляджу я на карціны Пукста...**

Алег КЛІМАЎ

Той самы Пукст. / Фота Аліны САЎЧАНКА

"У чаканні чаек".



"Чалавек-газ".

# Пукст у мурашніку

...Ва ўзросце 8 — 9 гадоў у Сярожы Пукста добра атрымлівалася выводзіць і гамы ў гімназіі-каледжы пры Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі і маляваць фігуры ў руху ў мінскай студыі Рышарда Мая. І прасунуў ён апошняе ўменне да таго, што ў 1986 годзе паступіў у Мінскае мастацкае вучылішча імя Аляксея Глебава (цяпер Мінскі дзяржаўны мастацкі каледж імя Глебава). На аддзяленне... дрэваапрацоўкі. У той час на галовы бестурботных савецкіх людзей абрынулася навала самай рознай замежнай музыкі, дагэтуль не тое каб забароненай у краіне Кабзона і Вуячыча, але не рэкамендаванай да праслухоўвання, а таму шырока малавядомай. Абрынуўся і вал сусветнага ды ўнутранага выяўленчага мастацтва — у жанрах і імёнах, якім, ледзь перабольшу, яшчэ нядаўна месца адводзілася таксама ў культурным гета. Хвалі тыя не абміналі і згаданае вучылішча. Акунуўся ў іх і Пукст: тады з яго ўдзелам нарадзіўся панк-гурт "Кароль пчол", а пры "папушчальніцтве" разгубленага выкладчыцкага складу "глебаўкі" Сяргей, "забіўшы" на класічныя нормы творчасці (і з адабрэння маладых настаўнікаў), пачаў шалець на ніве культуры наогул.

— Але свята непаслушэнства калі-небудзь заканчваецца, — заўважае Пукст. — Шмат хто пасля акадэміі проста знік у нікуды, з акадэмічнай музыкай справа ішла прыблізна гэтак жа. Так бачылася мне. Да ўсяго, і тая, і іншая прафесія аплачваліся вельмі сціпла. І пад слушным уплывам бацькоў, з'яўляючыся сам чалавекам у чымсьці прагматычным, я паступіў у "іняз". Чалавек з веданнем замежных моў у тыя часы быў запатрабаваны ўсюды. А жывапісам і музыкай вырашыў займацца толькі дзеля ўласнага задавальнення. Больш выйшла з музыкай. Сёння я выкладаю англійскую мову, складаю песні, выступаю, запісваю альбомы і зрэдку малюю.

"Трыумф волі".

Малюе так, што дома ў яго не засталося ніводнай работы — усе прададзеныя. Кажучы пра тое, якія напрамкі паўплывалі на яго манеру, Пукст перш за ўсё называе сюррэалізм з яго, па словах Сяргея, бессэнсоўнай жорсткасцю, фантазійнасцю, якая базуецца на немагчымых сітуацыях. Куміраў сабе наш герой не выбірае, але да Рэнэ Магрыта, Паўля Клее, Фрэнсіса Бэкана, Пабла Пікаса і іх твораў ставіцца з вялікай павагай, нешта падглядвае ў іх і міжвольна драбніцу ідэйна "пазычае" (глядзім "У чаканні чаек", навеяную якраз творчасцю Магрыта), як бы перадаючы прывітанне сваім больш вядомым калегам.

— Адкрыю страшную таямніцу, — адкрывае страшную таямніцу Сяргей. — Не заўсёды мною першапачаткова рухае задумка. Напрыклад, карціна "Чалавек-газ". Пры яе напісанні я выкарыстаў спіртавыя чарнілы. Яны пацяклі па кудзелі, утварыліся такія ярка выяўленыя краі, разводы, зайграла святлацень, атрымалася цікавая фактура. У галаве ў мяне былі думкі наконт таго, што павінна ў выніку атрымацца, але не канчаткова спелыя, а тут — вось яно, усё ўстала на месцы.

Важным у сваім мастацкім падыходзе Пукст лічыць тое, што ён адмыслова ледзь не дамалёўвае карціны, даючы магчымасць папрацаваць уяўленню чалавека, дапісаць незапоўненыя, калі такімі здаюцца, палі на палатне. Спантаннасць, двухсэнсоўнасць, шматстайнасць, загадкі, невідавочнасць гульні — гэта яго. Як экспрэсіянізм і выразнасць. Іншы важны момант: для сябе Сяргей адхіляе жорсткую сістэмнасць у выяўленчым мастацтве ("мне становіцца сумна, калі я разумею, як зроблена карціна"). Не ідэю як такую, а яе скрупулёзнае ўвасабленне. Ён дае волю нерукачыннаму парыву, а не ашчадна-аналітычнаму. (Дазволю сабе наступную рэмарку: некаторыя музычныя крытыкі перакананыя ў тым, што асобныя ўласныя музычныя сачыненні Пукст менавіта старанна канструюе, складае пазлы з нарыхтаваных фрагментаў, зачароўваючы слухача "байкамі" пра эмацыйную накіраванасць сваёй непрадказальнай творчасці...)

— У песнях мне цікава корпацца ў чалавечым мурашніку, — прызнаецца Сяргей. — Тое ж самае тычыцца і жывапісу. Мне цікавыя людзі, іх характары, іх сентыментальнасць. Фігуры. Асобы. Іх чароўнасць ці, наадварот, тое, што быццам бы адштурхоўвае ў іх. Цікавыя гісторыі, якія стаяць за людзьмі, — рэальныя або прыдуманыя мной, мною ж пераасэнсаваныя... перапрацаваныя.

У творчых планах Пукста, звязаных з выяўленчым мастацтвам, — дзве карціны, дзе цэнтрам прыцягнення поглядаў зноў стануць людзі. І кадаваная з дапамогай нейкіх прадметаў іх навакольная прастора. Калі ён возьмецца за працу грунтоўна, Сяргей не ведае. Майстэрні ў яго, натуральна, няма, балкон дома такі, што асабліва не разгарнуцца. А, як ведаюць прыхільнікі толькі музычнага Пукста, нягледзячы на сваю адносную нязладжанасць, разгортвацца ў творчасці ён любіць і не прызнае прастораў абмежаваных. Гэта значыць, трэба дачакацца, калі настане час унутранага кампрамісу, і наперад!

К

## Меркаванне мастацтвазнаўцы Пётры Васілеўскага

— Карціны Сяргея — гэта такія дыхтоўныя работы таленавітага чалавека, якому цікава назіраць жыццё ва ўсіх яго праявах. Верагодна, у жывапісе ён рэалізуе тыя свае эмоцыі ад навакольнага, якія не можа ці не паспявае рэалізаваць у музыцы. І ў яго гэта атрымліваецца. Яго мысленне ў дадзеным кантэксце падобнае да геаметрычнага абстракцыянізму, строгай логікі ў творах Пукста няшмат. Ён нібы сам дзівіцца таму, што ў яго ў выніку выходзіць. Хоць школа савецкага выяўленчага мастацтва, рэалістычнага, у яго творчасці адчуваецца, калі ён нейкую абстрактную кампазіцыю падганяе пад больш-менш пазнавальную форму. Яму было б больш натуральна заняцца чыстай абстракцыяй.

# Арт-квартэт

*(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 7.)*

Работы, прадстаўленыя ў экспазіцыі, дэманструюць жанравую і стылістычную разнастайнасць. Асаблівай увагі заслугоўваюць працы навучэнцаў спецыяльнасці "дэкаратыўна-прыкладное мастацтва". Работа з формай, колерам заўсёды арганічна спалучаецца з раскрыццём унутранага зместу вобраза і сюжэту. У простых, на першы погляд, кампазіцыях схаваныя харастро навакольнага свету, яго мудрасць і глыбіня. Так, у керамічным творы Мікіты Вязьмікіна "У добры шлях" раскрываецца думка пра тое, што дом гэта не толькі канкрэтнае месца для баўлення часу, але і ўнутраная прастора, дзе чалавек заўсёды знаходзіць сябе. Выкананыя ў вобразе смаўжа, цудоўныя падсвечнікі ствараюць адчуванне ўтульнасці і цеплыні. У рабоце Віталіі Бараноўскай "Вялікдзень" (у тэхніцы бацік), алегарычна адлюстраванае адно з галоўных рэлігійных святаў. Чырвоны колер выступае ў творы знакам роду, сувязі пакаленняў, жыцця. У керамічнай кампазіцыі Маршавай Ганны "Che" ў постмадэрнісцкай гульні сэнсавых значэнняў слоў і вобразаў раскрываецца гістарычны ракурс, які адсылае гледача да культуры розных краін — Кубы і СССР.

Катэрын Жаэг. "Шахматыст з тонкім гальштукам".

Святлана Кастрыца. "Від на касцёл у Нясвіжы".

Асаблівую цікавасць выклікае аўтарская вобразная сістэма, яе скразныя матывы, дзе вялікую ролю адыгрывае зварот мастака да сюжэтаў з Бібліі, антычнай міфалогіі, сусветнай гісторыі, якія заўсёды афарбаваныя паэзіяй "суб'ектыўнага гістарызму". Усё гэта дае падставу казаць пра паліфанічнасць мастацтва Георгія Скрыпнічэнкі, яго парадаксальнасць і глыбіню, карані якога схаваныя, калі карыстацца тэрміналогіяй Э. Дзюркгейма, у "калектыўнай свядомасці людзей".

Георгій Скрыпнічэнка. "Сёння свята".

Мікіта Вязьмікін. "У добры шлях".

Сюррэалістычнасць творчасці мэтра грунтуецца на адвечных духоўных каштоўнасцях. Адштурхоўваючыся ад прынцыпаў іншасказальнасці, мастак стварае ўнікальную гісторыю, дзе сучаснасць непарыўна спалучана з мінулым, традыцыямі, светаўспрыманнем розных пакаленняў. Яркі прыклад — карціна "Гармонія стагоддзяў", дзе лейтматывам праходзіць тэма цыклічнасці жыцця. У цэнтры кампазіцыі змешчаныя дзве фігуры жанчын, адной з якіх з'яўляецца славутая Марыя Радзівіл (Лупа). Белы колер у яе адзенні сімвалізуе ўнутраную чысціню. Па абодва бакі ад маладых жанчын знаходзяцца плады — яблыкі і грушы — сімвалы даўгавечнасці кахання, здароўя і мацярынства. Выявы сабакі і савы можна разглядаць у якасці праяваў вернасці і мудрасці — асноватворных пачаццяў моцнай сям'і. Цікава, што за спінамі гераінь — пейзажы з нехарактэрнымі для іх часу асаблівасцямі. Гэта яшчэ раз наводзіць на думку пра повязь часоў, пераемнасць традыцый, неўміручасць культурных каштоўнасцяў.

У больш побытавым сэнсе гэта ідэя абыгрываецца ў творы "Сёння свята" — гэта "карціна ў карціне". Залацістымі промнямі заліты майстэрня мастака, які толькі што скончыў сваю плённую працу над палатном. Бабуля ў хустачцы, што сядзіць на вясковым двары, і маленькі хлопчык, які прынёс ёй палявыя кветкі. Сабака, што мірна ляжыць на траве, і кош, напоўнены дарункамі зямлі. За знешняй наіўнай, дзіцячай прастатой сюжэта схавана, між тым, сакральнае разуменне жыцця, яго велічы і прыгажосці. Сувязь традыцый, пакаленняў — галоўнае сэнсавае звяно гэтага філасофскага твора.

Атмасферай роздуму, унутранай пранікнёнасцю і глыбінёй напоўнена карціна "Час ехаць у Бакшты", дзе на фоне вясковага пейзажа адлюстраваныя мужчынская і жаночая фігуры. Гэта не толькі чаканне хуткага вандравання, але, перш за ўсё, пошук новага жыццёвага шляху, яго светлых перспектыў. Котка ж ля ног дзяўчыны асацыюецца з воляй выбару, а асветленая сонцам дарога заклікае падарожнікаў рухацца насустрач сваёй мары.

У творах Скрыпнічэнкі за вонкавым бокам рэчаў заўсёды схаваны глыбокі духоўны падтэкст, які дае падставы для разваг пра ролю гісторыі і культуры ў жыцці чалавека, значэнне маральных і эстэтычных ідэалаў, разуменне жыццёвай мудрасці, якая складае фундамент будучага дня.

1 снежня ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў (пляцоўка — Музей сучаснага выяўленчага мастацтва) адбылося адкрыццё сумеснага беларуска-французскага праекта "Арт Капіталь: з Францыі ў Беларусь". Куратар праекта — ураджэнец нашай краіны Аркадзь Валадось.

Яшчэ ў 2015 годзе адзінаццаць беларускіх мастакоў і скульптараў упершыню прадставілі нацыянальны павільён Беларусі ў межах міжнароднай выставы "Арт Капіталь" на Елісейскіх палях у Парыжы. Тады ж мастачка Валянціна Шоба і скульптар Сяргей Парцянкоў былі адзначаны прэстыжнай прэміяй Асацыяцыі барона Тэйлара. Прыезд жа французскіх мастакоў у Мінск стаў працягам культурнага дыялогу паміж краінамі, які грунтуе Пасольства Беларусі ў Францыі. Дэлегацыя гасцей была прадстаўлена 15 мастакамі з "Salon Comparaisons", "Salon des Artistes Francais", "Salon du Dessin et de la Peinture a l'eau".

Рэалістычныя карціны арганічна спалучаюцца з імпрэсіяністычнымі, экспрэсіяністычнымі, сімвалічнымі кампазіцыямі, якія раскрываюць складанасць, супярэчлівасць, але, разам з тым, харастро і прыгажосць сусвету ды чалавека. Класічнай манерай пісьма, адухоўленасцю вобраза, празрыстасцю палітры вылучаецца дыптых Жэрар Бажар "Сена". Асаблівую ўвагу мастачка адводзіць адлюстраванню воднай роўнядзі — спакойнай, ціхамірнай, падобнай да паверхні люстэрка. Чысціня вады ў яе карцінах суадносіцца з чысцінёй і гармоніяй унутранага свету чалавека. "Краявіды Правансу" Ніколь Клеман падаюць з іншага боку прыгажосць французскай прыроды. Яркасць фарбаў, дынамічнасць, пазітыўны настрой, якім авеяная гэта карціна, сцвярджае думку: жыццё сапраўды з'яўляецца святам, якое заўсёды знаходзіцца з чалавекам. Экспрэсіўнасцю, псіхалагічнай напружанасцю і глыбінёй прасякнуты твор Катэрын Жаэг "Шахматыст з тонкім гальштукам". Акцэнтуацыя на яркіх каларыстычных плямах, нярвовасць ліній, узмоцненая эмацыянальнасць вобраза дазваляюць праводзіць паралель з творчасцю нямецкіх экспрэсіяністаў, асабліва з Эрнстам Людвігам Кірхнерам. Філасафічнасцю, неадназначнасцю трактоўкі характарызуецца карціна Анны Пурны "Варыяцыі". Спалучэнне кантрасных тонаў разам з размытасцю формы надаюць усёй кампазіцыі падкрэслена метафарычнае гучанне, варыятыўнасць сэнсавых значэнняў.

**Ксенія СЯЛІЦКАЯ-ТКАЧОВА, мастацтвазнаўца, сябра экспертнага савета пры мастацкай галерэі "Універсітэт культуры", сябра Беларускага саюза мастакоў**

---

Персаніфікацыя культуры

# Мастак з дакамп'ютарнай пары

**Сёлета спаўняецца 75 гадоў з дня нараджэння і 20 гадоў з дня смерці Леаніда Марчанкі (1941 — 1996) — выдатнага майстра беларускай станкавай графікі, добра вядомага гледачам, найперш, сваімі лірычнымі пейзажамі ў тэхніцы афорта. Ён быў сапраўдным падзвіжнікам гэтай складанай графічнай тэхнікі, выдатна валодаў усімі тонкасцямі друку. І ўжо пры жыцці мастака яго творы атрымалі прызнанне.**

Валодаючы ўражвальнай працаздольнасцю, захоплены прафесіяй, Леанід Марчанка пакінуў па сабе вялізную творчую спадчыну, якая дбайна захоўваецца яго сям'ёй. Дзякуючы энтузіязму і бескарыслівай дапамозе удавы мастака, мастацтвазнаўцы Ніны Марчанка, ужо пасля яго смерці ў музеях рэспублікі адбылося больш за 20 выстаў твораў у розных тэхніках і жанрах: афорты, малюнкі, акварэль, эцюды маслам, частка якіх пераходзілі ў музейныя фонды.

У творчасці Леаніда Марчанкі арганічна спалучаўся дар жывапісца і графіка. Нават чорна-белыя афорты нібы свецяцца пераходамі тонаў, ствараючы адчуванне колеру. Адна з нядаўніх выстаў памяці Леаніда Марчанкі, якая працуе ў сталічнай галерэі "Беларт", сталася цікавай найперш тым, што на ёй прадставілі раней не экспанаваныя акварэлі, якія захоўваліся дагэтуль у майстэрні. У лістападзе гэтыя аркушы і іншыя творы з музейнага фонду ўбачылі ў Бабруйскім мастацкім музеі.

Мінская камерная экспазіцыя з 25 аркушаў падала толькі адну грань творчасці Леаніда Марчанкі, які шмат вандраваў па свеце і, разам з тым, назаўсёды быў закаханы ў сціплую прыгажосць роднай зямлі. З акварэлі пачынаў ён свой шлях у мастацтве, зноў звярнуўся да гэтай тэхнікі ў 1990-я, пераломны і неспакойны перыяд "адмаўлення" прынцыпаў савецкага мастацтва. Ужо сталым майстрам ён, верагодна, з адмысловай вастрынёй адчуў унутранае запатрабаванне знайсці жыццёвую і творчую апору ў непасрэдных зносінах з прыродай. Акварэлі, у адрозненне ад старанна прадуманых і "складзеных" у майстэрні афортаў, былі зробленымі на восеньскіх пленэрах у вёсцы. Празрыстыя, стрыманыя па колеры творы вылучае хуткасць выканання ды прастата прыёмаў, і разам з тым — глыбокая пранікліваcць і паэтызацыя штодзённых прыродных матываў. Яны падкупляюць тонкасцю каларыту і танальных градацый, адчуваннем каштоўнасці кожнай хвіліны быцця. Усё, што пазначала ўважлівае вока мастака, станавілася для яго падзеяй, годнай ушанавання: спусцелыя вуллі пад абляцелымі дрэвамі, вясковая хата і конь, які пасвіцца побач… "Цішыня" — менавіта так назваў Марчанка некалькі сваіх акварэляў — адмысловы стан маўклівага засяроджанага дыялогу творцы і натуры, чалавека і прыроды.

Адзін з твораў Леаніда Марчанкі.

Акрамя несумненнай эстэтычнай каштоўнасці, гэтая выстава здольная абудзіць у гледача цэлы ланцуг разважанняў, актуальных у наш час: пра імгненнае і адвечнае, пра памяць, пра сям'ю як структураўтваральную аснову нацыянальнай культуры. Глыбока асабістае выказванне мастака, зробленае пра сябе і "для сябе", становіцца з цягам часу адлюстраваннем цэлай эпохі.

Акрамя твораў самога Леаніда Марчанкі, сям'я захавала збор афортаў тады маладых мастакоў-сямідзясятнікаў з розных рэспублік СССР, створаных у доме творчасці "Сенеж", дзе сам беларускі творца працаваў тройчы. Калекцыя друкаванай графікі адлюстроўвае як высокі прафесійны густ Марчанкі, так і дзіўную атмасферу захопленасці і творчага яднання, маладосці і эксперыменту. Яна экспанавалася ў выставачным комплексе Нацыянальнай бібліятэкі і выклікала вялікую цікавасць: настолькі свежа выглядалі гэтыя аркушы. Сёння вельмі важна як мага больш шырока паказваць гледачу творы з эстэтычнай і гісторыка-пазнаваўчай каштоўнасцю. Бо мы жывём у перыяд віртуальнага існавання мастацтва, якое перастала мець патрэбу не толькі ў цішыні майстэрні, але часцяком і ў прафесійных уменнях. Калі алічбаваныя вынікі арт-дзейнасці не мільгацяць у стужцы навін сацыяльных сетак, не выклікаюць абмеркаванняў і скандалаў, не збіраюць пахвалы "прасунутых" дылетантаў, дык нават прафесіяналы пачынаюць усё часцей успрымацца як не вартыя ўвагі.

Невялікая экспазіцыя шчырых твораў майстра з іх асаблівай атмасферай душэўнасці абуджае ў наш час інтэрнэт-прэзентацый і віртуальных галерэй настальгію па "дакамп'ютарным" успрыманні мастацтва як сутнасці вобразнага спасціжэння свету, а не проста спосабе самарэкламы ці ўпрыгожвання інтэр'еру.

**Марына ЭРЭНБУРГ, мастацтвазнаўца**

Міжнародны конкурс мастацтваў у рамках праекта "#byfest" у мінскім Палацы дзяцей і моладзі "Золак".

Майстар-клас па ігры на цымбалах падчас свята беларускай культуры ў аграгарадку Мазалава.

Падчас конкурсна-забаўляльнай праграмы "У коле сям'і" ў Палацы мастацтваў Бабруйска.

Маленькія ўдзельнікі мерапрыемства "Няхай заўжды будзе сонейка!" ў Мастах.

# Рэкорды Бабруйска, #byfest і неглюбскі арнамент на перніках

**Сёння ў Асіповіцкім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі пройдзе навуковая канферэнцыя, прысвечаная вынікам археалагічных даследаванняў гэтага краю. Як паведамляе дырэктар установы Антаніна Сцяпанава, у мерапрыемстве бяруць удзел супрацоўнікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, якія займаліся тут раскопкамі, а таксама — старшыні сельскіх саветаў, краязнаўцы, настаўнікі гісторыі. Адно з пытанняў парадку дня — ахова 99 археалагічных помнікаў.**

Яўген РАГІН

У сённяшнім аглядзе пісьмаў усе рэкорды б'е Палац мастацтваў горада **Бабруйска**. Пра шматгранную дзейнасць гэтай установы ці не адначасова напісалі тры розныя яе супрацоўнікі. І ў кожнага — свая тэма расповеду. Каб усе так!

Дык вось, загадчык культурна-масавага сектара палаца Кацярына Каваленка паведамляе пра конкурсна-забаўляльную праграму "У коле сям'і", што прайшла ў дысказале ўстановы. Культурна-масавы сектар Палаца і аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Адміністрацыі Першамайскага раёна Бабруйска сабраў сямейныя пары з дзецьмі, якія жывуць у інтэрнатах. "*Пераможцы*, — піша аўтар, — *былі вызначаны ў намінацыях "Мой дом — мая крэпасць", "Творчая майстэрня", "З песняй па жыцці", "Самая інтэлектуальная сям'я", "Пальчыкі абліжаш", "Раніца мудрэйшая за вечар"*.

"*У аграгарадках Варатынь і Вязоўніца выступілі лепшыя самадзейныя калектывы нашай установы,* — распавядае метадыст арганізацыйна-метадычнага аддзела Палаца мастацтваў горада Бабруйска Ірына Аўсянікава. — *А творцы-аматары Цэнтра культуры і вольнага часу Ленінскага раёна Бабруйска наведалі з канцэртам аграгарадок Кавалі*".

А вось інфармацыя загадчыка арганізацыйна-метадычнага аддзела палаца Наталлі Чорнай. Яна вядзе гаворку пра семінар па прафілактыцы СНІДу. Прысутныя паглядзелі тэматычныя фільм і ўрывак са спектакля, паслухалі лекцыі спецыялістаў. Працавала бібліятэчная выстава.

У рамках культурнага праекта "#byfest" **у сталічным** Палацы дзяцей і моладзі "Золак" прайшоў Міжнародны конкурс мастацтваў. Ён меў тры намінацыі: музыка, вакал, харэаграфія. Было пададзена больш за 230 заявак ад удзельнікаў узростам ад 4 да 18 гадоў і больш сталых з Мінска, Салігорска, Гомеля, Бабруйска, Маладзечна, Слуцка, Барысава, а таксама з гарадоў Польшчы, Украіны, Туркменістана, Кітая, Расіі. Актыўны ўдзел у праекце бралі навучэнцы **Ашмянскай** дзіцячай школы мастацтваў: дуэт "Незабудкі" (настаўнік Таццяна Чэрская), ансамбль "Пацерачкі" (настаўнік Таццяна Чэрская), ансамбль гітарыстаў "Фіеста" (настаўнік Алеся Місюкевіч), а таксама — салісты, выхаванцы Таццяны Печкур, Галіны Крыніцкай, Галіны Нацэўскай. "Незабудкі" ў складзе Марыі Чэрскай і Кацярыны Шыманскай атрымалі дыплом І ступені, а саліст Вадзім Васілеўскі — дыплом III ступені.

Піша загадчык **Мастоўскай** раённай дзіцячай бібліятэкі Таццяна Ярашук: "*Наша ўстанова даўно і плённа супрацоўнічае з Цэнтрам карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі горада Масты. Выхаванцы яго — пастаянныя госці ў бібліятэцы і ўдзельнікі нашых мерапрыемстваў. Вось і гэтым разам дзеці-інваліды прыйшлі на свята "Няхай заўжды будзе сонейка!" Разам з бібліятэкарамі, якія выступілі ў ролі адважных каўбояў, яны выправіліся ў займальнае падарожжа. А яно суправаджалася гульнямі, конкурсамі, песнямі і танцамі ў стылі кантры*".

У аграгарадку **Мазалава** прайшло свята беларускай культуры. Вядучы метадыст Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці Андрэй Струнчанка распавядае, што "*на мерапрыемства завіталі студэнты з Кітая, Лівана, Нігерыі, якія навучаюцца ў Віцебскай ветэрынарнай акадэміі*". Госці не толькі агледзелі Мазалава і не толькі пачаставаліся дранікамі. Пасля канцэрта з удзелам народнага ансамбля народнай песні і музыкі "Вераснянка", тэатральнага гуртка "Вобраз" і выкладчыкаў ДШМ былі наладжаны майстар-класы па ігры на беларускіх народных інструментах. А сельская бібліятэка прапанавала пазнаваўчую праграму. Андрэй Струнчанка дадае: "*пры мясцовым СДК дзейнічае клуб інтэграцыйнага сяброўства "Згода". Замежныя госці аграгарадка сталі новымі ўдзельнікамі клуба*".

Гарадская бібліятэка № 1 **Барысава** аформіла кніжную выставу "Зімы цудоўныя матывы". У сямі раздзелах прэзентуюцца не проста кнігі на зімовую тэматыку, але і напісаныя так, што абавязкова паспрыяюць стварэнню добрага настрою чытачоў у перадднавагодні час і ў перыяд зімовых школьных вакацый.

7 снежня споўнілася б 75 гадоў з дня нараджэння выбітнага фалькларыста Беларусі Васіля Ліцвінкі. Дзякуючы яго намаганням, паведамляе прэс-служба Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, на філалагічным факультэце БДУ была створана Навукова-даследчая лабараторыя беларускага фальклору і дыялекталогіі. У выніку яе дзейнасці ўзніклі чатыры архівы: рэгіянальны (усіх раёнаў краіны) — больш за чатыры мільёны тэкставых запісаў; жанравы, дзе тыя запісы сістэматызаваныя; аўдыяархіў — каля 500 тысяч музычных запісаў; відэаархіў — 233 фільмы пра самабытныя з'явы абрадава-святочнай культуры ў рэгіянальных варыянтах. Васіль Ліцвінка, як кіраўнік згаданай лабараторыі, выдаў 18 фальклорных зборнікаў, манаграфіі, шматлікія календары, папулярызаваў наш фальклор на радыё і тэлебачанні.

Навіна з маёй роднай **Веткі**. Мясцовы кандытарскі цэх пачаў выпускаць пернікі, аздобленыя выявай часткі арнаменту неглюбскага ручніка. Той рэдкі выпадак, калі брэнд нараджае брэнд. Пернікі "дэбютавалі" на Дні ручніка ў Неглюбцы. Інфармацыя, безумоўна, цікавая для тых, хто яшчэ не вырашыў, пад якімі брэндамі будзе жыць і развівацца ягоны раён... Асабіста я збіраю калекцыю магніцікаў з арнаментальнымі элементамі неглюбскага ручніка. Такімі сувенірамі гандлююць у Веткаўскім музеі стараверства і беларускіх традыцый імя Фёдара Шклярава, а таксама — у **Неглюбскім сельскім цэнтры ткацтва**.

Інфармацыя, што прыйшла з **Лёзненшчыны** (даўно адсюль не было навін). Яна таксама звязана з раённым брэндам. Загадчык аддзела Раённага цэнтра культуры па фальклоры і народных традыцыях Ганна Макравусава паведамляе, што 23 снежня адбудзецца ўручэнне прэміі "Сунічка" па выніках 2016 года. Сунічка — брэнд раёна. Цяпер тую ягадку можна сустрэць не толькі ў мясцовых лясах, але і на шматлікіх вырабах майстроў, што працуюць у раённым цэнтры рамёстваў. А прэмія ўручаецца лепшым работнікам культуры і самадзейным творчым калектывам. Каму гэтым разам — паведамім у наступных нумарах.

Навагоднюю ёлку з футра зрабілі метадысты **Лепельскага** цэнтра рамёстваў "Скарбонка". Пра гэта распавяла кіраўнік установы Ніна Звягінцава. Метровая прыгажуня, аздобленая вышыванымі цацкамі, адпраўляецца на абласны конкурс "Калядная зорка", які ладзіць **Віцебскі** абласны метадычны цэнтр народнай творчасці. А ёлачкі меншых памераў, вязаныя з нітак ці з мішуры, цяпер прадаюцца ў сувенірнай краме, што працуе пры Лепельскім цэнтры рамёстваў.

**Буда-Кашалёўскі** райвыканкам, карцінная галерэя імя Яўсея Маісеенкі, Гомельская абласная універсальная бібліятэка арганізавалі выставу, прысвечаную 100-годдзю з дня нараджэння народнага мастака СССР Яўсея Маісеенкі — ураджэнца гэтага краю. Сёння фонд галерэі складаецца з больш чым 700 экспанатаў, з якіх больш як 100 твораў жывапісу, у тым ліку і эцюд самога майстра 1946 года. У выставе "Споведзь прасторы" прымаюць удзел члены Беларускага саюза мастакоў Анатоль, Глеб і Таццяна Отчыкі, Любоў Сцяпанава, Леанід Кір'янаў.

К

# "Вянок кінягіні"

**У раённым аглядзе-конкурсе традыцыйных вясельных абрадаў і спеваў Гарадоччыны цягам года прымалі ўдзел клубныя ўстановы Цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці. А называўся агляд "Вянок кінягіні". На Гарадоччыне так называлі нявесту. І павінна была мець "кінягіня" белую скуру ды даўгія валасы…**

Клубнікі прэзентавалі абрады, у якіх прысутнічалі фальклорныя побытавыя танцы, гучалі прыгожыя вясельныя песні і прыпеўкі, здабытыя ў экспедыцыях. У чымсьці гэтыя абрадавыя элементы вельмі падобныя, аднак, іншым разам, і адметныя — то мелодыяй, то тэкстам, то асаблівай манерай выканання, характэрнай толькі для пэўнай мясцовасці… Дык вось, гучалі велічальныя песні сватам і баяркам, бацькам і жаніху з кінягіняй, былі і жалобныя спевы ад маці, і вельмі гучныя, вясёлыя, якія выконваліся за вясельным сталом. Абавязковымі былі і маршы, каб ушанаваны быў кожны госць.

Апошнім этапам агляду-конкурсу сталася рэканструкцыя гарадоцкага вяселля пачатку XX стагоддзя. Невыпадкова месцам яе правядзення была вёска Бычыха — край, дзе старадаўнія музычныя і песенныя традыцыі ведаюць амаль усе жыхары. Тут калісьці жыў вядомы музыка-самавук, віртуозны гарманіст Іван Іўлеў. Закладзеныя ім традыцыі жывуць і развіваюцца.

Наш край увогуле багаты на таленты. Не кожны раён можа цяпер пахваліцца такой колькасцю музыкаў і спевакоў, якія так удала прадставілі сваё майстэрства на рэканструкцыі вясельнага абраду: маю на ўвазе народныя фальклорныя калектывы "Азерыца" Езярышчанскага ГПДК, "Спадарыня" Бычыхінскага СДК, народны ансамбль гарманістаў ЦТКіНТ, майстра галосных спеваў Таццяну Раеву і фальклорны гурт Халамерскага СК, народны фальклорны ансамбль "Глейна" ЦТКіНТ.

Фрагменты рэканструкцыі вясельнага абраду. / Фота аўтара

Усяго ў рэканструкцыі прынялі ўдзел 45 чалавек. Усім вялікі дзякуй за няпростую працу і шчырае стаўленне да сваёй гістарычнай спадчыны, сваіх каранёў, старажытных традыцый продкаў. Нездарма кажуць: "Чалавек жыве век, а добрая справа — два".

**Лілія РЭЗКІНА,**
**намеснік дырэктара Цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці Гарадоцкага раёна**

# Адзінаццаць гадоў, якія змянілі ўсё

**У гэтыя снежаньскія дні ёсць добрая нагода ўзгадаць тых, хто стаяў ля вытокаў сучаснага фондавага збору Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь. 60 гадоў таму, 15 снежня 1956 года, выйшла распараджэнне Савета Міністраў БССР аб Арганізацыйнай групе па стварэнні Дзяржаўнага музея БССР. Дзеля таго, каб зразумець сутнасць і значэнне гэтай падзеі, неабходна ўзгадаць папярэдні, вельмі складаны этап станаўлення Нацыянальнага гістарычнага музея.**

Супрацоўнікі Арггрупы Р.В. Доўнар-Запольская і У.А. Маслыка. 1960 год.

Супрацоўнік Арггрупы Л.Д. Клок. 1960 год.

## Ля вытокаў Нацыянальнага гістарычнага

### Крок першы

У сакавіку 1919 года першы беларускі савецкі ўрад на падмурку нацыяналізаванай гісторыка-культурнай спадчыны распачаў работы па стварэнні ў Мінску Абласнога музея. Адноўлены пасля польскай акупацыі ў Архірэйскім доме, з 1922-га ён працягнуў сваю дзейнасць пад назвай Беларускі дзяржаўны музей. З'яўляючыся "цэнтральнай установай для захавання прадметаў і калекцый мастацкага, гісторыка-археалагічнага і этнаграфічнага характару, якія маюць агульнарэспубліканскае значэнне", музей дасягнуў піка сваёй дзейнасці напрыканцы 1920-х гадоў пад кіраўніцтвам акадэміка Вацлава Ластоўскага. У той час фондавы збор музея налічваў ужо каля 30 тысяч прадметаў, сярод якіх — крыж Ефрасінні Полацкай.

Перайменаваны ў Мінскі сацыяльна-гістарычны музей у гады "культурнай рэвалюцыі", у пачатку 1930 года ён быў выселены з Архірэйскага дома ў Дом селяніна, а ў наступным годзе — у адзін з павільёнаў Рэспубліканскай выставы. У 1929 — 1932 гадах фонды музея былі спустошаны агентамі Усесаюзнага аб'яднання па экспарце "Антыкварыят", якія займаліся адборам і продажам за мяжой шэдэўраў савецкіх музейных калекцый. У розныя часы былі арыштаваны і расстраляны дырэктары музея Вацлаў Ластоўскі, Сымон Рак-Міхайлоўскі, Сямён Якубчык, а таксама многія супрацоўнікі. Кароткі перыяд "адлігі" 1939 — 1941 гадоў вярнуў Беларускаму дзяржаўнаму музею яго папярэдні статус. У красавіку 1939-га першы сакратар ЦК КП(б)Б Панцеляймон Панамарэнка адмяніў загад наркама асветы рэспублікі Еўдакіі Уралавай аб далучэнні Мінскага абласнога гістарычнага музея да Музея рэвалюцыі БССР. А ў канцы 1940 года абласному музею далі назву "Дзяржаўны гістарычны музей БССР" і вярнулі ў Архірэйскі дом.

Стварэнне новай экспазіцыі там прыпынілася з пачаткам вайны. Часу і сродкаў на эвакуацыю музеяў са сталіцы БССР не было. Пакінуты без нагляду, Дзяржаўны гістарычны музей БССР, з якога ў першыя месяцы нямецкай акупацыі вывезлі найбольш каштоўныя прадметы, пакрысе расцягваўся гараджанамі. Неўзабаве музей аднавіў дзейнасць як адна з культурных устаноў генеральнай акругі "Беларутэнія" пад кіраўніцтвам былога настаўніка Антона Шукелойця. У 1944 годзе, паводле загада нямецкага камандавання, калекцыі гістарычнага музея вывезлі ў баварскі замак Хёхштэт. Там іх знайшлі амерыканскія ваенныя — "паляўнічыя за скарбамі" і ў 1947 годзе перадалі ў 182 скрынях савецкаму боку. Неўзабаве калекцыі вярнуліся ў Мінск. Яны разам з часткай вернутых з Вільні калекцый Беларускага музея імя Івана Луцкевіча склалі падмурак збору Дзяржаўнага музея БССР.

### Крок другі

Першыя захады па яго стварэнні (а больш дакладна — аднаўленні даваеннага Беларускага дзяржаўнага музея) былі зроблены ў сярэдзіне 1950 года, калі аддзел музеяў Камітэта па справах культурна-асветніцкіх устаноў пры Савеце міністраў БССР спрабаваў "вырашыць пытанне аб фінансаванні работ па праектаванні будынка для рэспубліканскага Беларускага дзяржаўнага музея ў Мінску". У кастрычніку 1951 года выконваючы абавязкі прэзідэнта Акадэміі навук БССР акадэмік Іван Лупіновіч звярнуўся да сакратара ЦК КП(б)Б Цімафея Гарбунова з прапановай адрадзіць Беларускі дзяржаўны музей. У прыватнасці, ён адзначаў, што "ўзнаўленне музея мае не толькі навуковае, але палітычнае значэнне, таму, не чакаючы ўзвядзення новага будынку, трэба адкрыць яго ў доме, дзе музей знаходзіўся напярэдадні вайны". Але справа не зрушылася з месца да пачатку хрушчоўскай адлігі.

Працэс дэмакратызацыі савецкага грамадства, які пачаўся ў сярэдзіне 1950-х, нарадзіў у беларускай музейнай грамадскасці спадзеў на вырашэнне набалелых праблем, у першую чаргу рэабілітацыі дасавецкага мінулага і паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнай базы. Сігналам "адлігі", якая, адначасова з іншымі сферамі культуры, у 1955 годзе пачалася ў музейнай справе, было пераўтварэнне ў музей ансамбля маскоўскага Крамля, адкрыццё ў Дзяржаўным музеі прыгожых мастацтваў імя Пушкіна замест выставы падарункаў Сталіну выставы шэдэўраў Дрэздэнскай карціннай галерэі, выданне падручніка "Асновы савецкага музеязнаўства".

БССР адрэагавала на гэтыя падзеі пастановай ЦК КПБ ад 13 верасня 1955 года "Аб стварэнні Дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея Беларускай ССР". Гэтай пастановай міністру культуры Рыгору Якаўлевічу Кісялёву даручалася ў двухмесячны тэрмін распрацаваць Палажэнне аб музеі, структуру яго будучай экспазіцыі, а Савету Міністраў рэспублікі вызваліць для музея памяшканне ў доме № 18 па вуліцы Карла Маркса, а таксама вырашыць пытанні яго штатаў і фінансавання. Усе пералічаныя ў пастанове ЦК КПБ даручэнні вымагалі шматлікіх матэрыяльна-тэхнічных і інтэлектуальных намаганняў, што зацягнула пачатак узнаўлення музея больш чым на год. І толькі пасля пастановы Савета Міністраў БССР ад 15 снежня 1956 года "Аб Арганізацыйнай групе па стварэнні Дзяржаўнага музея БССР" гэтыя працы распачаліся. Як бачна з назваў партыйнай і саўмінаўскай пастаноў, ідэю беларускай інтэлігенцыі аб "адраджэнні" даваеннага Беларускага дзяржаўнага музея адхілілі з-за яго "нязручнай гісторыі". Пра даваенны музей членам Арганізацыйнай групы было загадана забыць і пачынаць стварэнне галоўнага гісторыка-краязнаўчага музея з чыстага аркуша.

У снежні 1956 года Арггрупу па стварэнні Дзяржаўнага музея БССР узначаліў навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР Леў Міхайлоўскі. У 1959-м яго змяніў намеснік дырэктара Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Станіслаў Сапешка. Абавязкі галоўнага захавальніка фондаў выконвала знаўца матэрыяльнай культуры Р.В. Доўнар-Запольская, аддзелам першабытна-абшчыннага ладу загадвала Вольга Рыжкоўская, аддзелам феадалізму — Рыгор Самсонаў, аддзелам капіталізму — Алена Заклінская, аддзелам савецкага перыяду — Васіль Марутка, аддзелам прыроды — Ірына Лукашэвіч. У структуры Арггрупы меліся таксама фоталабараторыя, біялабараторыя і рэстаўрацыйная майстэрня, у складзе працаваў спецыяліст па нерухомых помніках, які займаўся іх рэгістрацыяй у межах БССР.

### Крок трэці

На працягу першага пяцігоддзя ўся дзейнасць Арггрупы была скіравана на камплектаванне калекцый. Ужо на працягу толькі 1957 года яе супрацоўнікі правялі 7 экспедыцый, а таксама 20 выездаў на месцы правядзення археалагічных раскопак. У выніку было сабрана каля 3 тысяч прадметаў. У другой палове 1950-х супрацоўнікі аддзела першабытна-абшчыннага ладу сумесна з сектарам археалогіі Інстытута гісторыі АН БССР правялі раскопкі палеалітычных стаянак "Елісеевічы", "Юравічы", неалітычных стаянак "Трафімавы кусты", "Белая града" Навагрудскага раёна, а таксама курганных могільнікаў каля вёскі Хадасовічы Гомельскай вобласці. У зімовы перыяд у музеі вывучалі і апрацоўвалі помнікі зарубінецкай культуры з раскопак селішчаў "Адаменка" Быхаўскага раёна, матэрыялы гарадзішча "Таўкач" Полацкага раёна, палеалітычных стаянак "Бердыж", "Журавель", "Падлужжа" Чачэрскага раёна, "Каромка" Рагачоўскага раёна, "Добры бор" Баранавіцкага раёна.

Супрацоўнікі аддзела феадалізму былі пераважна занятыя пошукамі ў архівах Масквы, Ленінграда, Львова, Гродна, музеях БССР, сталічных антыкварных крамах. Рабіліся захады па вяртанні матэрыялаў беларускага паходжання з музеяў Польшчы. Вырабляліся копіі і муляжы. У 1959 годзе аддзел сумесна з Інстытутам гісторыі матэрыяльнай культуры АН СССР пад кіраўніцтвам Леаніда Аляксеева правёў раскопкі старажытнага Друцка, сумесна з Інстытутам гісторыі АН БССР пад кіраўніцтвам Аляксея Мітрафанава — раскопкі Полацка.

Супрацоўнікі аддзела капіталізму наведвалі кватэры старых мінчан, у выніку чаго музей атрымаў, сярод іншага, пячатку мінскай гарадской думы, шынель чыгуначніка пачатку XX стагоддзя, касцюм гараджанкі канца XIX стагоддзя, гімназічныя падручнікі і камплекты перыёдыкі. Праводзіліся комплексныя гісторыка-побытавыя экспедыцыі ў раёны БССР.

Найбольш шматлікім быў аддзел савецкага перыяду. Адначасова з работай у архівах, яго супрацоўнікі збіралі матэрыялы на беларускіх прадпрыемствах, у сем'ях дзяржаўных дзеячаў, выдатных ваеначальнікаў, вучоных, пісьменнікаў. У выніку гэтай работы калекцыі ўзбагаціліся асабістымі рэчамі і паперамі Петруся Броўкі, Максіма Танка, Піліпа Пестрака і іншых. Летам 1961 года аддзел правёў экспедыцыю ў Казахстан, былі сабраны матэрыялы аб беларусах, якія ўдзельнічалі ў асваенні цаліны.

Вялікую навуковую каштоўнасць мелі вынікі экспедыцыі аддзела прыроды ў Белавежскую пушчу, выезды па зборы матэрыялаў у розныя прыродныя рэгіёны БССР. Супрацоўнікі ўсіх аддзелаў з мэтай набыцця прадметаў музейнага значэння ліставаліся з абласнымі і раённымі музеямі, краязнаўцамі Беларусі. У фонды перадаваліся знойдзеныя ў рэспубліцы скарбы, начынне з зачыненых цэркваў, экспанаты выстаў.

У справе стварэння Дзяржмузея БССР значна дапамаглі ўстановы культуры Ленінграда. Цэнтральны гістарычны ваенна-марскі музей перадаў халодную і агнястрэльную зброю сярэдзіны XIX стагоддзя, Ваенна-гістарычны музей артылерыі, інжынерных войск і войск сувязі — рускую і французскую зброю перыяду напалеонаўскіх войнаў, плакаты і лубкі перыяду I і II сусветных войнаў, Музей гісторыі Ленінграда — матэрыялы аб паўстанні дзекабрыстаў, Дзяржаўны рускі музей — этнаграфічныя матэрыялы сярэдзіны XIX стагоддзя, сабраныя ў Мінскай губерні. У аддзеле рукапісаў Дзяржаўнай публічнай бібліятэкі імя Міхаіла Салтыкова-Шчадрына былі зроблены копіі граматы мсціслаўскага князя Сімяона Лугвеня Альгердавіча каралю Польшчы Ягайлу і яго жонцы Ядвізе, грамат рускага цара Аляксея Міхайлавіча мінскаму, магілёўскаму, полацкаму, барысаўскаму і шклоўскаму ваяводам, гербаў беларускіх гарадоў, карт XVIII стагоддзя, малюнкаў і гравюр па гісторыі Лівонскай і Паўночнай войнаў, асобных нумароў газет XIX стагоддзя. Мастацка-афармленчы камбінат Ленінграда вырабіў муляжы рускай зброі XI — XIII стагоддзяў, а таксама наўгародскіх і літоўскіх манет. Міністэрства культуры Украінскай ССР таксама перадала Дзяржмузею шэраг прадметаў, у тым ліку слуцкі пояс XVIII стагоддзя.

У выніку першага пяцігоддзя работы Арггрупы сфармавана ядро фондавага збору музея. На 1 студзеня 1961 года колькасць прадметаў склала 38 тыс. адзінак, прычым палова з іх паступіла ў 1960 годзе.

### Крок чацвёрты

Пачынаючы з 1962 года галоўная ўвага Арггрупы была звернута на падрыхтоўку экспазіцыі: складаліся тэматыка-экспазіцыйныя планы, ствараліся карты, схемы, табліцы, дыяграмы, пісаліся навуковыя даведкі. Рыхтуючыся да яе адкрыцця, супрацоўнікі Арггрупы наведалі больш за 20 музеяў СССР з мэтай пераймання вопыту. Адначасова мастацкая група, куды ўваходзілі жывапісец Уладзімір Стальмашонак і архітэктар Георгій Бенядзіктаў, працавала над эскізамі экспазіцыі. Распрацоўка тэматыка-экспазіцыйнага плана выявіла лакуны ў калекцыях, што вымусіла актывізаваць збіральніцкую работу. Толькі ў 1963 годзе правялі 10 навуковых экспедыцый і 78 камандзіровак, якія павялічылі фондавы збор на 14 тысяч адзінак. Павышэнню ўзроўню работы Арггрупы паспрыяла стварэнне ў 1963 годзе ў яе складзе Вучонага савета, куды ўвайшлі вядомыя беларускія навукоўцы Лаўрэнцій Абэцэдарскі, Адам Залескі, Васіль Тарасенка, Абрам Азараў, Алена Аладава, Іван Сяржанін і іншыя. У Арггрупе ў розныя часы працавалі нумізмат Валянцін Рабцэвіч, арганізатар музейнай справы Уладзімір Гілеп, рэстаўратар Уладзімір Маслыка, бібліяфіл Лявонцій Клок.

7 лістапада 1964 года ЦК КПБ прыняў пастанову аб адкрыцці ў Мінску Дзяржаўнага музея БССР. На гэты час у яго фондах ужо налічвалася 120 тысяч адзінак захоўвання. 12 лістапада таго ж года кіраўнік Арггрупы Станіслаў Сапешка ва ўрачыстых абставінах атрымаў ад будаўнікоў ключы ад будынка на праспекце Леніна, 25А, пасля чаго ў ім пачаўся мантаж экспазіцыі. Мантажныя работы ўжо прыходзілі да завяршэння, калі ў лістападзе 1965 года паводле вуснага распараджэння рэспубліканскага партыйнага кіраўніцтва яны былі спынены. Усе экспанаты перавезлі ў будынак па вуліцы Карла Маркса, 12, які займаў Белдзяржмузей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а апошні заняў будынак на праспекце Леніна, 25А. У выніку новую гістарычную экспазіцыю Дзяржмузея БССР давялося манціраваць на плошчы ў тры разы меншай за папярэднюю, а аддзел прыроды знайшоў прытулак у падвальным памяшканні. Афіцыйнае адкрыццё музея адбылося 2 лістапада 1967 года. Яго экспазіцыя была размешчана ў 18 залах і знаёміла наведвальнікаў з гісторыяй і прыродай беларускага народа са старажытных часоў да нашых дзён…

**Аляксандр ГУЖАЛОЎСКІ,**
**музеязнаўца, доктар гістарычных навук, прафесар**

## МУЗЕІ

### НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*г. Мінск, вул. Леніна, 20.*
*Тэл.: 327 45 62.*

Экспазіцыі:

■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.".
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.".
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.".
■ **"Вайна і Перамога ў творчасці мастакоў XX стагоддзя"**.

Выставы:

■ Выстава твораў рускага жывапісу XIX—XX стст. са збору Аляксандра Валадчынскага — да 6 лютага 2017-га.
■ Выстава **"Свет нябесны на зямлі"** — да 30 студзеня 2017-га.
■ Выставачны праект памяці Георгія Скрыпнічэнкі **"Метамарфозы"** — да 12 снежня.
■ Выстава твораў Міхаіла Карпука **"У кадры і за кадрам"** (графіка і сцэнаграфія) — да 19 снежня.
■ Выстава жывапісу Натана Воранава **"Святло і паветра"** — да 5 снежня.
■ Выстава **"Майстры Віленскай школы Міхась Сеўрук і Пётра Сергіевіч. Жывапіс і графіка з прыватных калекцый"** — з 16 снежня да 23 студзеня 2017-га.
■ Цыкл лекцый **"Музейныя гісторыі"** — да 11 студзеня 2017-га (кожную сераду а 19-й, Малая зала).

*Філіялы музея*

### МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

*г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.*

Пастаянныя экспазіцыі:

■ **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы"**.
■ **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча"**.
■ **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.
■ Выстава **"Дом дзіўных рэчаў"** (незвычайныя калекцыі беларусаў) — да 14 снежня.

### МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

*Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.*

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Дзіцячая навагодняя праграма **"На Каляды ў музей!"** (знаёмства з традыцыйным абрадам калядавання) — 10, 17, 24 снежня і 14 студзеня.
■ Кожную суботу ў 12.00 — майстар-класы па стварэнні лялек-мотанак, ткацтве паясоў, саломкапляценні і роспісе яек.

### НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.*
*Тэл.: 226 09 22.*

Экспазіцыі:

■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ "Мастацтва ў гарадской культуры XIX — XX стст.".

Выставы:

■ Выставачны праект **"Ад рымскага дынарыя да беларускага рубля"**.
■ Выстава **"Час цудаў. Зімовыя святы і забавы"** — да 28 лютага 2017-га.
■ Выставачны праект **"Час нямых зорак. Ад чорна–белага да чырвонага"** — да 15 студзеня 2017-га.
■ Выстава **"Каханне — гэта палёт"** — да 20 снежня.
■ Выстава фотаздымкаў Вадзіма Качана **"Стары Мінск"** — у галерэі музея.
■ Акцыя **"Вольнае пяніна"** — кожны дзень з 16.00 да 19.00.
■ Майстар-клас **"Калядныя вянкі"** — 10, 17, 24 і 30 снежня. Пачатак а 17-й.
■ Казачныя чытанкі ў музеі — 10, 17 і 24 снежня. Пачатак а 17-й.

*Філіялы музея*

### ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП

*г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.*

■ **Абноўленая экспазіцыя**, прымеркаваная да 100–годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі.
■ Выстава **"Музей ёлачных цацак"** — з 10 снежня да 31 студзеня.

### МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

*г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.*
*Тэл.: 327 46 12.*

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь"**.

### МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.*
*Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.*

Экспазіцыі:

■ "Геалогія і палеанталогія".
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
■ "Выстава насякомаедных раслін".

*г. Мінск, вул. Багдановіча, 9а.*
*Тэл.: 237 46 94.*

■ Выстава **"Шумлівая пярнатая вясёлка"** — да 13 сакавіка 2017-га.

*г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон").*
*Тэл.: +37529 123 60 53.*

■ Атракцыён **"Стужкавы лабірынт"** — да 31 снежня.
■ Выстава **"Сафары парк"**.

### МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

*г. Мінск, Музычны зав., 5.*
*Тэл.: 220 26 67.*

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
■ "Беларуская музычная культура XX ст.".
■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст."
■ Выстава **"Сям'я ў культуры народаў Еўразіі. XX стагоддзе"** — да 10 снежня.
■ Выстава **"Стары куфар і прыгажуня ёлка"** з калекцыі Наталлі Кавалёвай — з 15 снежня да 15 студзеня 2017-га.

### ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА

*г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.*

■ Пастаянная экспазіцыя.

Майстар-класы:

■ **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.
■ Інтэрактыўныя музейныя заняткі **"Асновы акцёрскага майстэрства"** для дзяцей ад 5 да 10 гадоў.
■ Выстава твораў пецярбургскага мастака Віталя Касаткіна **"Нафта як мастацтва"** — да 11 снежня.

### МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО

*г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.*
*Тэл.: 327 10 75.*

Экспазіцыя:

■ "Беларускі кінематограф як нацыянальная каштоўнасць".
■ Выстава **"Яніс Стрэйч: Фільмы. Людзі. Эпоха"** — да 11 снежня.
■ Навагодняя рэтраспектыва **"Неверагодныя прыгоды"** (добрыя фільмы для ўсёй сям'і Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм") — з 11 снежня да 5 лютага 2017-га.

### БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

*г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.*
*Тэл: 327 11 66; 203 07 92.*
*Музей працуе: пн. — выхадны, аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й, сер. — ад 12-й да 20-й.*

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"На мой кліч вечавы..."**, прысвечаная жыццю і творчасці Янкі Купалы ў перадваенны час і ў першыя гады Вялікай Айчыннай вайны, — да 2 студзеня 2017-га.

### НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

*г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.*
*Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02;*
*+ 37529 551 80 51,*
*+ 37529 190 31 49.*

*Палацавы ансамбль*

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Спадчына Святой Еўфрасінні Полацкай"** — да 15 студзеня 2017-га.

*Ратуша*

■ Пастаянная экспазіцыя.

### ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

*г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.*
*Тэл.: (8–01596) 2 82 91,*
*(8–01596) 2 82 70.*

■ Пастаянная экспазіцыя
■ Выстава **"На варце. З гісторыі формы СССР"** — да 15 студзеня 2017-га.

### ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

*г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.*
*Тэл.: 294 91 96.*

Экспазіцыі:

■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам, для школьнікаў малодшага ўзросту.
■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.
■ Пешая экскурсія **"Мясцінамі Коласа ў Мінску"**.

Акцыі:

■ **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"**.
■ Музейная творчая майстэрня.

### ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

*г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.*
*Тэл.: 327 78 66.*

Экспазіцыі:

■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.

Акцыі:

■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"**.

### МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

*г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.*

*Філіялы Музея гісторыі горада Мінска*

### ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

*г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.*

Экспазіцыя:

■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва"**.
■ Выстава **"ROBO ART"** (футурыстычныя мадэлі робатаў, зброі, аўтамабіляў і касмічнай тэхнікі, выкананыя ў выглядзе дызайнерскіх твораў ручной работы) — да 29 студзеня 2017-га.
■ Выстава **"Польшча. Архітэктура"** — да 15 студзеня 2017-га.

### МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

*г. Мінск, пл. Свабоды, 15.*
*Тэл.: 321 24 30.*

Экспазіцыі:

■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой"**. Прысвечана Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт"**.
■ Выстава жывапісу Віктара Нямцова **"Млын часу"** — да 11 снежня.

### МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

*г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.*
*Тэл.: 321 24 30.*

Экспазіцыі:

■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет"**.
■ **"Мінск сярод сяброў. Гарады-пабрацімы сталіцы Беларусі"**.

### МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"

*г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.*

■ Пастаянная экспазіцыя.

### ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

*г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.*
*Тэл.: 285 18 86.*

Экспазіцыя:

■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.
■ Выстава **"Мастацкія палотны "Мінскае палатно-Пакроў"** (мастацкія палотны, ручнікі, швейныя машыны).

### ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

*г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.*

Экспазіцыі:

■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж" (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX — пачатку XX стст.).
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

### АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МЬСТА"

*г. Мінск, вул. Герцэна, 2а.*
*Тэл.: 321 24 30.*

■ Выстава скульптуры Ігара Засімовіча **"Неба і зямля"** — да 11 снежня.

### АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ

*г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6. Тэл.: 321 24 30.*

■ Выстава **"Па слядах мамантаў"** — да 15 студзеня 2017-га.

### ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

*г. Гомель, пл. Леніна, 4.*
*Тэл.: (8-0232) 74 19 11.*

*Цэнтральная частка палаца*

Экспазіцыі:

■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Чырвоная гасцёўня"**.
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў"**.
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).
■ **"Жылы інтэр'ер канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ **"Свет прыроды"** (выставы "Загадкавыя фантазіі мора" і "Жывёльны свет Гомельшчыны") (грот палаца).
■ **"Адкрытае захаванне археалагічнай калекцыі музея"** .

Выставы:

■ Выстава **"Прыстанак міласэрнасці. Мастацтва тыбецкага будызму"** са збору Дзяржаўнага Эрмітажа — да 30 студзеня 2017-га.
■ Персанальная фотавыстава Юрыя Бірукова **"Бласлаўлёная зямля. Падарожжа па будысцкіх месцах"** — да 22 студзеня 2017-га.
■ Выстава **"Прыватная калекцыя"** Кацярыны Ражджэсцвенскай (Масква) — да 15 студзеня 2017-га.
■ Выстава фотаздымкаў пачатку XX стагоддзя з відамі парку і інтэр'ераў палаца Паскевічаў **"Сведкі палацавай эпохі"** — да 22 студзеня 2017-га.
■ Выстава **"Тры цвікі"** (у рамках штогадовага музейнага праекта "Новае ў археалогіі Гомельшчыны").
■ Выстава **"Свет старажытных людзей"** — з 10 снежня да 5 лютага 2017-га.

*Вежа палаца*

Экспазіцыя:

■ **"Уладальнікі Гомельскага палаца Румянцавы і Паскевічы"**.

Выставы:

■ Міні-выстава да 95-годдзя з дня нараджэння беларускага мастака Мікалая Палянкова.
■ Выстава **"Эпоха гігантаў: таямніца рэканструкцыі набярэжнай ракі Сож"** — да 31 снежня.
■ Выстава **"Норавы эпохі ў еўрапейскім рамане"** — да 31 снежня.

*Паўночнае крыло палаца*

Экспазіцыя:

■ **"Zooterra"**.

Выстава:

■ Выстава **экзатычных жывёл**.

*Зімовы сад*

■ **"Свет субтрапічных раслін і жывёл"**.

*Вежа агляду.*
*Спачывальня князёў Паскевічаў.*

■ Інтэрактыўны праект для школьнікаў **"Вялікі музей для цікаўных сяброў"**.

### ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

*г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.*
*Тэл.: (8-0232) 77 57 41.*

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстава тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.
■ Выстава **"У баях за вызваленне"**.
■ Выстава **"Ваенна-гістарычная мініяцюра"**.

### ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

*г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.*
*Тэл.: (8-0154) 53 50 64.*

Пастаянныя экспазіцыі:

■ **"Прырода Лідчыны"**.
■ **"Сучаснае мастацтва краю"** (жывапіс, графіка, скульптура, мастацкае шкло).

Выставы:

■ Выстава **"Майстэрня заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, сябра Саюза мастакоў Беларусі Уладзіміра Мурахвера"**.
■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна..."**.
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстава са збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Выстава **"Вайны свяшчэнныя старонкі"**.
■ Выстава **"Надзейны шчыт краіны"**.
■ Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.
■ Выстава **"Жыве мая ліра нанова!"**, прымеркаваная да 140-годдзя з дня нараджэння Цёткі (Алаізы Пашкевіч).

### ІЎЕЎСКІ МУЗЕЙ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУР

*г. Іўе, вул. 17 верасня, 9.*
*Тэл. (8-01595) 2-68-96*

■ Экспазіцыя **"Пад адзіным небам праз стагоддзі"** ("Карэннае насельніцтва Іўеўшчыны", "Беларускія татары").
■ Выставы **"Беларускія яўрэі", "Другая сусветная вайна"**.
■ Выстава габеленаў Марыі Старасцінай **"Натхненне"**.
■ Прадстаўленні лялечнага тэатра "Батлейка".

### ДОМ-МУЗЕЙ АДАМА МІЦКЕВІЧА Ў НАВАГРУДКУ

*г. Навагрудак, вул. Леніна,1.*
*Тэл.: (8-01597) 2-43-40 (каса)*

■ Пастаянная экспазіцыя: **"Жыццё і творчасць Адама Міцкевіча"**.
■ Пастаянныя выставы: **"Святло кухні Міцкевічаў", "Малюнкі сельскага жыцця", "Пан Тадэвуш" праз час і народы"**.
■ Выстава **"Таямніцы майстэрства"** Навагрудскага раённага цэнтра рамёстваў.

## ГАЛЕРЭІ

### "УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

*г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.*
*Тэл.: 327 26 12.*

■ Выстава тэкстыльнай скульптуры па выніках V Міжнароднага італа-беларускага пленэра **"Дыялог скульптур. Чырвонае. Чорнае. Італьянскі Экзэрсіс"** — з 12 да 24 снежня.
■ Выстава твораў студэнтаў і выкладчыкаў кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва БДУКМ у тэхніцы традыцыйнага народнага роспісу па тканіне (маляванка) **"Крыніцы натхнення"**.

### ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

*г. Мінск, вул. Казлова, 3.*
*Тэл./факс: 290 60 10.*

■ V Беларускае біенале жывапісу, графікі і скульптуры **"БІ-5"** — да 11 снежня.

## ТЭАТРЫ

### НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1.*
*Тэл./факс: 334 11 56.*

■ **10 — "Рамэа і Джульета"** (балет у 2-х дзеях) С.Пракоф'ева.
■ **11 — II тур Мінскага міжнароднага Каляднага конкурсу вакалістаў.** Пачатак а 10-й.
■ **12 — "Viva la mama!" ("Няхай жыве мама!")** (опера ў 2-х дзеях) Г.Даніцэці. Прэм'ера. Камерная зала імя Л.П.Александроўскай. Пачатак у 19.30.
■ **13 — Гала-канцэрт Мінскага міжнароднага Каляднага конкурсу вакалістаў.**
■ **14 — "Кармэн"** (опера ў 3-х дзеях) Ж.Бізэ. У партыі Хазэ — Франчэска Піо Галаса (Італія).
■ **15 — "Макбет"** (опера ў 3-х дзеях) Дж.Вердзі. У партыі Банка — Гадэрдзі Джанелідзэ (Грузія). (Спектаклі ў рамках VII Мінскага міжнароднага Каляднага опернага форуму).
■ **16 — канцэрт "Пра любоў"** (рамансы кампазітараў XIX — XX стст.). Камерная зала імя Л.П.Александроўскай. Пачатак у 19.30.
■ **17 — "Пікавая дама"** (опера ў 2-х дзеях) П.Чайкоўскага. Спектакль Адэскага Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы і балета. Пачатак а 18-й.

### ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

*г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.*
*Тэл./факс: 334 60 08.*

■ **10 — "Адэль"** (гісторыя кахання) Я.Таганава.
■ **11 — "Містар Розыгрыш"** (гульні дарослых) С.Кандрашова.
■ **12 — "Латэнтныя мужчыны"** Я.Карняга. Пачатак а 19-й і а 21-й.
■ **13 — "Нязваны госць"** (сямейная меладрама) С.Бартохавай.
■ **14 — "Тры Жызэлі"** (драма) А.Курэйчыка.
■ **16, 17 — "Каляднае рандэву"** (навагоднія прыгоды беларусаў у Парыжы) С.Навуменка, Дз. Паршына.

### БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

*г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.*
*Тэл.: 200 81 26.*

■ **10 — "Прыгоды брэменскіх музыкаў"** (мюзікл для дзяцей і дарослых у 2-х дзеях) Г.Гладкова. Пачатак аб 11-й.
■ **10 — "Цыганскі барон"** (аперэта ў 2-х дзеях) І.Штрауса. Пачатак а 18-й.
■ **11 — "Чырвоны Каптурык. Пакаленне NEXT"** (мюзікл для дзяцей і дарослых у 2-х дзеях) А.Рыбнікава. Пачатак аб 11-й.
■ **11 — "Таемны шлюб" ("Граф Люксембург")** (аперэта ў 2-х дзеях) Ф.Легара. Пачатак а 18-й.